WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛЮТАГА 2010 г.
СУБОТА
№ 32
(26640)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПРАШАЕ ГРУПУ ROTHSCHILD ДА АЦЭНКІ ПРЫВАТЫЗУЕМЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запрашае групу Rothschild правесці ацэнку прыватызуемых прадпрыемстваў Беларусі. Аб гэтым ён паведаміў учора на сустрэчы з кіраўніцтвам кампаніі.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў кампаніі за тую работу, якую яна правяла па ацэнцы некаторых беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый. «Мы высока ацэньваем работу вашай кампаніі. Гэта не навіна, таму што група Rothschild — адна са старэйшых у свеце, і нам было б вельмі выгадна працаваць з вашымі спецыялістамі», — сказаў Прэзідэнт.

«Калі ў прынцыпе згодзіцеся, то ў найбліжэйшы час мы маглі б вызначыць 5-7 праектаў і прапрацаваць іх больш сур'ёзна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы не толькі хацелі б атрымаць дакладную ацэнку прыватызуемых прадпрыемстваў, але і хацелі б многаму павучыцца». Кіраўнік дзяржавы дадаў, што вопыт супрацоўніцтва з групай Rothschild ужо ёсць, але пры гэтым звярнуў увагу на абавязковасць беларускага боку. «Мы людзі абавязковыя, і калі мы дамовімся, то выканаем усё, што абяцалі», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка запрасіў кіраўніцтва групы Rothschild абмеркаваць асноўныя прынцыпы супрацоўніцтва і адзначыў, што ў сваю чаргу гатовы да сур'ёзнай і шчырай размовы і адказаць на пытанні, якія цікавяць. Кіруючы дырэктар групы Rothschild Арыэль дэ Ротшыльд падзякавала за высокую ацэнку работы кампаніі, у тым ліку па ацэнцы актываў БПБ-банка. Яна адзначыла, што прадстаўнікі групы Rothschild сустракаліся з членамі беларускага ўрада, кіраўніцтвам Нацыянальнага банка, каб лепш зразумець намеры беларускага боку з фінансавага і эканамічнага пунктаў погляду.

БЕЛАРУСЬ ГАТОВА АБМЯРКОЎВАЦЬ З БРАЗІЛІЯЙ АКЦЫЯНІРАВАННЕ І ПРЫВАТЫЗАЦЫЮ СВАІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

Беларусь гатова абмяркоўваць з бразільскім бокам пытанні акцыяніравання і прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў, прадукцыя якіх цікавіць Бразілію. Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам бразільскага штата Гаяс Алсідэсам Радрыгесам Філью

«Мы ведаем, што ў вас ёсць пэўная цікавасць да тавараў, якія вырабляюцца нашымі кампаніямі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І калі вы хочаце, мы гатовы разгледзець пытанні акцыяніравання і прыватызацыі гэтых прадпрыемстваў непасрэдна з Бразіліяй».

«Цікавасць Беларусі зразумелая, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Бразілія — гэта вялізны рынак для тых прадпрыемстваў, якія стануць сумеснымі».

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што ўзаемадзеянне дзвюх краін будзе і далей актыўна развівацца не толькі ў эканоміцы, але і ў сферах культуры, навукі, адукацыі, спорту, а таксама ў плане супрацоўніцтва на міжнароднай арэне. Ён нагадаў, што ў 2008 годзе беларуска-бразільскі таварааварот дасягнуў $1,2 млрд.

«З задавальненнем можна канстатаваць, што па асноўных пытаннях міжнароднага парадку дня пазіцыі Беларусі і Бразіліі абсалютна супадаюць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, наша краіна «хацела б, прысутнічаючы ў Лацінскай Амерыцы (а мы ўжо там прысутнічаем), абаперціся на плячо Бразіліі — гэтага магутнага партнёра». Бразілія — адна з вядучых краін планеты, і без удзелу гэтай дзяржавы «не вырашаецца ні адно значнае пытанне ў свеце», дадаў ён.

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што супрацоўніцтва Мінскай вобласці і штата Гаяс стане прыкладам і для іншых рэгіёнаў Беларусі і Бразіліі. Актыўнае рэгіянальнае супрацоўніцтва будзе садзейнічаць умацаванню міждзяржаўнага дыялога. Візіт прадстаўнічай дэлегацыі сталічнага штата Гаяс Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія (на тэрыторыі штата размешчана федэральная акруга са сталіцай федэрацыі — горадам Бразіліа) прызначаны надаць новы імпульс развіццю ўзаемавыгаднага беларуска-бразільскага супрацоўніцтва ў розных сферах, адзначыў Прэзідэнт.

«Я гатовы абмеркаваць сёння не толькі напрамкі супрацоўніцтва ў цэлым, але і канкрэтныя кантракты, праекты, пажаданні. Калі вы гатовы, давайце будзем вызначацца», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу губернатар штата Гаяс адзначыў, што цяпер Бразілія перажывае важны момант у сваёй гісторыі — яна знаходзіцца ў стадыі спрыяльнага эканамічнага развіцця. «Наш штат — гэта своеасаблівае сэрца краіны, нібы ўся Бразілія ў мініяцюры», — сказаў госць. Паказчыкі эканамічнага росту штата Гаяс перавышаюць сярэднія па федэрацыі. «Мы бачым новыя гарызонты і гатовы працаваць над тым, каб іх дасягнуць», — падкрэсліў Алсідэс Радрыгес Філью.

Штат Гаяс размешчаны ў цэнтры Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія. Плошча штата — 341,3 тыс. кв. км, насельніцтва каля 6 млн чалавек. Сталіца — Гаянія (1,8 млн чалавек). Асновай эканомікі штата Гаяс з'яўляецца сельская гаспадарка (раслінаводства і жывёлагадоўля), горназдабыўная, металургічная, аўтамабілебудаўнічая, хімічная і фармацэўтычная прамысловасць. Экспарт штата Гаяс у 2009 годзе склаў $3 млрд 614,9 млн. Асноўныя экспартныя тавары: соя і соевы шрот, мяса і мясныя прадукты, медзь, фэрасплавы, золата, азбест, цукар, бавоўна. Асноўнымі краінамі-пакупнікамі выступаюць Кітай, Нідэрланды, Іспанія і Расія. Па выніках 2009 года Беларусь заняла 12-е месца сярод знешнегандлёвых партнёраў штата Гаяс. Беларускі экспарт (калійныя ўгнаенні) склаў $46,2 млн. Таварааварот паміж Беларуссю і Бразіліяй у 2009 годзе склаў $568,3 млн.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РЭЗКАЙ ДЭВАЛЬВАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 2010 ГОДЗЕ НЕ БУДЗЕ

Аб гэтым заявіў учора журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацбанка Беларусі Анатоль Мароз, перадае БЕЛТА.

Як адзначыў прадстаўнік Нацбанка, дэвальвацыя беларускага рубля ў 2010 годзе праходзіць у рамках Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі. «Мы падпісалі пагадненне з Міжнародным валютным фондам, — сказаў Анатоль Мароз. — МВФ штоквартальна прыязджае, усё адсочвае. Мы не маем права адыходзіць ад запланаваных плюс-мінус 10 працэнтаў. Таму рэзкай дэвальвацыі, якая была прапанавана МВФ у 2009 годзе (давялося яе правесці), не будзе».

Прамая лінія

РАТАВАННЕ АЛКАГОЛІКА

Аб сучасных падыходах у лячэнні алкагольнай залежнасці можна распытаць **загадчыка сектара наркалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Уладзіміра Пятровіча МАКСІМЧУКА** падчас «прамой лініі», якая адбудзецца 24 лютага, у сераду, з 14.00 да 15.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Ванкувера

Беларускія біятланісты пацвердзілі добрыя традыцыі быць у лідарах сусветнай спартыўнай эліты

Прэзідэнт Беларусі, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў членаў алімпійскай каманды Беларусі па біятлоне Дар'ю Домрачаву і Сяргея Новікава з узнагародамі XXI зімовых Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што бронзавы медаль Дар'і Домрачавай у індывідуальнай гонцы на 15 км асабліва дарагі, бо ён першы ў скарбонцы нашай каманды на Алімпіядзе. «Гэта было яркае і прыгожае выступленне. Уся краіна сачыла за гэтымі спаборніцтвамі па тэлебачанні, і ты апраўдала надзеі беларускіх балельшчыкаў», — гаворыцца ў віншаванні Дар'і Домрачавай.

У звароце да Сяргея Новікава, які заваяваў серабро Алімпіяды ў індывідуальнай гонцы на 20 км, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яго рэзультат пацвердзіў добрыя традыцыі нашай каманды біятланістаў быць у лідарах сусветнай спартыўнай эліты.

Прэзідэнт падзякаваў Дар'і Домрачавай і Сяргею Новікаву за такі падарунак усім беларусам і пажадаў біятланістам заваявання новых спартыўных вяршынь.

Аляксандр Лукашэнка таксама павіншаваў трэнераў алімпійскай каманды Беларусі па біятлоне, адзначыўшы іх вялікую ролю ў поспеху беларускіх біятланістаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сяргей НОВІКАЎ, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў-2010 у Ванкуверы:

«Я ПАКУЛЬ ЯШЧЭ НЕ АСЭНСАВАЎ, ШТО ЗРАБІЎ НЕШТА НЕЗВЫЧАЙНАЕ»

Фота БЕЛТА.

Сяргей НОВІКАЎ і Оле-Эйнар Б'ЁРНДАЛЕН — браты па серабру.

МАЛАВЕРАГОДНА, што ўзыходжанне на алімпійскі п'едэстал беларуса Сяргея Новікава пасля індывідуальнай гонкі на 20 км мог прадказаць які-небудзь празорлівец. У апошні чатырохгадовы алімпійскі цыкл выхаванец магілёўскай школы біятлона значыўся ў сераднякох і асаблівых надзей на ўзыходжанне да зорнага небасхілу не падаваў. Таму поспех на трасах «Алімпік Парка» можна назваць самай вялікай нечаканасцю не толькі ў кар'еры 31-гадовага біятланіста, але і ў стане беларускай зборнай, дзе ад лаўраў беларускіх біятланістаў-мужчын ужо даўно адвыклі.

— Сяргей, ты хоць усвядоміў, што зрабіў самы значны прарыў у сваім жыцці?

— Ведаеце, не зусім. Мне яшчэ здаецца, што я проста прабег і адстраляўся на 20 кіламетрах, як звычайна, проста, так як мог. Магчыма, такое пачуццё звязана з тым, што мы вельмі шмат часу знаходзімся на зборах, удалечыні ад дома і сям'і. Але ж з кожнай новай хвілінай пачынаю усведамляць, што за мной ужо замацаваны статус сярэбранага прызёра Алімпійскіх гульняў.

— Прызнайся, побач з зоркай сусветнага біятлона Оле-Эйнарам Б'ёрндаленам прыемна было знаходзіцца на адным узроўні?

— А як ты думаеш?! Безумоўна, прыемна было і нават крыху хваляваўся.

— Вы так спраўна на пару з нарвежцам паднялі на рукі яго таварыша і твайго калегу па п'едэстале Эміла Свендсена, што сумняваешся наконт тваёй стомленасці.

— Няхай пакажу сябе нясціплым, але на пару з Б'ёрндаленам я гатоў падняць любога.

— Поспех Дашы Домрачавай паўплываў на тое, каб мужчынская зборная Беларусі ў тваёй асобе вырашыла не саступаць жаночай камандзе?

— Суперніцтва паміж намі няма. Але ж удалае выступленне Домрачавай стала ў нейкай ступені дадатковым імпульсам і стымулам у барацьбе за медалі на 20-кіламетроўцы.

— Кіламетры за паўтара да фінішу ты яшчэ ішоў крок у крок са Свендсанам. А гэта азначала, што на гарызонце маячыла «золата».

— Па-першае, за мной было яшчэ нямала супернікаў, якія маглі абагнаць, таму інфармацыю з трасы я прымаў да ведама як звычайна, каб быць у курсе. Па-другое, ад гэтай інфармацыі пасля затраты столькіх сілаў у мяне не маглі вырасці крылы, каб хутчэй даляцець да фінішу. На эмоцыях я адным махам адолеў апошні пад'ём, а потым сілы проста пачалі мяне пакідаць. Але я сабе сказаў: са скуры вылезу, а да фінішу дамчуся на максімальна магчымай хуткасці. Лічу, што атрымалася: сярэбраныя медалі на Алімпіядзе проста так не раздаюць.

— Дадому ўжо паспеў пазваніць?

— Пакуль яшчэ не — тэлефона пад рукой няма, хіба што вы, журналісты, дапаможаце.

— Ты сёння не галіўся. Думаў, каб удачу не спужаць?

— Лічыце, што так, хоць пагаліцца я проста не паспеў. А каб верыць у нейкія прыкметы — такога няма. На мой погляд, трэба спадзявацца толькі на свае сілы. І тады ўдача абавязкова будзе з табой.

Фота БЕЛТА.

Даша ДОМРАЧАВА, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў-2010 у Ванкуверы:

«РАБІ ДАБРО ІНШЫМ, І ТАБЕ ЎСЁ ДАБРОМ ВЕРНЕЦЦА»

ВІДАВОЧНА, што поспех беларускай біятланісткі Дашы Домрачавай у індывідуальнай гонцы на 15 км не стаў вялікай нечаканасцю для многіх яе канкурэнтак. Як-ніяк, а на працягу апошніх гадоў яна паказвала высокія стабільныя вынікі на этапах Кубка свету і іншых важных турнірах. Тым не менш, заваяванне бронзавага медаля на Алімпіядзе ў Вістлеры можна назваць знакавым. Бо гэтай 23-гадовай спартсменцы, як нікому іншаму, давялося рабіць медальны пачын, праявіць пры гэтым высокую ступень псіхалагічнай устойлівасці і неймавернай фізічнай вынослівасці.

Адметна, што гэтыя абставіны ніяк не ўплываюць на жаданне Домрачавай пагутарыць з журналістамі.

— Даша, віншуем цябе з бронзавым медалём.

— Дзякуй. Ведаеце, я яшчэ знаходжуся ў нейкай абстракцыі і не зусім усведамляю, што заваявала трэцяе месца.

— Пасля фінішнай прамой ты павалілася, скрыжаваўшы рукі, быццам бы звяртаючыся да каго?

— Гэта адбылося адвольна. Проста я так вылажылася на дыстанцыі, што толькі і змагла адвольна ўскрыкнуць «мама, мама». А потым памятаю, што да мяне падбег наш доктар і сказаў, што трэба падымацца. Бо за мной яшчэ нямала суперніц фінішавала.

— За табой сапраўды яшчэ разгараліся жарсці за трэцюю прыступку п'едэстала паміж украінкай Валяй Семярэнка і польскай гоншчыцай Веранікай Навакоўскай. Пры чыстай стральбе на заключным этапе кожная з іх магла заняць тваё месца.

— Ведаеце, у спорце ўмоўны лад — «калі б», «а вось бы» — не прыдатны. На мой погляд, аб усім сведчыць выніковы пратакол. Тым не менш я задаволена, што сёння ўдача была са мной.

— Прызнайся, не давялося «хварэць» супраць сваіх суперніц?

— Ні ў якім разе. Па жыцці я прытрымліваюся прынцыпу: рабі людзям дабро, і да цябе ўсё дабром вернецца.

— Напярэдадні гэтай гонкі цябе наведвала пачуццё грандыёзнага поспеху? Можа, ты ўжо на старце згарала ад нецярпення хутчэй выскачыць на трасу і з'явіцца на стрэльбішчы?

— Скажу шчыра, што перад стартам старалася не думаць аб розных перыпетыях, якія могуць адбыцца на дыстанцыі. Па ходу гонкі змагалася сама з сабой, з мішэнямі. Дзякуй трэнерам, якія трымалі мяне ў курсе наконт часу, што паказваюць суперніцы. Праўда, не магу не сказаць адну рэч. Напярэдадні старту на 15 км на мой адрас прыйшло ад нейкага незнаёмца паведамленне: «Даша, сёння я прысніў сон, што будзеш з бронзавым медалём». Прыемна, што гэты сон аказаўся праўдзівым.

— Ты яшчэ не паспела сказаць «дзякуй» гэтаму дабрадзею?

— Да старту старалася не думаць ні аб чым. А цяпер вось ёсць нагода падумаць наконт адказу таямнічаму незнаёмцу.

— У алімпійскай праграме яшчэ некалькі дысцыплін. З улікам таго, што твае сяброўкі па камандзе — Людміла Калінчык, Надзея Скардзіно, Вольга Кудрашова — паказалі высокія вынікі, — для эстафеты гэта да месца.

— Не забывайце яшчэ пра гонку з масавым стартам. Так што расслабляцца яшчэ рана. Буду настройвацца на дастойнае выступленне ў астатніх відах праграмы. Раптам удача яшчэ захоча ўсміхнуцца.

НЕАФІЦЫЙНЫ МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

	Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1.	ЗША	6	5	7	18
2.	Германія	4	4	3	11
3.	Нарвегія	3	3	2	8
4.	Канада	3	3	1	7
5.	Паўднёвая Карэя	3	2	0	5
6.	Швейцарыя	3	0	1	4
7.	Францыя	2	1	4	7
8.	Кітай	2	1	1	4
9.	Швецыя	2	0	1	3
10.	Аўстрыя	1	2	2	5
11.	Расія	1	2	1	4
12.	Галандыя	1	1	1	3
13.	Аўстралія	1	1	0	2
—	Славакія	1	1	0	2
15.	Чэхія	1	0	1	2
16.	Польшча	0	2	0	2
17.	Італія	0	1	3	4
18.	Японія	0	1	2	3
19.	БЕЛАРУСЬ	0	1	1	2
20.	Казахстан	0	1	0	1
—	Латвія	0	1	0	1
—	Фінляндыя	0	1	0	1
—	Эстонія	0	1	0	1
24.	Славенія	0	0	1	1
—	Харватыя	0	0	1	1

МЕДАЛЬНЫ ДОЖДЖ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

ТОЕ, аб чым марыў кожны ўдзельнік беларускай дэлегацыі ў Ванкуверы на XXI зімовых Алімпійскіх гульнях, здзейснілася. Каманда нашай краіны дзякуючы фенаменальнаму «стрэлу» Дашы Домрачавай і Сяргея Новікава, упершыню за час існавання самастойнай дзяржавы, заваявала адразу два алімпійскія медалі, прычым у адной дысцыпліне — біятлоне. Віншуем!!!

Зрэшты, у папярэднім нумары газеты аўтарам гэтых радкоў было выказана меркаванне, што ў індывідуальных гонках на 15 км у жанчын і, асабліва, на 20 км у мужчын, могуць нарадзіцца зусім «нянпланавыя» чэмпіёны. Так яно і адбылося.

Калі з жаночай часткай праграмы ўсё было больш-менш ясна — планка для лідара каманды, Дашы Домрачавай, была ўзнята вельмі высока, то для квартэта мужчын услых задача па заваяванні медалёў не аб'яўлялася. Ды і ставіць яе ў кампаніі канкурэнтаў з Нарвегіі, Германіі, Расіі, Францыі было неяк не зусім лагічна. Куды там супраць сусветных грандаў! Але ж на тое і існуе індывідуальная гонка, дзе кожны халасты стрэл караецца дадатковай штрафной хвілінай...

Адзначым, што ўчарашні дзень пачынаўся не так, як звычайна. Упершыню за час знаходжання ў Ванкуверы з ночы на горад асеў лёгкі мароз, таму раніцай падалося, што надвор'е зноў выкіне якія-небудзь сюрпрызы ў выглядзе мокрага снегу альбо дажджу. Праўда, ўунапрамку курортнага мястэчка Вістлер, дзе праходзіць біятлонная праграма, снегу пакуль што хапае, і нават і пры добрым веснавым пацяпленні снегу хопіць да канца Алімпіяды. Відаць, прырода вырашыла парадаваць арганізатараў Алімпіяды, спартсменаў і журналістаў сонечным надвор'ем, калі, як на далоні, бачныя горы, пікі якіх пакрыты бялюткім снегам, а ніжэй — густы хвойны лес.

У такой сітуацыі для дасягнення высокіх паказчыкаў на лыжні вельмі шмат залежала ад жараб'ёўкі. Бо першыя нумары атрымоўваюць значную перавагу над тым, хто стартуе пазней. Як-ніяк, а лыжня, пасля старту каля сотні ўдзельнікаў, абавязкова змякчэе. І бегчы нязручна, і мазь не падабраць. Тут трэба аддаць належнае беларускаму трэнерскаму штабу. Роўна за дзень да стартаў была праведзена трэніроўка ў такі ж час, як і ў сапраўднай гонцы. Пасля былі зроблены адпаведныя карэкціроўкі.

Пра тое, як праходзіла жаночая гонка на 15 км, расказваць няма сэнсу. Ужо калі Дар'я пакінула стрэльбішча ў чацвёрты раз, маючы адну штрафную хвіліну, мы ўпэўнена адарылі яе цікімі апладысментамі, што азначала — ёсць бронзавы медаль.

СТАР. 2

Заўтра — Міжнародны дзень матчынай мовы

Урокі беларускай

Ларыса ЦІМОШЫК

Школьніцай я была перакананая, што мова будучыні — англійская. Выключна. Вучылася ў школе, дзе ўрокі англійскай былі штодня, ці па некалькі на дзень, ці нават цэлы дзень мог быць прысвечаны працы са слоўнікам. Я шчыравала, бо была ўпэўненая ў тым, што гэтая мова мне дакладна спатрэбіцца ў свеце, які на вачах станавіўся больш адкрыты.

Праўда, беларуская ў нас таксама была — літаратура і мова. Раз на тыдзень. І не з першага класа, у адрозненне ад рускай. Успрымаліся гэтыя ўрокі, хутчэй, як дадатковыя. І калі па рускай нас ганялі, то ўрокі беларускай былі больш ліберальныя. Настаўніца была добрая, яна цаніла ўжо тое, калі нейкі літаратурны твор ты мог пераказаць на мове арыгінала, без дапамогі іншамоўных слоў. Сапраўды, гэта было для нас дасягненне! Аднак з тых часоў я запомніла пра беларускую мову галоўнае: яна простая насамрэч, бо як чуецца, так і пішацца. Гэтага было дастаткова, каб атрымаць добрыя адзнакі ў атэстат і не «замарочвацца». Але калі б мне хто-небудзь тады сказаў, што я гэтай мовай буду карыстацца, я падумала б, што гэта чалавек з іншага свету.

Прайшло больш за 20 гадоў. За гэты час мне ні разу не выпаў момант, калі б я магла блісnуць ведамі англійскай, калі яна мне сапраўды была патрэбная. Ішоў год за годам, і яна забывалася. І цяпер я нават не наважуся прызнацца, што калісьці яе вучыла: каб не сорамна было за граматыку ды маўленне. Дзіўнасць сітуацыі ў тым, што з беларускай існую штодня. І гэта аказалася зусім не складана! І нечакана перспектыўна: гэтая мова мне дае магчымасць зарабляць на жыццё (у беларускай газеце!). У беларускай (як аказалася!) мне бывае прасцей знайсці трапнае слоўца, як не скажаш больш ні ў якой мове. І нават не столькі ў самой беларускай, колькі ў адным з яе варыянтаў, які ёсць на Палессі.

Там жывуць мае бацькі. І нам з сястрой з дзяцінства было прыкольна слухаць, як тата з мамай «говорат» паміж сабой. Не, яны стараліся трымаць марку гарадскіх жыхароў з намі. Але калі ехалі, напрыклад, у госці ў вёску, то тут уся паляшуцкая сутнасць лілася сама сабою. Мы не навучыліся размаўляць так, як яны, хоць гэтыя словы і маўленне часам просяцца ў нейкіх надзвычай эмацыйных сітуацыях. І ў некаторыя моманты я магу сказаць так, як сказала б зараз мая мама — гэта падаецца найбольш натуральным. Цяпер з бабулінага «пойдэм поемо?» кпіць яе расійская ўнучка. Па-добраму, бо сама прызнаецца, што пасля летніх канікулаў бывае, што можа нешта падобнае выдаць перад сяброўкамі ў школе.

Я ніколі не казала бацькам, як мне насамрэч падабаецца іх гаворка. І вельмі шкадую, што не магу вытрымаць на ёй цэлую размову з мамай. Ці камплексую, што не магу?!. Бо нашымі настаўнікамі становяцца людзі збоку, а свае — гэта ж і так свае, што тут вучыцца?.. Не зразумееш, што гэта трэба, пакуль не пачнеш турбавацца і перажываць за іх, не ведаючы, якімі словамі, больш зразумелымі для родных людзей, прызнацца, як любіш іх. Можа нашы тэлефонныя размовы па-паляшуцку дазволілі б маці не адчуваць адлегласці паміж намі. І мы б сталі больш блізкімі нават праз кіламетры — усё адно што ў адной хаце. Можа гэта яшчэ справа часу, які ў мяне ёсць, каб аднавіць тое, што сядзіць глыбока і вырываецца падсвядома. Бо сябе не перанародзіш іншым чалавекам.

Здаецца, што моўную сітуацыю менавіта таму і немагчыма вымяраць лічбамі: сёння ты свядома лічыш так, а заўтра ў табе перамагае тое самае падсвядомае. Моўная сітуацыя нават аднаго асобнага чалавека і тое мяняецца. Вядома ж, можна правесці даследаванне, анкетаванне, апытанне і гэтак далей, каб атрымаць нейкія звесткі, а потым у працэнтах ілюстраваць, хто і як у нас гаворыць. Але давайце шчыра прызнаемся: лічбы пакажуць фармальны бок справы. А рэальны — наўрад ці. Бо нават на адной мове можна казаць пра тое, як ты паважаеш іншую і ў прынцыпе быў бы не супраць на ёй размаўляць, каб і ўсе так. Ці яшчэ можна без лічбаў — па маўленні — зразумець, што ёсць людзі, якія гавораць зусім не на той мове, як ім гэта ўяўляецца. Ды і без лічбаў — прыслухаўшыся да вуліцы — можна адчуць моўную сітуацыю і зразумець шмат і пра мінулае краіны, і напэўна, уявіць будучыню...

СТАР. 7

ЧАМУ НА «МІНСКУЮ ЛЫЖНЮ-2010» ЛЕПШ ЕХАЦЬ НА ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ?

У суботу ў Раўбічах пройдзе спартыўнае свята «Мінская лыжня-2010». Традыцыйна ў гэты дзень там збіраецца вялікая колькасць аматараў спорту. У сувязі з гэтым УДАІ Мінскай вобласці рэкамендуе ехаць туды на грамадскім транспарце. Тым больш, што спецыяльна для гэтых мэтаў будзе выдзелены дадатковы маршрут аўтобуса № 449 з аўтавакзала «Маскоўскі» (А/в Маскоўскі — «Станцыя метро «Усход» — «Карбышава» — РЦАП «Раўбічы»).

— Тыя, хто ўсё ж вырашыць ехаць у Раўбічы на ўласным аўтамабілі, няхай маюць на ўвазе, — кажа **начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Мінаблвыканкама Алег ЦЮРЫН,** — што на ўчастку аўтадарогі Р-80 «Слабада-Паперня» ад РЦАП «Раўбічы» да вёскі Аколіца для аўтамабільнага транспарту будзе арганізаваны аднабаковы рух у напрамку МК «Курган Славы». Паркоўка асабістага транспарту прадугледжана ўздоўж дарогі Р-80 на ўмацаваных абочынах і абазначана адпаведнымі знакамі.

Надзея ДРЫЛА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.02.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	2 921,00	1 чэшская крона	153,70	USD	30,1510
▼ 1 еўра	3 934,29	1 польскі злоты	986,14	UAH	37,6958
1 латвійскі лат	5 560,10	▲ 1 расійскі рубель	96,88	1000 BYR	10,3505
1 літоўскі літ	1 141,77	1 украінская грыўня	366,04	EUR	40,6285

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона) 11 марта 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белаттракцион» (продавец)

На аукционные торги выставляются:

Номер лота	№ 1	№ 2	№ 3	№ 4
Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота	- здание административно-хозяйственное, инв. номер 500/С-48231, площадь – 69,6 кв.м; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 500/С-48232, площадь – 67,0 кв. м; - ограждение металлическое, протяженность – 470 м; - асфальтобетонное покрытие, площадь – 29,6 кв.м	- здание специализированное иного назначения (павильон), инв. номер 500/С-48537, площадь – 59,3 кв.м	- здание специализированное энергетики, инв. номер 500/С-48263, площадь – 8,9 кв.м	- здание административное инв. номер 400/С-2446, площадь – 178,7 кв.м
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Ташкентская, д. 25	г. Минск, ул. Фрунзе, д. 2	г. Минск, проспект Независимости, д. 84	г. Гродно, ул. Виленская, д. 20
Сведения о земельном участке	площадь – 0,0090 га, кадастровый номер 500000000002006760; назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; площадь – 0,0074 га, кадастровый номер 500000000002006759, назначение – эксплуатация и обслуживание административно-хозяйственного здания	площадь – 0,0106 га, кадастровый номер 500000000001004775, назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного иного назначения (павильон)	площадь – 0,0021 га, кадастровый номер 500000000009004063, назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного энергетики	площадь – 0,0350 га, кадастровый номер 440100000002003160, назначение – обслуживание административного здания
Начальная цена без учета НДС	71 589 360 белорусских рублей	46 601 700 белорусских рублей	5 603 640 белорусских рублей	82 339 200 белорусских рублей
Сумма задатка	7 000 000 белорусских рублей	4 000 000 белорусских рублей	500 000 белорусских рублей	8 000 000 белорусских рублей

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **11 марта 2010 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 22.02.2010 по 09.03.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(017) 222 73 14 – ОАО «Белаттракцион».
Интернет: www.mgcn.by

Ордэнам Маці ўзнагароджаны 47 шматдзетных маці Беларусі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб узнагароджанні ордэнам Маці 47 шматдзетных жанчын.

Сярод удастоеных дзяржаўнай узнагароды — санітарка туберкулёзнай бальніцы «Вярховічы» Камянецкага раёна Святлана Галубковіч, прадавец ПУП «Каапнарыхтпрамгандаль» Пастаўскага райпа Таццяна Пасечнік, закройшчык верхняга адзення ААТ «Элегант» (Гомель) Таццяна Белавусава, пчаляр СВК «Вензавец» Алена Мацюк, прыёмная маці аддзела адукацыі адміністрацыі Першамайскага раёна Бабруйска Ніна Домніч, хатняя гаспадыня з Мінска Вольга Каралевіч і многія іншыя маці, якія выхавалі пяцёра і больш дзяцей.

Энверу Барыеву прысвоена званне генерал-лейтэнанта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора падпісаў шэраг указаў аб прысваенні воінскіх і спецыяльных званняў.

Генерал-маёру ўнутранай службы Энверу Барыеву прысвоена званне генерал-лейтэнанта ўнутранай службы.

Званне генерал-маёра прысвоена палкоўнікам Вячаславу Шумілаву, Ігару Бахматаву, Пятру Галезніку, Аляксею Захараву, Анатолю Лапо, Івану Церцелю. Палкоўніку міліцыі Аляксандру Найдзенку прысвоена званне генерал-маёра міліцыі, а палкоўніку юстыцыі Аляксандру Драніцу — генерал-маёра юстыцыі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НЕ КАНФРАНТАЦЫЯ, А КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ

Сёння, 20 лютага, у Гродзенскім абласным драматычным тэатры пройдзе канцэрт памяці выдатнага польскага музыканта, ураджэнца вёскі Васілішкі Шчучынскага раёна Чэслава Немэна з удзелам беларускіх і польскіх артыстаў.

А ўжо на пачатку сакавіка ў Гродне адбудзецца выстава-кірмаш майстроў народнай творчасці «Казюкі», які ўжо традыцыйна арганізоўвае грамадскае аб'яднанне «Саюз палякаў на Беларусі». Сваё мастацтва паказваюць умельцы не толькі з нашай краіны, але і з Літвы, Польшчы. І гэта далёка не адзіная канкрэтная справа СПБ па папулярызацыі нацыянальнай культуры і традыцый. Сярод іншых — святы паланэзу ў Слоніме і «Ноч Святога Яна» ў Гродзенскім раёне, фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў», літаратурна-паэтычныя сустрэчы «Над Нёманам» памяці Элізы Ажэшкі ў вёсцы Багатырэвічы Мастоўскага раёна. Пры гэтым Саюзу палякаў, як і іншым грамадскім аб'яднанням, аказваецца падтрымка, у тым ліку і фінансавая, з боку органаў дзяржаўнага кіравання.

Дарэчы, Дамы палякаў, якія маюць шэраг структурных падраздзяленняў СПБ, рашэннем мясцовых Саветаў дэпутатаў цалкам альбо на 50 працэнтаў вызваляюцца ад выплаты падаткаў на зямлю і нерухомасць. А ў выпадках размяшчэння офісаў аддзелаў СПБ на плошчах дзяржаўнай уласнасці яны, як і іншыя нацыянальныя аб'яднанні, карыстаюцца льготнай арэндай памяшканняў. Створаны і ўмовы для вывучэння польскай мовы як у навучальных установах, так і ў нядзельных школах, на курсах. Адпаведных спецыялістаў рыхтуюць у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. Пушкіна і Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы. Больш за 400 чалавек па спецыяльнасці «выхавальнік дашкольнай установы з вывучэннем польскай мовы, кіраўнік гуртка польскай мовы» падрыхтавана Гродзенскім педагагічным каледжам.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Прымяненне з 1 ліпеня 2010 года пошліны на расійскую нафту не адпавядае прынцыпам адзінай мытнай тэрыторыі

паведаміў намеснік дырэктара дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці МЗС Беларусі Антон Кудасаў, перадае БЕЛТА.

Антон Кудасаў нагадаў, што падпісаны міжурадавы пратакол, які легалізуе з 27 студзеня гэтага года прымяненне расійскім бокам пошліны на пастаўляемую ў Беларусь нафту. «Гэты пратакол не адпавядае прававой базе Мытнага саюза і тым рашэнням, якія былі прыняты прэзідэнтамі аб стварэнні з 1 ліпеня адзінай мытнай тэрыторыі», — падкрэсліў прадстаўнік МЗС. Неабходна правесці перагаворы трох бакоў, якія «павінны прывесці да зразумелай сістэмы экспарту нафты з Расіі ў Беларусь і ў Казахстан без спагнання мытных пошлінаў». «Адзіная мытная тэрыторыя, на якой прымяняюцца пошліны ва ўзаемным гандлі, — гэтага нельга нават уявіць». Калі бакі не здолеюць дамовіцца па пытанні пошлінаў, то ўзнікне таксама пытанне адносна прынятага ўрадамі трох краін рашэння аб далучэнні да СГА ў якасці адзінай мытнай тэрыторыі. «Узнікне пытанне, у якасці каго мы будзем уступаць у СГА», — адзначыў Антон Кудасаў.

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт інфармацыі ў СМІ аб магчымасці ўвядзення Расіяй экспартнай пошліны на газ, які пастаўляецца ў Беларусь, Антон Кудасаў сказаў так: «Калі мае месца адступленне ад базавых прынцыпаў Мытнага саюза адносна нафты і нафтапрадуктаў, то нельга выключаць магчымасць адступленняў і ў адносінах да іншых тавараў». Разам з тым, паводле яго слоў, увядзенне мытнай пошліны на прыродны газ было б прамым парушэннем існуючых дамоўленасцяў. Прадстаўнік МЗС таксама падкрэсліў, што стварэнне адзінай мытнай тэрыторыі да 1 ліпеня 2010 года з'яўляецца ключавой датай і пытанне аб магчымасці яе пераносу не абмяркоўваецца.

РАЗВЯЗАЛІ І КІНУЛІ НА ЎЗБОЧЫНЕ

Трое барысаўчан падазраюцца ў тым, што пайшлі на ўчыненне злачынства, каб завалодаць машынай расіяніна.

Апошняга пад пагрозай нажа зламысніклі звязалі і заляпілі яму рот скотчам. Калі ж іх ахвяра страціла прытомнасць, крымінальнае «трыа» развязалі яе і кінулі на ўзбочыне дарогі, пасля чаго завалодалі машынай і зніклі. Цела кіроўцы і аўтамабіль праваахоўнікі знайшлі, а падазроных ва ўчыненні злачынства затрымалі.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЯЎ

ПОМСТА ЖОНЦЫ І ПАДАТКОВАЙ

Жыхар штата Тэхас на сваім лёгкаматорным самалёце ўрэзаўся ў сяміпавярховы офісны будынак у горадзе Осцін, дзе размяшчаўся офіс падатковай службы. У выніку гэтага інцыдэнту загінулі двое, у тым ліку і сам атакуючы. Адразу пасля інцыдэнту ў паветра былі падняты два знішчальнікі F-16. Будынак падатковай загарэўся, раненні атрымалі сама меней трынаццаць чалавек, адзін знік без вестак.

Пілотам самалёта быў 53-гадовы амерыканец Джозэф Эндру Стэк, які зарабляў на жыццё распрацоўкай праграмнага забеспячэння. Напярэдадні тэракту ён змясціў у інтэрнэце перадсмяротнае пасланне на шасці старонках, у якім выступіў з абвінавачваннямі супраць шматлікіх дзяржаўных і фінансавых інстытутаў краіны, у тым ліку службы ўнутраных прыбыткаў Тэхаса (яго прадстаўніцтва знаходзілася ў разбураным будынку), каталіцкай царквы, экс-прэзідэнта ЗША Джорджа Буша, дзейнай сістэмы медыцынскага страхавання, амерыканскіх банкаў і жонкі, з якой ён зусім нядаўна ўзяў шлюб.

НОВАНАРОДЖАНЫ? ПРЫЗЫЎНІК!



У Расіі з'явіцца электронныя пашпарты прызыўніка, якія будуць заводзіцца на ўсіх хлопчыкаў з самага нараджэння. Гэту інфармацыю агучыла начальнік упраўлення ваеннай адукацыі, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны Расіі Тамара Фальцава.

«Першапачаткова разглядалася, што так званыя электронныя пашпарты прызыўнікоў будуць уводзіцца ў краіне з 10-гадовага ўзросту хлопчыкаў. Цяпер гэта палажэнне ўдакладняецца, і, хутчэй за ўсё, такія пашпарты будуць уводзіцца з моманту нараджэння немаўлят мужчынскага полу», — цытуе Фальцаву «Інтэрфакс».

Гэта палажэнне ўключана ў канцэпцыю федэральнай сістэмы падрыхтоўкі грамадзян да ваеннай службы да 2020 года і павінна ўвайсці ў дзеянне з 20 лютага 2010 года. Цяпер асобныя моманты гэтага дакумента ўдакладняюцца на ўрадавым узроўні. Паводле слоў Фальцавай, электронныя пашпарты прызыўніка заменяць усе ваенна-ўліковыя дакументы, якія існавалі раней. Дагэтуль у расійскіх ваенкаматах і іншых органах ваеннага кіравання на прызыўнікоў заводзіліся асабістыя справы, якія захоўваліся ў папяровым выглядзе.

КАРЭЦ ВЫКРАЎ 1200 ПАР ПАНОШАНАГА АБУТКУ

Паліцыя Паўднёвай Карэі арыштавала мужчыну, які выкраў 1200 пар паношанага абутку. Вялікую частку крадзяжоў карэец здзейсніў на пахаваннях.

Мужчыну злавілі, калі ён выкраў адразу тры пары абутку агульным коштам каля двух мільёнаў прэч (1750 долараў ЗША). Як высветлілася, 59-гадовы ўладальнік фірмы па продажы ўжыванага абутку прыходзіў у розныя ўстановы і на цырымоніі развітання з нябожчыкамі ў старых чаравіках. Паводле традыцыі, ён здымаў абутак ля ўвахода, а на выхадзе абуваў чужы, выбіраючы той, які пасля мог прадаць даражэй. Паліцыя абшукала склад арыштаванага і выявіла там больш за тысячу пар чаравікаў, расстаўленых па памерах і падрыхтаваных да продажу.

ДАВЕРЫЛІ ХІТРУНУ BR1,8 МІЛЬЯРДА

Але замест абяцанага жылля больш як сто кліентаў падзронага нажылі праблемы.

У Мінску затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Фонд сацыяльнай абароны «Час», у дачыненні да якога заведзена крымінальная справа па частцы 4 артыкула 210 Крымінальнага кодэкса — «крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі».

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр РУУС Фрунзенскага раёна Ала Галубовіч, згаданая прадпрымальная асоба са студзеня 2005 па снежань 2009 года займалася тым, што ў якасці інвестара прыцягвала ад грамадзян грошы на будаўніцтва кватэр. Паводле запэўнівання старшыні гэтага грамадскага аб'яднання, сродкі людзей павінны былі пайсці на ўзвядзенне жылых дамоў: маўляў, адзін дом будзе пабудаваны ў пасёлку Ждановічы, другі — на вуліцы Шаранговіча ў сталіцы. Праўда, як выявілася, словы ў гэтага таварыша разыходзіліся са справамі. Паводле папярэдняй інфармацыі, замест таго, каб выканаць свае абяцанні, ён заключыў фіктыўныя дагаворы на пастаўку электратэхнічнай прадукцыі і пералічыў 1 мільярд 800 мільёнаў рублёў на рахунак аднаго з закрытых акцыянерных таварыстваў. А пасля проста завалодаў гэтымі грашыма, якія ён абнаяўліваў праз ілжэпрадпрымальніцкія структуры. Такім чынам падазроны нашкодзіў больш як ста чалавекам, якія паверылі ў гэтага «інвестара»...

Ігар ГРЫШЫН.

ЗГАРЭЛА КВАТЭРА З-ЗА МАБІЛЬНІКА

У Віцебску зараднае ўстройства мабільнага тэлефона стала прычынай пажару ў кватэры. З кватэры на пятым паверсе пажарныя эвакуявалі нецвярозага гаспадара і ягоную чатырохгадовую дачку, ім надзелі спецыяльныя маскі для выратавання.

Як паведаміла «Звяздзе» **памочнік начальніка Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО,** пажарных выклікалі жыльцы дома па вуліцы Лазо, у якім на першым паверсе гарэла кватэра. Літаральна ўвесь пад'езд быў напоўнены дымам. Сусед з кватэры насупраць нават зламаў дзверы, каб патушыць агонь.

Пажарныя прыехалі хутка. У выніку ніхто не пацярпеў. Самая верагодная прычына пажару — замыканне зараднага ўстройства мабільнага тэлефона. Гаспадар пайшоў на працу і пакінуў дома мабільны тэлефон заражацца. Па папярэдніх падліках, страта ад пажару — 6 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЫВОК НАПЕРАД, У БІЯТЛОННЫМ СТЫЛІ

15 жыхароў Магілёўскай вобласці за працоўныя дасягненні і грамадскую актыўнасць атрымалі СПЕЦЫЯЛЬНУЮ ПРЭМІЮ «ЧАЛАВЕК ГОДА».

Фота Мікалая ЦІТОВА.

Мерапрыемства ў Магілёўскім Доме Саветаў пачалося з віншаванняў біятланісту Сяргею Новікаву, новаму срэбранаму медалісту Ванкувера. Жыхар Магілёўскай вобласці ўпершыню ў гісторыі атрымаў алімпійскі медаль па біятлоне. Бацькі Сяргея жывуць у раённым цэнтры Чавусы: яго тата і дасюль працуе ў дзіцячай спартыўнай школе трэнерам па біятлоне. Сам спартсмен — супрацоўнік Магілёўскай мытні. Вельмі верагодна, што «Чалавекам года» за 2010 год стане менавіта Сяргей Новікаў.

Адзін з лаўрэатаў прэміі «Чалавек года-2009», **генеральны дырэктар СЗАТ «Сервалюкс» Яўген Баскін**, таксама ўзгадаў поспех беларускіх біятланістаў і заклікаў браць з іх прыклад.

— Летась наша эканоміка трапіла ў зону турбулентнасці, — сказаў ён. — Аднак крызіс дае і шанц перамагчы. Як у біятлоне: калі напарадзе бягуць прызнаныя чэмпіёны, але яны неўзабаве пайшлі на штрафны круг, у цябе ёсць магчымасць усё зрабіць як трэба і вырвацца наперад!

Прэмію «Чалавек года» атрымалі людзі розных узростаў і прафесій.

— Але кожны з іх дасягнуў у сваёй справе вяршыні майстэрства, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.** — Яны ставіліся да сваёй працы з душой і добрасумленна, і іх стараннасць будзе сёння ўзнагароджана па заслугах.

Партрэты лаўрэатаў прэміі з'явяцца на Дошцы гонару Магілёўскай вобласці. А сама прэмія складае 100 базавых велічыняў.

— Я падзялюся грашыма са сваімі дзецьмі і ўнукамі, — радасна ўсміхалася 50-гадовая **даярка з СВК «Аўсянка» Горацкага раёна Таццяна Анціпенка.** — Вельмі прыемна, што мне далі прэмію, і я буду працаваць далей. Цяпер надой ад маіх кароў складае ў сярэднім 8 тысяч літраў.

«Людзі года» дзякавалі ўладам за ўвагу і дзяліліся планамі на будучыню. Напрыклад, **дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк Магілёва Галіна Краўчанка,** аўтар асветніцкіх праектаў мінулага года, сёлета збіраецца правесці ў абласным цэнтры фестываль бібліятэк.

— У маіх планах — добрая праца, — заявіў лаўрэат прэміі **старшыня СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна Аляксандр Лапацентаў.** — Наша гаспадарка шмат чаго дасягнула, а цяпер нас цікавіць найперш эканоміка. Не проста лічбы росту, а прыбыткі ў рэальных грошах.

«Чалавекам года» стаў **епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім.**

— Я ўспрымаю гэту прэмію як знак павагі і даверу да дзейнасці Беларускай праваслаўнай царквы, — сказаў ён. — Але яна натхніць мяне рабіць лепей і працаваць больш. Сёлета мы будзем аднаўляць у Бабруйскай крэпасці храм Аляксандра Неўскага, які быў разбураны ў 1930-я гады, ад яго застаўся толькі падмурак. Дазволы атрыманыя, і як толькі сыдзе снег, пачнём земляныя работы.

Прэмію «Чалавек года» ў Магілёўскай вобласці атрымалі таксама горацкі ветэран і грамадскі актывіст **Леанід Самусенка,** галоўны канструктар «Трансмаша» **Дзмітрый Караткевіч,** начальнік Клімавіцкай ПМК № 256 **Уладзімір Нікіфараў,** дырэктар «Мсціслаўлёна» **Мікалай Піванкоў,** дырэктар Асіповіцкага лясгаса **Мікалай Роўбель,** настаўнік фізікі ліцэя № 1 Магілёва **Валерый Барашкоў,** магілёўскі хірург **Аляксандр Гурэвіч,** участковы інспектар з Быхава **Дзмітрый Дзенісенка,** дырэктар Кіраўскага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання **Людміла Дарошка**, трэнер па лёгкай атлетыцы **Аляксандр Кіцэнка**. Усім лаўрэатам пажадалі новых дасягненняў на карысць Беларусі.

Ілона ІВАНОВА.

МЕДАЛЬНЫ ДОЖДЖ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праўда, нямецкі трэнер паказваў чатыры пальцы — верагоднасць 4-га месца для беларускі была вельмі вялікай. За яе спінай ішлі ўкраінка Валя Семярэнка і полька Вераніка Навакоўска. Але мы стаялі да канца, і не далі Зіберту нават долі сумнення ў завяванні Дашай бронзы. Як вынік, асноўныя яе суперніцы па адным разе прамазалі і выбылі з барацьбы за месца на п'едэстале. Ёсць першы алімпійскі медаль!

Тое, што рабілася пазней, можна было прадказаць. Кіраўніцтва беларускай дэлегацыі на чале з міністрам спорту і турызму Алегам Качаном адразу рынулася з віншаваннямі да спартсменкі, якую доўгі час не прапускалі да сваіх расійскія і замежныя журналісты. Яны ўжо паспелі зрабіць выснову для сябе: Дар'я Домрачава — гэта новы лідар сусветнага біятлона.

Пасля гэтай гонкі стала зразумела, што такі медальны пачатак падвінен прынесці нейкую долю ўпэўненасці ў шэрагах беларускіх спартсменаў. Надавалі станоўчы імпульс і камплименты з боку вядомых расійскіх журналістаў. Напрыклад, каментатар РТР Дзмітрый Губерніеў сам падышоў да беларускіх калегаў і падзякаваў за цудоўны вынік нашай біятланісткі. На душы стала лягчэй, сказаў Губерніеў, што і наша Даша заваявала медаль. Бо ад расійскіх біятланістаў удача пакуль адварочваецца.

Да нашай каманды яна ў гэты дзень наадварот павярнулася тварам. У мужчынскай гонцы на 20 км мала хто мог меркаваць, што беларус Сяргей Новікаў умяшаецца ў барацьбу за медалі паміж нарвежцамі Свендсанам і Б'ёрндаленам. Аднак гэта здарылася.

Бадай, самай вялікай нечаканасцю стала тое, што Новікаў і Б'ёрндален паказалі аднолькавы час на дыстанцыі. Гісторыя сусветнага біятлона такога выпадку не прыпомніць, хоць у лыжных гонках аднойчы такое здаралася. У 1983 годзе на чэмпіянаце свету па лыжных гонках у Нарвегіі на дыстанцыі 30 км савецкі лыжнік Аляксандр Заўялаў падзяліў першае месца з нарвежцам Эдвардам Бро — кожны са спартсменаў атрымаў па залатым медалі. Цяпер кожнаму біятланісту было ўручана па сярэбраным. А вось бронзавы прызёр у такіх выпадках не вызначаецца.

На прэс-канферэнцыі, якая прайшла пасля заняцця гонкі, Сяргей Новікаў зіхацеў ад шчасця. Побач з 5-разовым алімпійскім чэмпіёнам Оле-Эйнарам Б'ёрндаленам яму яшчэ быць не даводзілася. А ў кампаніі двух знакамітых нарвежцаў — тым больш.

У гэты вечар гучалі фанфары і ў адрас беларускіх атлетаў, якія, можна не сумнявацца, паклалі пачатак новай эры айчыннага біятлона і сталі эталонам у дасягненні высокіх спартыўных вынікаў на топтурнірах, узорам праяўлення лепшых чалавечых якасцяў дзеля дасягнення пастаўленай мэты.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Абзац

◢ У Мінску жанчына 1930 г.н. загінула ад кавалка лёду, што зваліўся з даху. Няшчасны выпадак адбыўся на вуліцы Даўгабродскай. Бабуля разам са сваімі сяброўкамі ўчора каля дзвюх гадзін дня сядзела на лавачцы каля пад'езда, калі з даху на яе зваліўся кавалак налёдзі. Яна памерла на месцы да прыезду хуткай дапамогі, медыкі канстатавалі смерць.

◢ **З-за снегавой нагрузкі пашкоджаны дах над спартовай залай сярэдняй школы ў вёсцы Малькавічы Ганцавіцкага раёна. НЗ адбылося ўчора раніцай. Аднаскатны дах пашкоджаны на плошчы 400 кв.м. Будынак — 1980 года пабудовы, шыферны дах фактычна з'ехаў разам з латамі. Ніхто не пацярпеў. Падыходы да будынка абмежаваныя, заняткі праводзяцца ў іншых памяшканнях школы. Пачаліся ўзнаўленчыя працы.**

◢ Народная артыстка Расіі Валянціна Талкунова ўчора выпісалася з Магілёўскай абласной бальніцы, куды трапіла пасля канцэрта падчас гастроляў у Магілёве. Яна выказала глыбокую ўдзячнасць за аказаную ёй прафесійную меддапамогу, падзякавала лечачым урачоў за тое, што так хутка дапамаглі ёй нармалізаваць ціск. Учора ў 8 гадзін раніцы яна паехала ў Маскву. Спецыялісты ацэньваюць стан 63-гадовай артысткі як здавальняючы.

◢ **Штодзень у ДТЗ гіне каля 100 еўрапейцаў ва узросце да 25 гадоў. Пра гэта паведаміла Сусветная арганізацыя аховы здароўя (ВОЗ). На кожны выпадак смерці прыходзіцца ў сярэднім 35 траўмаў, якія маюць доўгатэрміновыя наступствы для здароўя пацярпелых.**

◢ Супрацоўнікі МНС на пажары ў Мінску выратавалі чатырох чалавек. У 17.12 паступіла паведамленне аб пажары ў пакоі на трэцім паверсе трохпавярховага жылога дома барачнага тыпу на вуліцы Першамайская. У 17.50 пажар быў ліквідаваны. Супрацоўнікі МНС выратавалі мужчыну, у чыёй кватэры пачаўся пажар, а таксама суседзяў — дзяцей ва ўзросце 2 і 7 гадоў і іх бабулю. Трое дастаўлены ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі з дыягназам «атручванне прадуктамі гарэння». Эвакуацыя іншых жыльцоў дома не спатрэбілася.

◢ **Бацька і сын, жыхары Бабруйска, падманулі беларускія банкі на Br195 млн. Пракуратура Магілёўскай вобласці завяла крымінальную справу аб махлярстве ў дачыненні да жыхароў Бабруйска — бацькі і сына 1956 і 1980 гадоў нараджэння, дырэктараў двух прыватных прадпрыемстваў. Яны падазраюцца ў тым, што ў 2008—2009 гадах махлярскім шляхам завалодалі Br195 млн, якія належалі розным банкам Беларусі.**

Поўны абзац

◢ Балівійская дзяўчынка, якая нарадзілася ў самалёце балівійскай авіякампаніі TAM, можа бясплатна лятаць унутры краіны да 21 года. Маці дзяўчынкі Лурдэс Мамані, якая павінна была нарадзіць праз два тыдні, села ў самалёт, што ляцеў з горада Кочабамба ў Ла-Пас. Прыкладна на паўдарозе да пункту прызначэння ў жанчыны пачаліся схваткі. Па шчаслівай выпадковасці сярод пасажыраў апынуліся ўрач і медсястра, якія і прынялі роды. Не даляцеўшы, да сталіцы, пілоты папрасілі пасадкі ў бліжэйшым аэрапорце. Дзяўчынцы далі імя Тамі Фабіёла, дзе першае слова ўключае назву кампаніі TAM, а другое ўтворана ад абрэвіятуры FAB, што азначае ваенна-паветраныя сілы Бразіліі. Акрамя права бясплатна лятаць на самалётах, дзяўчынцы паабяцалі спецыяльную стыпендыю, якую яна будзе атрымліваць з моманту навучання ў школе і да заканчэння ўніверсітэта.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Механізм пастаноўкі на чаргу маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў змяніўся ў Беларусі з 19 лютага

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 19 лютага.)

Таксама ўводзіцца новая норма, якая прадугледжвае нераспаўсюджванне месячнага тэрміну засялення на жылыя памяшканні, прызначаныя для адсялення грамадзян з падлягаючых зносу жылых дамоў. Унясенне гэтага дапаўнення выклікана працягласцю працэдур перадачы ва ўласнасць грамадзян жылых памяшканняў узамен прыналежных ім на праве ўласнасці і падлягаючых зносу.

Указам № 543 прадугледжаны і катэгорыі грамадзян, якія маюць права на прадастаўленне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання без чаргі. Устаноўлена, што гэтым правам не змогуць скарыстацца інваліды I і II груп, а таксама ветэраны.

Разам з тым прыемным зменам змогуць парадавацца тыя, хто карыстаецца сацыяльным жыллём. Тэрмін карыстання сацыяльным жыллём працаздольнымі паўналетнімі членамі сям'і наймальніка ў выпадку выезду наймальніка на пастаяннае пражыванне ў іншае жылое памяшканне або яго смерці павялічваецца да 10 гадоў (раней 3 гады). Прадугледжана захаванне права карыстання жылым памяшканнем сацыяльнага карыстання для працаздольных членаў сям'і памерлага наймальніка, калі пры атрыманні такога жылля наймальнік зрабіў адчужэнне мясцовым выканаўчым і распарадчым органам або іншым дзяржаўным арганізацыям, якія прадаставілі яму жылое памяшканне, прыналежнае яму на праве ўласнасці, не толькі на бязвыплатнай, але і на платнай аснове.

Прыняты і шэраг іншых змяненняў і дапаўненняў.

УНП 200093330

Уважаемые акционеры

ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин.

ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин извещает акционеров о проведении 25 марта 2010 года в 14.00 очередного общего собрания акционеров по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний.

Повестка дня общего собрания:

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2009 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2010 год.
7. Об утверждении дополнений в Устав Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер — паспорт; представитель — паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 августа 2006 г. № 1093 «Об утверждении Инструкции о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями».

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 15 февраля 2010 года.

Наблюдательный совет ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин.

Утерянный страховой сертификат «Зеленая карта» **серии BY12 № 3151977** СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным.**

«УПАКАВАНЫЯ» КВАТЭРЫ СТАЛІЦЫ КАШТУЮЦЬ 600—700 ТЫСЯЧ USD

Няблага жывём!

Аналіз адкрытай інфармацыі з базы звестак Нацыянальнага кадастравага агенцтва Дзяржаўнага камітэта па маёмасці дазваляе скласці спіс самых дарагіх дамоў і кватэр Мінска.

Эксперты спецыялізаваных агенцтваў падлічылі, што пакупнікі 150 самых дарагіх кватэр сталіцы заплацілі летась за набытае жыллё каля 35 млн долараў. Бадай, самым дарагім жылым домам прававерна лічыцца шасціпавярховы будынак прэміум-класа па вуліцы Ваньковіча побач з Нацыянальнай бібліятэкай. Дом мае аўтаномную сістэму ацяплення і ўласную гараж-стаянку. Адразу чатыры кватэры дома трапілі ў першую дзясятку дарагога жылля. Адна пяціпакаёвая кватэра там агульнай плошчай 210 кв. м каштавала пакупніку каля 1 млрд 160 млн рублёў, або на той час прыкладна 430 тысяч долараў. Новы гаспадар аддаў крыху больш за 2 тысячы долараў за квадратны метр. На шостым паверсе сапраўды грандыёзная чатырохпакаёўка агульнай плошчай 257 квадратных метраў была прададзена ўвогуле за 389 тысяч долараў, або крыху больш чым 1,5 тысячы USD за жылёвы квадрат.

Адным з самых дарагіх лічыцца пяціпавярховы сучасны дом на вуліцы Масквіна. У першыя 20 дарагіх кватэр тут трапіла адразу 5 жылых аб'ектаў. Самая вялікая чатырохпакаёвая кватэра агульнай плошчай 364,3 кв. м абышлася пакупніку за 490 тысяч долараў. Астатнія 4 дарагія кватэры агульнай плошчай каля 180 «квадратаў» былі набытыя новымі гаспадарамі па кошце ад 885 да 822 мільёнаў рублёў.

Даволі дарагі дом быў здадзены ў эксплуатацыю летась восенню на праспекце Незалежнасці побач з Акадэміяй навук. Адразу 6 кватэр гэтага васьміпавярховага дома трапілі ў рэйтынг дарагога жылля. Кватэры агульнай плошчай больш за 130 кв. метраў каштавалі пакупнікам у межах 270 тысяч долараў.

Новы дом па вуліцы Шорнай у раёне Нямігі і жылы будынак па вуліцы Калініна, здадзены ў эксплуатацыю летам мінулага года, таксама трапілі ў топ дарагіх дамоў. Там самыя прасторныя трохпакаёвыя і чатырохпакаёвыя кватэры былі прададзены летась за 600—700 млн рублёў.

Між іншым, самай дарагой кватэрай, па звестках Нацыянальнага кадастравага агенцтва, летась стала чатырохпакаёўка па вуліцы Акадэмічнай. Кватэра агульнай плошчай каля 230 квадратных метраў была прададзена ў лютым мінулага года за 1 млрд 735 млн рублёў. На той час кватэра ў валюце абышлася пакупніку прыкладна ў 630 тысяч долараў. Квадратны метр гэтай кватэры каштаваў амаль 2700 долараў.

Трэба заўважыць, што прыведзенае вышэй дарагое жыллё прадавалася летась у новых дамах амаль заўсёды без аздаблення. **Старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ** адзначыў рэдакцыі, што на другасным рынку самыя дарагія кватэры прадаваліся летась у не вельмі маладых пяці-, шасціпавярховых дамах па вуліцах Карла Маркса, Якуба Коласа, Грыбаедава і праспекце Незалежнасці. Напрыклад, летась агенцтвы нерухомасці сталіцы атрымлівалі заказы з боку прадстаўнікоў замежных кампаній і камерцыйных структур на набыццё элітнага жылля менавіта ў прэстыжных раёнах Мінска. Пакупнікі былі згодныя набываць апартаменты «вышэйшага гатунку» пад ключ, у якіх квадратны метр жылля абмяжоўваўся цэннікам да 5—6 тысяч долараў. Аздабленне і «начынка» такіх кватэр цягне часам да паловы сабекошту гэтага жылля. Падобныя кватэры робяцца па індывідуальных дызайнерскіх праектах, маюць скураную мэблю, сучасную бытавую тэхніку, відэакомплексы і г.д. Для Беларусі здзелкі такога кшталту сёння з'яўляюцца яшчэ экзотыкай. Для ажыццяўлення элітпраектаў у старых дамах спачатку трэба выкупіць 2—3 кватэры на адной пляцоўцы, потым зрабіць поўную перапланіроўку, пасля чаго на рынак трапляюць эксклюзіўныя варыянты кватэр. Агульная плошча такіх апартаментаў складае звычайна 120—140 «квадратаў», а каштуюць яны каля 600—700 тысяч долараў. Попыт на эксклюзіўныя кватэры такой якасці і камплектацыі невялікі, але існуе і сёння, лічыць Мікалай Прасталупаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ВЯЛІКІ ПЛЮС МАЛОМУ ПАСЕЛІШЧУ

Дробны бізнэс у рэгіёнах можа горы звярнуць, і дзяржаўная падтрымка, здаецца, ёсць, але чамусьці далёка не ўсюды ён разгортваецца

Ала МАЧАЛАВА

Што робіць не так? Чаго не хапае, каб запісанае на паперы запрацавала ў жыцці? За ідэямі па ўдасканаленні заканадаўства сенатары выправіліся ў Лагойск. А паглядзець тут ёсць на што. Уводзяцца ў гаспадарчы абарот аб'екты нерухомасці (у тым ліку і недабудаваныя), ствараюцца новыя вытворчасці, узнікаюць дадатковыя працоўныя месцы, ідзе выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі, пашыраюцца паслугі насельніцтву. А галоўнае, заканадаўцаў паўсюль сустракалі маладыя, ініцыятыўныя, хваткія, прадпрымальныя кіраўнікі.

Сенатары паглядзелі, як абсмажваюцца арэшкі і семкі на прадпрыемстве «Нікіцін». Даведаліся пра тое, што найтанчэйшая плёнка, літаральна ў некалькі мікронаў, дазваляе павысіць стойкасць інструмента ў разы на Гюрынг-Бел (вытворчы цэнтр сусветнага вытворцы рэжучага інструмента Guehring), сярод кліентаў якога — МТЗ, Магілёўліфтмаш і шмат іншых волатаў айчыннай прамысловасці. Азнаёміліся з вытворчасцю розных відаў упакоўкі з гафрыраванага кардону на прадпрыемстве «Гафрамір». Сталі літаральна першымі сведкамі запуску новай лініі на «Лекфарме», якая абышлася прадпрыемству ў 700 тыс. долараў, — яна поўнасцю аўтаматызаваная, сама правярае на сколы і адбракоўвае неадпаведную прадукцыю. Калісьці Лекфарм пачынаўся ўсяго з 21 працаўніка, сёння іх налічваецца 140, з сярэднім заробкам (паводле звестак за студзень) — 1,8 млн рублёў. А планы і таго смялейшыя — ужо сёлета павялічыць прадукцыйнасць утрая і трапіць у пяцёрку фармацэўтычных лідараў у Беларусі.

— Галоўнае — выпускаць тое, што патрэбна людзям, — дзеліцца сакрэтамі поспеху **кіраў

Два бакі медаля

«Я ВЕДАЛА, ШТО САБАКІ КУСАЮЦЦА, АЛЕ КАБ ЕЛІ ЗАЖЫВА...»

Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з 21-гадовай Таняй Шараевай з Бабруйска, якую ледзь не загрызла зграя сабак

Надзея ДРЫЛА

«Выжыву, чаго б мне гэта ні каштавала»

Падрабязнасцяў той жудаснай лістападаўскай ночы Таня не памятае.

— Псіхатэрапеўт сказаў, што гэта свядомасць блакіравала памяць, каб мне было лягчэй перажыць гора. Памятаю толькі, што іх было шмат, накінуліся на мяне, пачалі кусаць за галаву, ногі, рукі. Спрабавала адбівацца — сабакі злаваліся яшчэ больш.

Брэх у раёне прыватных забудоў, які бабруйчане завуць Чарапічным, пачуў заводскі рабочы Ігар Глуша, які якраз у гэты час вяртаўся пасля вячэрняй змены дадому. Мужчына прыкрыкнуў на дварнякоў і яны разбеглiся. «Дапамажыце» — пачуў ён ціхі стогн. За некалькі крокаў на зямлі ляжала акрываўленая маладая дзяўчына. На яе без слёз нельга было глядзець: усё цела ў страшных укусах, замест правай рукі — косткі ды сухажыллі.

— Руку мне ўрачы ампутавалі, — пераводзіць погляд дзяўчына на пусты рукаў сваёй кофтачкі. — Апрытомнела ў рэанімацыі. Думала, што я на хвіліну адключылася, насамрэч прайшло больш як 20 дзён.

Любы іншы чалавек на яе месцы пасля такога страціў бы жаданне жыць. Але толькі не Таня.

Летась больш як 23 тысячы чалавек пацярпелі ад укусаў (драпінаў, аслінення) дзікіх і хатніх жывёл.

— Выжыву, чаго б мне гэта ні каштавала, — падумала я. — Нават не дзеля сябе, дзеля мамы. Я ж у яе адна, яна ў мяне таксама.

«У майго выратавальніка добрая душа»

Больш за ўсё Таню ўразілі магілёўскія ўрачы і медсёстры. Людзі ў белых халатах не проста змагаліся за яе жыццё, але і ставіліся да дзяўчыны як да блізкага чалавека.

— Ірына Аляксеўна Рабініна была мне другой мамай, а Андрэй Яўгенавіч Махнач — бацькам, — кажа дзяўчына. — Мне з урачамі вельмі пашанцавала. Хацелася б выказаць сваю падзяку словамі, але гэта, паверце, немагчыма.

Ігар, які ў тую ноч адагнаў сабак, таксама падтрымліваў дзяўчыну, прыносіў шакалад, кветкі на 8 Сакавіка.

— Добрая душа ў майго выратавальніка. Спачатку плакаў, гледзячы на мяне. Уяўляеце, нават дарослы мужчына слёз не змог стрымаць. Калі ж вярнулася дадому з бальніцы, спрабаваў мяне куды-небудзь выцягнуць, каб я не замыкалася, седзячы ў чатырох сценах. Пазнаёміў са сваімі сябрамі. З Ігарам я не баюся хадзіць па вуліцы.

Перажывалі за Таню і зусім незнаёмыя людзі. Прыносілі і пералічвалі на рахунак грошы: хто колькі мог. Маліліся ў царкве. Устаўшы на ногі, яна і сама разам з мамай пачала наведваць службы. Там, у царкве, упершыню пасля трагедыі адчула сябе абсалютна абароненай.

«У стайні я забываюся нават аб тым, што ў мяне няма рукі»

Спачатку Таня хадзіла згорбіўшыся, як бабулька, — настолькі былі слабымі ногі. Пальцы на руцэ таксама не разгіналіся. Даведаўшыся пра трагедыю, дзяўчыну запрасілі прайсці курс іпатэрапіі ў конаспартыўным клубе «Ярмак», што знаходзіцца непадалёк ад Бабруйска. Радасці, узгадвае мая суразмоўца, не было межаў. Коней Таня любіць больш за ўсё на свеце, і гаварыць пра іх можа бясконца. І нядзіўна, дзяўчына на працягу сямі гадоў наведвала конаспартыўную школу ў Томску (у Беларусь Таня пераехала жыць, калі ёй было 18. — **Н.Д.**).

— Бачыце, пальцы на руцэ ўжо разгінаюцца. І ўсё дзякуючы Палестры і Марусі. Ведаеце, у стайні я забываюся пра ўсё на свеце, нават пра тое, што ў мяне няма рукі...

Праўда, даўно ўжо Таня не бачыла сваіх любіміц. Спачатку грошай не было, каб даехаць, пасля захварэла на грып. Так аслабела, што не магла ўстаць нават, каб выпіць таблетку.

Нашу размову перарвала мяўканне, і ў пакой зайшоў паласаты звер.

— Гэта мой кот Фелікс, — знаёміць са сваім сябрам па няшчасці дзяўчына. — Яго ў дзяцінстве суседка таксама выратавала ад зграі сабак. Крыху пазней я вас яшчэ і з Рэем пазнаёмлю. З сабакам сябрую. Ён у мяне дабрак.

Дварняка Таня прынесла ў дом яшчэ шчанём. Ён тады на далоньцы змяшчаўся. І адразу вырашыла выхоўваць добрым. Суседзі смяяліся: «Твой Рэй нават гаўкаць не ўмее, толькі цяўкае, такі не зможа дом ахоўваць». А Таня жартавала ў адказ: «Мне не ахоўнік, а званок патрэбны. Не пацярплю ля сябе агрэсіўнага сабаку».

Злых сабак дзяўчына заўсёды баялася і абыходзіла бокам. Быццам прадчувала бяду... А напярэдадні трагедыі прысніла зграю сабак. Праўда, у сне яны не кусаліся, а толькі гаўкалі.

— Мама сказала, што, калі сніцца сабака, значыць з'явіцца адданы сябар. Толькі цяпер я разумею, што адзін сабака і зграя — гэта не адно і тое ж...

«Абавязкова вывучуся і ўладкуюся на працу»

Паказваючы мне страшныя шнары на левай руцэ, дзяўчына расказала, што найбольш пакутуе летам. Душна, усе ідуць на возера, купаюцца, загараюць. А яна вымушана хадзіць у штанах і кофце. Вясной паедзе ў Мінск забіраць пратэз. Ён, паводле слоў Тані, у два разы шырэйшы за яе левую руку і вельмі нязручны. Каб паварушыць пальцамі, трэба прыкласці нямала намаганняў. Грошай жа на пратэз на батарэйцы пакуль няма.

— Ды і адкуль яны будуць. Мама працуе на заводзе. А пенсія ў мяне 180 тысяч. Вось і вырашыла ўладкавацца на працу. Праз бюро занятасці запісалася на камп'ютарныя курсы. 26 лютага пайду на гутарку.

Да 26-га яшчэ ёсць час, і Таня яго не страчвае дарэмна. На ноўтбуку, які ўзялі ў крэдыт, вучыцца хутка набіраць тэксты.

— Я не магу сказаць, што ўсё жыццё марыла працаваць аператарам ПЭВМ, але цяпер выбар у мяне невялікі. Што я магу адной рукой?.. Нагрузкі супрацьпаказаныя, на вуліцы ў мароз доўга не магу знаходзіцца. Бывае, рукой папраўлю шапку — дык рука імгненна замярзае.

Злых сабак дзяўчына заўсёды баялася і абыходзіла бокам. Быццам прадчувала бяду... А напярэдадні трагедыі прысніла зграю сабак. Праўда, у сне яны не кусаліся, а толькі гаўкалі.

Непакоіць і рана на галаве, якая ўсё ніяк не зажыве... Сабакі знялі скальп, і Тані даводзіцца насіць парык. А яшчэ зусім нядаўна яе густая, доўгая, светла-рыжая, з попельным адценнем шавялюра выклікала ўсеагульнае захапленне.

Сабакі знялі скальп, і Тані даводзіцца насіць парык. А яшчэ зусім нядаўна яе густая, доўгая, светла-рыжая, з попельным адценнем шавялюра выклікала ўсеагульнае захапленне.

Таня — камунікабельная непаседа з зайздросным пачуццём гумару. А таксама клапатлівая дачка. Сваю любімую мамачку — Ірыну Віктараўну — радуе, як можа. І печку распаліць, і пірагоў напячэ.

— Гатаваць я вельмі люблю. Праўда, чысціць агародніну адной рукой не магу, а вось што датычыцца тартоў і пірагоў — гэта для мяне. Цеста мясіць налаўчылася, пліту ж давялося аўтаматычную набыць.

«Ніхто больш не павінен выпрабаваць падобнае»

Мама Тані пасля той трагедыі, якая здарылася з яе дачкой, ненавідзіць усіх сабак.

— Маму можна зразумець. Складана ўявіць, што яна перажыла, пакуль я ляжала без памяці. Мне ўжо пасля расказалі, што яна плакала дзень і ноч, не паліла печку, не варыла есці. Цёмка з вёскі прыязджала і прывозіла суп у слоіку.

Таня ж і любіць, і ненавідзіць сабак адначасова. Калі бачыць на вуліцы сабаку без намордніка і павадка, сэрца заходзіць у пяткі. Дзяўчына лічыць, што для бадзяжных сабак трэба ствараць гадавальнікі — няхай сабе жывуць за плотам у цеплыні і сытасці. Не згодная яна з тым, каб стэрылізавалі такіх сабак і адпускалі на вуліцу.

— Мне ўсё адно, што будуць рабіць з сабакамі. Галоўнае, каб іх не было без гаспадара на вуліцы. Больш за ўсё мне страшна за дзяцей. Я сама не паспела пажыць нармальна, папрацаваць. Ніхто больш не павінен выпрабаваць падобнае.

* * *

Перад ад'ездам Таня папрасіла мяне схадзіць разам з ёй у краму па кефір. Аказваецца, і цяпер, а пасля трагедыі прайшло ўжо больш за год, дзяўчына баіцца выходзіць на вуліцу адна. Ля крамы нас сустрэў, на першы погляд, бяскрыўдны дварняк. Таня, хаваючыся за мяне, хуценька зачыніла за сабой дзверы.

Правёўшы дзяўчыну дадому, вярнулася на прыпынак, які знаходзіцца якраз насупраць крамы. Аўтобуса чакалі дзве бабулькі, малады чалавек і жанчына з сынам гадоў трох. Хлопчык бегаў ззаду за тым сабакам, які напужаў Таню, смяяўся і махаў рукамі. «Максім, пастой спакойна, укусіць жа», — павысіла голас на сына матуля... Якраз у гэты момант пад'ехаў аўтобус.

Таніна гісторыя, падобная на фільм жахаў, так і не прымусіла асобных людзей задумацца аб тым, што яны нясуць адказнасць за тых, каго прыручылі. Сабакі, і хатнія, і бадзяжныя, магчыма і менш, але працягваюць бегаць без дагляду. Дык няўжо, каб дастукацца да кожнага і звярнуць на гэта ўвагу, чалавеку трэба ўкусіць сабаку...

Фота аўтара.

P. S. *Дарэчы, бабруйчане дагэтуль не вераць, што на дзяўчыну напалі бадзяжныя сабакі. «Хутчэй за ўсё, дварнякі падышлі пазней, пасля таго, як дзяўчыну пакалечылі сабакі байцовых парод», — уздыхнула кандуктарка, з якой я разгаварылася на зваротным шляху. У пракуратуры ж Першамайскага раёна горада Бабруйска каментар даваць адмовіліся. Сказалі тэлефанаваць пасля 4 сакавіка (у гэты дзень будзе разгледжаны касацыйны пратэст па гэтай справе).*

Дарэчы, крыху больш як два гады таму выклікала рэзананс смерць 5-месячнай дзяўчынкі ў Першамайскім раёне горада Мінска. Малечу, якую маці пакінула ў кватэры без дагляду, пакусаў стафардшырскі тэр'ер. Праз дзве гадзіны дзяўчынка памерла ад ранаў у рэанімацыі дзіцячага хірургічнага цэнтра.

Пра часовы прытулак для бадзяжных сабак у Бабруйску і жорсткія расправы над бяздомнымі «бобікамі» на вачах дзяцей у Стоўбцах чытайце ў адным з найбліжэйшых нумароў.

Умей вырабіць і прадаць

Не замаражаныя крызісам

ВОСТРАЎ ПЭЎНАГА ДАБРАБЫТУ Ў НЕСПАКОЙНЫМ КРЫЗІСНЫМ МОРЫ ЭКАНОМІКІ — МАГІЛЁЎСКАЯ ФАБРЫКА МАРОЗІВА

Дырэктар Магілёўскай фабрыкі марозіва Таццяна БАНДАРЧУК: «Наш антыкрызісны рэцэпт — тэхнічнае пераўзбраенне і новая якасная прадукцыя».

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Гэта невялікае прадпрыемства (усяго 260 працаўнікоў) робіць стаўку на тэхнічнае пераўзбраенне і новую якасную прадукцыю. Насуперак крызісу, мінулы год для фабрыкі стаў ледзь не лепшым у гісторыі.

— Я і сама здзіўляюся, — спрабуе патлумачыць дырэктар Таццяна Бандарчук. — Я кірую фабрыкай чатыры гады, і штогод мы ўкараняем новыя тэхналогіі, вырабляем нешта новае. Для гэтага мы карыстаемся ўласнымі сродкамі і льготнымі крэдытамі, за якія трэба сказаць дзякуй уладам.

Новая лінія — новая прадукцыя. Летась на фабрыцы запушчаны на поўную магутнасць дзве новыя лініі. Адна з іх, дзе вырабляецца гофратара, забяспечвае ўпакоўку не толькі прадукцыі самой фабрыкі, але і ўсіх малочных прадпрыемстваў рэгіёну. Не вельмі дарагая лінія коштам у 120 мільёнаў рублёў акупілася літаральна за паўгода.

АБЫШЛІ КАНКУРЭНТАЎ

Другая лінія выпабляе глазураваныя шакаладам сыркі. Іх смак прыйшоўся даспадобы не толькі магілёўцам, але і жыхарам іншых абласцей.

— Мы доўга меркавалі, перш чым ставіць лінію сыркоў, таму што гэта каштавала нятанна — мільярд рублёў, — прызнаецца Таццяна Бандарчук. — У нас не было прыдатнага памяшкання: проста некалькі кабінетаў і склад. Мы зруйнавалі сцены, зрабілі добры рамонт, набылі сучасную лінію і, урэшце, не прагадалі.

Летась, паводле складзенага бізнэс-плана, фабрыка бралася вырабіць 70 тон сыркоў, але насамрэч вырабіла і прадала без праблем 250 тон. На сёлета запланавана 360 тон, але дырэктар мяркуе, што зробяць і болей. Новае абсталяванне акупіцца за некалькі гадоў.

Нягледзячы на сур'ёзную канкурэнцыю на рынку глазураваных сыркоў нават у межах рэгіёну і разнастайнасць гэтай прадукцыі на паліцах крамаў, фабрыка ўсяго толькі за год стала лідарам па продажы гэтых сыркоў у Магілёўскай вобласці.

НАВУЧЫЦЦА ПРАДАВАЦЬ

«У яркай сучаснай упакоўцы па сярэднім кошце мы прапануем якасны натуральны прадукт», — так тлумачаць паспяховую рэалізацыю глазураваных сыркоў на фабрыцы.

— У нас свая асаблівая тэхналогія, — кажа Таццяна Бандарчук. — Мы не прасуем тварог, не выдаляем з яго лішнюю вільгаць. Таму атрымліваецца прыемная мяккая кансістэнцыя. Дадаткі натуральныя: згушчанае малако, чарнасліў, какава. Мне самой падабаецца.

Але рэалізацыя нават дастойнага прадукту патрабуе намаганняў. Першы крок — гэта фарміраванне дастойнага аддзела збыту. На фабрыцы прызнаюцца, што ў апошнія гады ні ў адным аддзеле не было такой бягучасці кадраў. Урэшце ўдалося стварыць калектыў кваліфікаваных спецыялістаў, якія пастаянна вучацца новым формам і метадам працы.

— Да таго ж, мы адразу зразумелі: калі мы самі не будзем рухаць сваю прадукцыю — ніхто гэтага за нас не зробіць, — каментуе дырэктар. — У нас маленькая фабрыка, а ўлады звычайна больш увагі надаюць рэалізацыі прадукцыі буйных горадаўтваральных прадпрыемстваў. Але ўсё павярнулася да лепшага: урэшце мы навучыліся самастойна выжываць у гэтай вар'яцкай канкурэнцыі.

ПЛАМБІР З ЛЁВАМ

Фабрыка марозіва актыўна рэкламуе сваю прадукцыю, робіць дэгустацыі. Цацачны Лёва з Магілёва, сімвал прадукцыі фабрыкі, з'яўляецца на ўсіх дзіцячых акцыях абласнога цэнтра. Нават з інспектарамі ДАІ ходзіць у школы, каб пераконваць салодкімі падарункамі прытрымлівацца правілаў дарожнага руху.

Разам з тым, працуе тэхнічны савет і ў бурных спрэчках нараджае новыя рэцэпты. Ідэі спецыялісты чэрпаюць нават з дзіцячай фантазіі. Нядаўна адбыўся конкурс малюнкаў на лепшае фантазійнае марозіва. Малыя малявалі сваё самае любімае марозіва і прыдумлялі для яго назвы.

Праўда, самым папулярным відам марозіва застаецца пламбір. Менавіта гэты зусім не дыетычны прадукт настолькі завяваў сімпатыі спажыўцоў, што яго доля ў агульным аб'ёме магілёўскага марозіва складае 60—70 %.

— Мы не гонімся за таннасцю, але гонімся за якасцю, — так кажуць на фабрыцы. Менавіта магілёўскае марозіва адным з першых у краіне атрымала знак «натуральны прадукт».

Сёлета на прадпрыемстве адчыніцца новы варачны цэх, альбо, як яго называюць марозіўшчыкі, кухня. Цяпер гатаванне марозіва будзе рабіцца ў закрытым рэжыме. Гэта не толькі скароціць выдаткі, але і павысіць якасць прадукту.

ЛІЧБЫ І ГРОШЫ

— Калі я прыйшла на фабрыку, — узгадвае дырэктар, — то 98 % аб'ёмаў вытворчасці займала марозіва, а 2 % — маянэз. Марозіва — гэта сезонны прадукт. Улетку мы вырабляем яго 300 тон, а па-за сезонам толькі 50.

Таму фабрыка ўзімку ледзь выжывала: работнікі вымушаны былі сыходзіць у адпачынкі за свой кошт, у вымушаныя, на 2/3 і гэтак далей.

Цяпер, калі з'явілася новая прадукцыя, эканоміка фабрыкі стала адной з самых паспяховых у горадзе. Летась прыбыткі фабрыкі марозіва павялічыліся ў 2 разы, павысілася рэнтабельнасць да 13 %, аб'ём вытворчасці павялічыўся на 23 %. Вынік — другое месца ў Магілёве па развіцці ў 2009 годзе.

Сярэдні заробак на фабрыцы перавышае мільён рублёў.

— Я заўсёды кажу калектыву: працуйце, будзе багатым ваша прадпрыемства — будзеце і вы багацець, — усміхаецца Таццяна Бандарчук. — Я хачу, каб наша прадпрыемства стала адным з лепшых у краіне, каб людзі атрымлівалі тут дастойны заробак і ішлі штодня на працу з задавальненнем.

ПЕРСПЕКТЫВА

— Далей мы хочам патрапіць на рынкі Расіі, — заявіла кіраўнік фабрыкі. — Гэта пакуль складана, але мы хутка забяром сертыфікат з Бранскай лабараторыі. Ёсць зацікаўленасць прынамсі ў нашых глазураваных сырках у Бранску, Смаленску, Калузе. З намі хочуць працаваць, і мы прабуем.

У будучым на фабрыцы хочуць павялічыць асартымент маянэзу і, магчыма, заняцца вырабам кетчупаў.

— Так і можна пераадолець крызіс: штодня меркаваць, што мы будзем заўтра альбо паслязаўтра рабіць новае, — тлумачыць Таццяна Бандарчук. — І мы не стаім на месцы.

Падштурхоўвае ўсё ж такі крызіс: упершыню за многія гады рэалізацыя марозіва летась паменшылася. Не намшмат — на 5 %, але гэта трывожны сігнал. Марозіва — усё ж не прадукт першай неабходнасці. Спачатку людзі набываюць малако, хлеб і мяса, а ўжо якія грошы застаюцца — дзецям і сабе на ласункі.

Таму фабрыка цяпер моцна спадзяецца на добрае лета — у спякоту рэалізацыя марозіва значна павялічваецца. Але яшчэ болей — на саміх сябе, каб развівацца тэхнічна, выраблять якасную прадукцыю і паспяхова ёй гандляваць.

Ілона ІВАНОВА.

Край у снягах патанае,
Ў полі завея енчыць,
Свечка мая малая,
Сціплы яе агеньчык.
Але у ночы зімовай,
Ён растапляе гурбы -
Чэзне палон лядовы,
Хцівыя ціхнуць віхуры…
Каб запаліўся золак,
Свечку запальваюць людзі,
Бо без маленькіх зорак
Зорнага неба не будзе.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Радыёкропка працуе. Абаненцкую плату за перыяд рэканструкцыі ўносіць не трэба

З вёскі Берлеж Пухавіцкага раёна патэлефанавалі Ніна Іванаўна Корань з дачкой Аленай: не працуе радыё. Хоць гісторыя насамрэч не такая кароткая.

Паводле слоў заяўнікаў, радыё не працавала ўжо даўно, да чаго вяскоўцы паспелі прызвычаіцца. А тут нядаўна раптам званок, маўляў, чаму не плаціце за паслугу? Дык а за што плаціць, калі тое радыё маўчыць, у сваю чаргу здзівіліся людзі. Пачуўшы тое, да абаненцтаў выслалі майстра, які сапраўды ўсё адрамантаваў. Аднак радыё літаральна праз два дні зноў змоўкла. Жанчыны турбаваць майстроў не сталі, а адразу звярнуліся ў газету...

Сітуацыю па просьбе рэдакцыі пасля праверкі выкладзенай чытачкамі інфармацыі пракаментаваў **намеснік начальніка Пухавіцкага раённага вузла электрасувязі Мікалай АЗІМАЎ**. Паводле яго слоў, Берлеж адносіцца да Блужскага сельскага Савета. Летась на яго тэрыторыі ішло добраўпарадкаванне аграгарадка, падчас якога праводзілася планавая рэканструкцыя лініі электрапередач. Кажучы карацей, драўляныя апоры замяняліся на жалезабетонныя.

— Спецыфіка моманту ў тым, што ў нас правады радыёсувязі пракладзены разам з электрычнымі на адных апорах — як і паўсюдна. Таму з верасня па снежань 2009 года на цалкам законных падставах — на час працы электрыкаў, што першымі пачалі мяняць сваю «гаспадарку» — абанентаў радыё адключылі ад сеткі. Пра што, дарэчы, даваліся аб'явы, — патлумачыў Мікалай Мікалаевіч. — Пасля завяршэння працы электрыкамі да планавай работы прыступіў ужо наш раённы вузел электрасувязі. Зноў жа на час правядзення гэтых работ складаліся спісы абанентаў на зняцце на гэты перыяд з іх абаненцкай платы.

І тут, зазначыў далей Мікалай Азімаў, па нейкай выпадковасці з гэтых спісаў з усяго Берлежа «выпала» толькі наша заяўніца. Натуральна, ёй нядаўна патэлефанавалі і нагадалі, што трэба плаціць за радыё. Аднак цяпер ва ўсім разабраліся і Ніна Іванаўна, як і іншыя вяскоўцы, не будзе плаціць як за перыяд у канцы мінула года, так і ў пачатку сёлетняга — калі вяліся работы па рэканструкцыі лініі электрапередач. А чаму радыё пагаманіла толькі два дні і зноў змоўкла?

— Зноў жа супадзенне. Якраз у гэты момант мянялася праграмнае забеспячэнне: ішло пераключэнне старой станцыі на новае абсталяванне. Працэс ужо завершаны, радыё ў доме вашых заяўнікаў спраўна працуе, можаце патэлефанаваць ім і пераканацца, — сказаў Мікалай Мікалаевіч.

Напрыканцы застаецца толькі дадаць, што ў выпадку чаго абаненту трэба найперш інфармаваць раённы вузел электрасувязі, а не, напрыклад, рэдакцыю. Бо інакш як там могуць даведацца, што недзе радыё не працуе. Калі не будзе такога звароту, нават калі радыёкропка будзе пэўны час маўчаць, абаненцкую плату ўсё адно давядзецца ўносіць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЕНТЫЛЯЦЫЯ ПАДВЯЛА

У Баранавічах чадным газам атруцілася сям'я, якая жыве ў прыватным доме. Гаспадар дома з нявесткай апынуліся ў нефралагічным аддзяленні гарбальніцы, а двухгадовага хлопчыка і трохмесячную дзяўчынку паклалі ў дзіцячую бальніцу. Калі спецыялісты зрабілі ў доме замеры, то выявілася, што канцэнтрацыя чаднага газу перавышаная ў дзесяць разоў. А няшчасны выпадак здарыўся з-за забітай вентыляцыі, якая павінна была забяспечыць цягу пры катле ацяплення.

І НОЧ НЕ ДАПАМАГЛА

На аўтамагістралі Кобрын—Гомель, каля в. Камень, а 4-й гадзіне супрацоўнікі Кобрынскага РАУС, УКДБ і КДК па Брэсцкай вобласці праверылі аўтамашыну жыхара г. Іванава і знайшлі там 80 рулонаў кантрабандная тканіны коштам 50 млн рублёў. А праз гадзіну на гэтай жа дарозе каля в. Барысава быў затрыманы грамадзянін Украіны, які вёз без дакументаў 50 туш цяляціны. Тавар канфіскаваны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НА ЎЛАДУ СПАКУСІЎСЯ

Без усёй аргтэхнікі пакінуў Стрэшынскі пасялковы выканаўчы камітэт Жлобінскага раёна невядомы, які пранік у будынак мясцовай улады. Ноччу злодзей разбіў акно ў аптэцы, што прымыкала да будынка, потым узламаў дзверы ў пакой, дзе знаходзіліся камп'ютар, прынтары, сканер, факс, фотаапарат, тэлефон і гэтак далей. Страты сельвыканкама ацэньваюцца на суму больш чым 2,5 мільёна рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВОСТРАЎ КАХАННЯ І...

У Дзень святога Валянціна на арэне Лядовага палаца ў Баранавічах быў зарэгістраваны шлюб. Вадзіцель Генадзь БУДЫКІН і лабарантка малочнага камбіната Ірына ТЫШЛЯК выйшлі на лёд і тым самым падтрымалі ініцыятыву ўладаў горада аб правядзенні вяселляў у новым палацы. Са 153 шлюбаў, якія адбыліся сёлета — гэта быў першы ў Лядовым. А ці прыжывецца новая традыцыя?

— На маю думку, цікавасць у людзей павінна з'явіцца, хоць пакуль што маладыя ў чаргу на вяселле ў палацы не становяцца. Але ў нас ёсць рэкламны ролік, на якім запісана вяселле Будыкіных, і мы будзем прапаноўваць маладым правядзенне ўрачыстасці ў Лядовым палацы, — растлумачыла загадчыца ЗАГСа Святлана Валынец.

— Іншым разам даводзіцца чуць, што вяселле павінна запомніцца на ўсё жыццё. Але ж гэта мае значэнне, калі маладыя пражывуць разам доўга і шчасліва, а інакш тое вяселле губляе сваю спрадвечную каштоўнасць. Сёння пажаніліся — заўтра развяліся і што тады застаецца ад традыцыі, няхай і самай-самай?

— Адны разводзяцца, другія ствараюць трывалыя сем'і, будуць жыць, гадаваць дзяцей і помніць сваё вяселле. Мы працуем на станоўчы вынік. Усім прыемна, калі новая традыцыя прыжываецца і становіцца для людзей натуральнай з'явай.

— Святлана Віктараўна, а ў вас да Лядовага палаца была нейкая нарацоўка, у сэнсе ўрачыстай цырымоніі?

— У горадзе ёсць востраў Кахання, там стаіць альтанка і сімвалічныя дрэвы з металу, на якіх закаханыя пары могуць павесіць замочкі на шчасце. Пры рэгістрацыі шлюбу мы такі замок маладым уручаем, вядома, калі яны захочуць. Летась замкі атрымалі 598 пар. Завод аўтаматычных ліній пастаўляе ЗАГСу замкі, і калі маладыя хочуць узяць удзел у гэтым сімвалічным рытуале, то плацяць 42 тысячы, а гэта на 11 тыс. рублёў даражэй, чым пры звычайнай рэгістрацыі. Калі маладыя ідуць на такі крок, то, напэўна, гэта ім цікава і прыемна.

Замкнёнае шчасце

На востраве Кахання, які знаходзіцца ў мікрараёне «Паўночны», быць не давялося, хоць у мясцовай прэсе пісалі пра яго неаднаразова. Палічыў, што тут адкрыцця вялікага няма. Некалькі гадоў таму расійскія тэлеканалы паказвалі сюжэты, у якіх маладыя вешалі замочкі на мастах і металічных агароджах, а ключы кідалі ў раку.

Пасля размовы з загадчыцай ЗАГСа я ў гэты ж дзень паехаў на востраў Кахання. Каб трапіць на яго, трэба зрабіць вялікі круг наўкол возера, а калі напрасткі, то рукой падаць — метраў пяцьдзесят. Прайшоў па снезе возерам і набраў поўныя чаравікі вады, развярнуўся — і праваліўся глыбей. Адсюль і выснова напрошваецца: з каханнем трэба асцярожна — не ляцець на злом галавы.

Абышоў наўкол і апынуўся перад мастком, які вядзе на востраў. Снег расчышчаны, і ўсё падмецена. На поручнях сям-там вісяць замкі, але асноўная маса іх — на двух металічных дрэўцах, усталяваных за некалькі метраў ад альтанкі.

На дэкаратыўных дрэвах — вялікае мноства рознакаліберных замкоў — ад свірнавога да зусім маленькага. На фоне снегу замкі чырвонага колеру (напэўна, з завода аўтаматычных ліній) гараць быццам гілі на бэзе. Наўкол бярозы ў шэрані — хораша, а калі летам побач з востравам плаваюць лебедзі, то, напэўна ж, ствараецца ўражанне ідыліі.

Пазіраючы на тыя замкі, я падумаў, што многія з іх з'яўляюцца нямым дакорам тым, хто павесіў замочкі і думаў, што яны будуць гарантыяй сямейнага шчасця.

У 2009 годзе ў нашай краіне разводаў паменшала, але ўсё адно лічбы ўражваюць. На 78 800 шлюбаў прыпадае 35 056 разводаў. Каб яшчэ крыху, то кожная другая пара была б у разводзе. Напэўна, такая статыстыка і на востраве Кахання. Цікава, а гаспадары тых замочкаў, калі зноў будуць рэгістраваць шлюбы з новымі спадарожнікамі (-цамі) жыцця, ці прыйдуць на востраў, каб яшчэ раз павесіць замкі?

Гэты востраў яшчэ называюць востравам Шчасця, але з улікам таго, колькі там замочкаў сталі сведкамі паспешлівасці, неабдуманасці, глупства і пралітых слёз, то будзе больш аб'ектыўна называць востраў Кахання, Шчасця і... Няхай кожны дадумае сам.

Але я яшчэ не сказаў пра самае галоўнае — дзеля чаго ўзяўся пісаць гэты артыкул.

У многіх рэчах ёсць нешта, што нам не падабаецца. Ад цыбулі плачуць, ад сонца можа скура злезці, ад стаматолага нацерпішся, але гэта тыя мінусы, якіх нельга пазбегнуць.

Вось і наша размова пра востраў Кахання вялася не для таго, каб сказаць, што ён не патрэбны. Маглі на ім выпускаць на волю галубоў, а не замыкаць замкі — сутнасць не ў гэтым. Улада горада зрабіла добрую справу, у востраў Кахання ўкладзены вялікія грошы дзеля таго, каб маладых уцягнуць у своеасаблівую гульню. А хіба жыццё наша не гульня?! Магчыма, толькі паміраючы, чалавек забывае пра гэта.

Раней маладыя хадзілі ўскладваць кветкі да помніка Леніну — сёння гэты варыянт не зусім прымальны. Цяпер ужо некалькі іншы расклад — нясуць кветкі да помніка воінам-вызваліцелям — усё гэта дужа сур'ёзна. А на востраве Кахання можна пасмяяцца і павесіць замочкі на шчасце. А можа, сапраўды, нехта праз 25 гадоў прыйдзе, а ён вісіць. У гэтай гульні ёсць і шчымлівы момант. Але...

Сорам, не пакідай нас

Загляну ў востраў Кахання і стала сорамна. Пазіраю на замочкі, а ў вочы лезуць мацерныя словы, якімі пакрыты тыя дэкаратыўныя дрэўцы. Брыдкія словы напісаны чорным па белым. Уявім, што заўтра свой замочак прынясуць маладыя — прыедуць з бацькамі, сябрамі... Стануць перад тым дрэвам, маладая ў вэлюме, а як адвесці позірк, калі перад табой б..., х... А можа, я ўсё перабольшваю і нікога тое брыдкаслоўе не бянтэжыць? Я не ханжа, але калі чую, якім матам (на ўсю вуліцу) крыюць «патэвэшніцы», якія ідуць з інтэрната ў сваё вышэйшае вучылішча (былое тэкстыльнае), то становіцца няёмка. Але ж нават сярод гэтай катэгорыі 16—17-гадовых дзяўчатак далёка не ўсе такія.

А на тым востраве адзначаюць свае юбілейныя даты і немаладыя людзі, якія пражылі разам вельмі доўга. Вось вісіць замок, на якім напісана: «Каханне назаўсёды», а па гэтым надпісе мат. Мірыцца з гэтым?

Калі ствараўся востраў Кахання, то думалася, што на ім будзе прысутнічаць пачуццё чысціні і ўзнёсласці, бо каханне, на самым пачатку, такім і ёсць. Але ж на востраў прыходзіць і розны зброд з фламастарам — таксама частка нашага грамадства.

Міліцэйскі пост там не паставіш, але ж нехта наводзіць парадак, то чаму б чалавеку, які востраў прыбірае, не даць бутэльку з растваральнікам? Можна было б тыя словы рэгулярна змываць ці зафарбоўваць, калі змыць не ўдасца. Выправіць сітуацыю і трымаць яе пад кантролем можна. Міма такіх фактаў мы не павінны праходзіць. Усе гэтыя надпісы і вулічнае брыдкаслоўе ўплывае на моладзь — фарміруе яе светапогляд.

Пакуль чалавек здольны саромецца, а ў грамадстве жыве гэтае пачуццё, то не ўсё згублена. Сорам, не пакідай нас.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.

Сталічныя прадпрымальнікі могуць атрымаць ільготныя крэдыты

20 мільярдаў рублёў выдзеліць Мінгарвыканкам на падтрымку малога прадпрымальніцтва ў 2010 годзе, прычым з іх 19 мільярдаў будуць накіраваныя на ільготнае крэдытаванне ІП, мікраарганізацый і малых прадпрыемстваў. Пра гэта расказаў журналістам Аляксандр КАЛІНОЎСКІ, намеснік старшыні камітэта эканомікі і начальнік управўлення прадпрымальніцтва Мінгарвыканкама.

Па яго словах, механізмы выдзялення ільготных крэдытаў актыўна асвойваліся і адпрацоўваліся ў 2009 годзе, калі Белінвестбанкам і Белгазпрамбанкам былі выдадзеныя 18 крэдытаў на суму 1,254 млрд рублёў і 23 крэдыты на суму 2,48 млрд рублёў адпаведна. У Мінгарвыканкаме палічылі такую форму падтрымкі эфектыўнай, і таму ў 2010 годзе льготныя крэдыты будуць выдавацца ўжо праз 8 банкаў у адпаведнасці з нормамі Указа Прэзідэнта № 255 ад 21 мая 2009 года «Аб некаторых мерах дзяржаўнай падтрымкі малога прадпрымальніцтва».

— У 2010 годзе на падтрымку малога прадпрымальніцтва выдзелена сродкаў у 10 разоў болей, чым у 2009 годзе: тады было выдзелена 2 мільярды рублёў, а цяпер — 20 мільярдаў, асноўную частку з якіх (19 млрд) плануецца накіраваць менавіта на льготнае крэдытаванне інвестыцыйных праектаў малога прадпрымальніцтва нашага горада, — заявіў Аляксандр Каліноўскі.

Ён жа падкрэсліў, што льготныя крэдыты будуць выдавацца толькі пад інвестыцыйныя праекты, накіраваныя на развіццё ці пашырэнне вытворчасці, дзейнасці ў сферы паслуг і гандлю. Прыярытэтнымі з'яўляюцца напрамкі, накіраваныя на імпартазамяшчэнне і выпуск экспартнай прадукцыі, а абавязковай умовай — стварэнне новых працоўных месцаў.

— Мы таксама звяртаем увагу на памер сярэдняй зарплаты, — кажа Аляксандр Каліноўскі. — Калі суб'ект гаспадарання хоча атрымаць крэдыт, а ў яго сярэдняя зарплата 300—400 тысяч, то зразумела, што гэта не зусім празрысты бізнэс, бо за такія грошы ніхто працаваць не будзе. Але мы не адмаўляем, а прапануем за некалькі месяцаў давесці ўзровень зарплаты да сярэдняй па горадзе ў гэтай галіне дзейнасці і тым самым спрабуем стымуляваць пераход на сумленную працу ў рамках заканадаўства.

Ільготныя крэдыты, расказаў Аляксандр Аляксандравіч, будуць выдавацца на тэрмін да 2 гадоў, магчымая адтэрміноўка выплаты асноўнага доўгу ў залежнасці ад віду дзейнасці і фінансавай устойлівасці прадпрыемства. Крэдыты будуць выдавацца ў беларускіх рублях, працэнтныя стаўкі вызначаныя ў памеры стаўкі рэфінансавання Нацбанка, паменшанай на 2 працэнты (на сёння гэта 13 % — 2 % = 11 %), прычым банкі не будуць браць дадатковыя сродкі за абслугоўванне крэдыту.

Што датычыцца сумаў, то тут жорсткіх рамак няма:

— Мы не ўстанаўлівалі мінімальных ці максімальных сумаў, — тлумачыць Аляксандр Каліноўскі. — Безумоўна, можа прыйсці адзін суб'ект гаспадарання і папрасіць крэдыт на 19 мільярдаў, таму мы дамовіліся з банкамі, што ў выключных выпадках будзем разглядаць крэдыты да 500 мільёнаў. Ну а калі казаць па вопыце мінулых гадоў, то сярэдні памер крэдытаў — 80—100 мільёнаў рублёў. У прынцыпе, гэта нармальныя грошы, — лічыць Аляксандр Аляксандравіч.

Дарэчы, на 31 снежня 2009 года ў сталіцы было зарэгістравана 39 176 прыватных камерцыйных прадпрыемстваў і 70 869 індывідуальных прадпрымальнікаў. Усяго за 2009 год у Мінску зарэгістраваліся 6283 юрыдычныя асобы (меней чым у 2008-м на 296) і 8286 ІП (болей чым у 2008-м на 886). Аднак нягледзячы на вялікую лічбу ў 70 тысяч зарэгістраваных ІП, сваю дзейнасць, па звестках падатковай інспекцыі, ажыццяўляюць толькі 49 581 (хоць гэтая лічба большая на 5205 чалавек у параўнанні з 2008 годам). Такую разбежку ў лічбах Аляксандр Каліноўскі патлумачыў тым, што зарэгістравацца ў якасці прадпрымальніка вельмі проста, а вось механізм ліквідацыі пакуль складаны.

Наогул жа індывідуальныя прадпрымальнікі сталіцы заплацілі ў бюджэт 214,4 мільярда рублёў за мінулы год, што болей на 6,3 %, чым было ў 2008 годзе.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ПАДАТКОВАЯ: У АПОШНІ ДЛЯ КАГОСЬЦІ РАЗ?..

Сяргей РАСОЛЬКА

СЁЛЕТА, у адрозненне ад большасці мінулых гадоў, калі ў гэты час мы паспявалі ўжо нават забыць, што наведвалі падатковую інспекцыю ў пачатку года, выправіцца туды атрымалася толькі ў перадапошні перыяд яе працы па прыёме дэкларацый ад грамадзян адносна сукупнага гадавога даходу — у сярэдзіне лютага. Калі бухгалтэрыя здолела выдаць даведку, тады і пайшлі. І ў гэтым аказаліся як свае плюсы, так і мінусы. А яшчэ — магчымасць на развітанне прааналізаваць, як змянялася падатковае заканадаўства за апошнія гады, адпаведна, каго, з чым і як сустракалі ў падатковай.

Чэргі

За больш чым паўтузіна гадоў наведвання падатковай даводзілася бачыць рознае: і чэргі (з адпаведнай атмасферай у іх) на тры гадзіны і практычна імклівае праходжанне працэдуры падачы дэкларацыі. Нагадаю, што найбольшым наплывам людзей вызначыўся пачатак 2007 года, калі падатковую льготу ў сувязі з будаўніцтвам ці пагашэннем банкаўскага крэдыту, узятага пад гэтыя мэты, можна было атрымаць толькі праз падатковую інспекцыю. Памятаеце, што рабілася тады ў калідорах перад дзвярыма інспектараў? У наступным годзе грамадзянам вярнулі права выбару — ільготу можна было атрымліваць як па месцы асноўнай працы, так і па выніках года праз падатковую — і зноў стала спакайней, бо многія выбралі першы, менш клопатны, варыянт. А летась права выбару зноў скасавалі: вяртаць залішне заплачаныя падаткі ў сувязі з будаўніцтвам кватэры ці пагашэннем банкаўскага крэдыту, узятага пад гэтыя мэты, можна было толькі па месцы асноўнай працы, падаючы патрэбныя дакументы ў бухгалтэрыю.

Інспектары

У розныя гады ў дачыненні да грамадзян іх паводзіны таксама істотна адрозніваліся: ад абыякавасці і нават пэўнай грубаватасці да падкрэслена карэктных паводзінаў і добразычлівасці. Усё сказанае, безумоўна, датычыцца сітуацыі ўвогуле, калі, напрыклад, знерваваныя і стомленыя доўгім стаянням у чарзе людзі спрабавалі «перахапіць» у калідоры сноўдаючых з пакоя ў пакой работнікаў інспекцыі, каб нешта ўдакладніць, чым выклікалі ў іх раздражненне. Як і няздольнасцю многіх самастойна запоўніць бланк дэкларацыі, акрамя асабістых звестак (пра гэта крыху ніжэй асобна). Але, трэба аддаць належнае, калі ты садзіўся перад канкрэтным інспектарам, той, няхай і сцяўшы ў пэўным сэнсе зубы ад твайго непаразумення, заўсёды прафесійна і карэктна па-чалавечы рабіў сваю справу.

Запамінальным быў год з'яўлення Дырэктывы № 2: ніякіх чэргаў! Нягледзячы на вялікую колькасць наведвальнікаў, інспектары паводзілі сябе надзвычай добразычліва. Іх нават шкада было — настолькі яны былі стомленыя, настолькі шмат у іх было працы.

Бланкі

Яны практычна ўвесь час змяняліся: калі да зручнасці наведвальнікаў, калі — не вельмі. Агульная тэндэнцыя: бланкі дэкларацый аб сукупным гадавым даходзе пакрысе спрашчаліся. Колькі гадоў таму ў шапіку, перш чым прадаць грамадзяніну паперы, гучала пытанне: дапамогу з-за мяжы атрымлівалі? Калі не, колькі аркушаў не выдавалася. Потым інспектар мог выдаліць яшчэ аркуш-другі, што былі непатрэбнымі. На большасці астатніх у пэўных графах грамадзянін часам мусіў пісаць аднолькавае «не». За мінулыя гады ў цэлым бланкі рабіліся ўсё больш прасцейшымі і зразумелымі для большасці людзей — настолькі, што на самастойнае запаўненне хапала хвілін дзесяць, прычым можна было цалкам абысціся без парадаў кансультантаў і падказак у выглядзе вывешаных узораў запаўнення. Хоць, па праўдзе, многія на 100 працэнтаў іх рэдка запаўнялі: заўсёды былі нейкія дробныя сумненні, таму спадзяваліся на падказку інспектара. Сёлета бланк дэкларацыі складаўся з двух аркушаў, чатырох старонак. На мой погляд, гэты варыянт нарэшце максімальна наблізіўся да самага простага і зразумелага. Толькі...

Вылік

Толькі з гэтага года правілы зноў змяніліся, прынамсі для журналістаў: вярнуць залішне заплачаныя падаткі ў сувязі з прафесійнымі вылікамі, звязанымі з атрыманнем аўтарскага ўзнагароджання (ганарару), як ужо паведамлялася раней у нашай газеце, цяпер можна толькі па месцы асноўнай працы, напісаўшы адпаведную заяву. Такім чынам, калі не будзе іншых падстаў (продаж аўтамабіля, кватэры за пэўны прамежак часу), калегам па цэху ўжо няма патрэбы наведвацца ў падатковую.

Сёлета названы вышэй плюс заключаўся ў поўнай адсутнасці людзей у падатковай: напэўна, як па прычыне ўвогуле скарачэння колькасці наведвальнікаў, так і з-за больш позняга па часе туды нашага візіту. Яшчэ адзін плюс быў у тым, што пра канкрэтна журналістаў інспектары валодалі інфармацыяй. Патлумачу. У мінулыя гады кожны раз усе прысутныя разам абмяркоўвалі: як жа правільна запаўняць паперы па вяртанні падаткаў у сувязі з атрыманнем аўтарскага ганарару, дзе што пісаць. Не тое, каб інспектары гэтага не ведалі ўвогуле, напэўна, у агульнай масе журналісты раствараліся. А тут, відаць, апошнім часам ішоў толькі «наш брат» (нібы ў пацверджанне літаральна ўслед за намі ў пустой інспекцыі з'явіўся калега з іншага выдання).

Але ў гэтай сітуацыі быў і мінус: інспектар заявіла, што стамілася тлумачыць і самім работнікам СМІ і іх бухгалтэрыям, што трэба падаваць даведку зусім іншага зместу, чым было раней, што яна не рызыкне браць адказнасць за атрыманыя лічбы...

А потым, як было і раней, хутка і добразычліва дапамагла запоўніць да канца ўсе патрэбныя графы ў бланку дэкларацыі. У апошні для нас раз?..

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мядок у халадок

Мікалай БОГУШ з вёскі Чэмернае Лельчыцкага раёна — патомны пчаляр. Яго бацька, дзед і прадзед былі бортнікамі. Жыхары Лельчыцаў ахвотна набываюць яго мёд.

Маеце права на адрасную сацыяльную дапамогу, але своечасова не аплацілі камунальныя паслугі?

Угэтым выпадку дапамога выдзяляецца ў першачарговым парадку на пагашэнне запазычанасці па аплаце жыллёва-камунальных паслуг. Грошы цалкам альбо часткова пералічваюцца на рахунак арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і аказвае камунальныя паслугі.

Гэта прадугледжана, нагадала **начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена ДУДЗІНСКАЯ**, Указам Прэзідэнта № 458 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе», які ўвайшоў у сілу з пачатку гэтага года. А безнаяўныя жыллёвыя субсідыі, якія раней даваліся грамадзянам з нізкім узроўнем даходу на аплату жыллёва-камунальных паслуг, скасаваныя. Цяпер грамадзянам, у якіх даход у сярэднім на душу насельніцтва ніжэйшы за вызначаны бюджэт пражыткавага мінімуму (далей — БПМ), замест ранейшых двух відаў падтрымкі (штомесячнай сацыяльнай дапамогі і безнаяўных жыллёвых субсідый), прадастаўляецца толькі штомесячная сацыяльная дапамога. Апошняя можа накіроўвацца ў тым ліку на аплату жыллёва-камунальных паслуг.

— Пры гэтым грамадзяне звяртаюцца ў адну інстанцыю і падаюць адзін пакет дакументаў для прызначэння такой дапамогі, — падкрэсліла Алена Іванаўна.

Больш за тое, Указам вызначаны адзіны крытэрый патрэбы грамадзян для прадастаўлення дзяржаўнай падтрымкі. Штомесячную дапамогу могуць атрымаць тыя сем'і (грамадзяне), сярэднедушавы даход якіх па аб'ектыўных прычынах ніжэйшы за 100 працэнтаў БПМ (255 220 рублёў). Памер штомесячнай дапамогі складае дадатную розніцу паміж крытэрыем патрэбы і сярэднедушавым даходам. Сукупны даход сям'і (грамадзяніна) вылічваецца за 12 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу звароту. Перыяд прызначэння штомесячнай сацыяльнай дапамогі павялічыўся да 6 месяцаў, раней яна прызначалася, як правіла, на тры месяцы.

Аднаразовую ж дапамогу могуць атрымаць тыя сем'і (грамадзяне), якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі (інваліднасць, хвароба, стыхійнае бедства, катастрофы, пажары і іншыя абставіны) і маюць даход у сярэднім на душу насельніцтва ніжэйшы за 150 працэнтаў БПМ (382 830 рублёў). Памер аднаразовай сацыяльнай дапамогі вызначаецца ў межах ад 50 да 500 працэнтаў БПМ у залежнасці ад сітуацыі. Аднаразовая дапамога прызначаецца сем'ям (грамадзянам) не больш за адзін раз на працягу каляндарнага года.

Надзея ДРЫЛА.

«АДНАЎЛЕННЕ АЦЯПЛЯЛЬНАЙ СІСТЭМЫ І РАМОНТ ПАШКОДЖАНАГА АБСТАЛЯВАННЯ — ЗА КОШТ ВІНАВАТЫХ АСОБАЎ»

Рэха публікацыі

У нумары газеты ад 6 лютага мы расказвалі пра непрыемную гісторыю, у якую не па сваёй волі патрапіла жыхарка Мар'інай Горкі Пухавіцкага раёна Галіна Браніславаўна Грыгарэнка. Нагадаем коратка, што яшчэ 17 снежня мінулага года ў доме заяўніцы прапала святло. Рамонтнікі ж прыехалі толькі бліжэй да абеду наступнага дня. Усё б нічога, але менавіта тады на дварэ стаялі адчувальныя маразы, а газавы кацёл у доме праз трансфарматар быў падключаны да электрасеткі. І, як мы ўжо гаварылі ў мінулы раз, такога «экстрыму» ён папросту не вытрымаў: выйшаў са строю. І вось пэўны час з таго моманту жанчына безвынікова спрабавала атрымаць кампенсацыю матэрыяльных стратаў, якую, як была ўпэўнена Галіна Браніславаўна, ёй павінны былі сплаціць Мар'інагорскія электрычныя сеткі. Па падтрымку жанчына звярнулася ў «Звязду».

На той момант нам удалося даведацца прычыну здарэння (яна была тэхнічная), а таксама тое, што прадстаўнікі прадпрыемства (прызнаўшы сам факт здарэння) вядуць дыялог з грамадзянкай у пошуках кансэнсусу. Даведаліся мы і пра тое, што з Мінска чакалася камісія, якая павінна была расследаваць здарэнне больш дэталёва і зрабіць свае высновы, якія, у сваю чаргу, маглі дапамагчы знайсці паразуменне паміж зацікаўленымі бакамі гэтага своеасаблівага супрацьстаяння. Рэдакцыя чакала гэтай самай кропкі над «і». І вось з Мінскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі «Мінскэнерга» нам даслалі афіцыйнае рэагаванне.

«Ваш зварот... разгледжаны з выездам на месца прадстаўнікамі РУП «Мінскэнерга», Мінскіх электрычных сетак і Пухавіцкага раёна электрычных сетак (мова арыгінала. — **С.Р.**).

У выніку расследавання выяўлена парушэнне аператыўнай дысцыпліны дзяжурным персаналам Пухавіцкага раёна электрычных сетак (РЭС), што з'явілася прычынай выхаду са строю газавага катла і ацяпляльнай сістэмы кватэры.

Зараз ацяпляльная сістэма ў кватэры адноўлена (трубы і радыятар ацяплення), а газавы кацёл 9.02.2010 г. накіраваны ў рамонтную майстэрню. Аднаўленне ацяпляльнай сістэмы і рамонт пашкоджанага абсталявання выконваюцца за кошт вінаватых асобаў.

Загадам Мінскіх электрычных сетак ад 9.02.2010 г. № 54 дзяжурным дыспетчарам Пухавіцкага РЭС Валковічу і Норык аб'яўлена заўвага і зніжаны памер прэміі за студзень 2010 года на 100 працэнтаў, начальніку дыспетчарскай службы Пухавіцкага РЭС Вераскоўскаму аб'яўлена заўвага і зніжаны памер прэміі за студзень 2010 года на 50 працэнтаў, начальніку Пухавіцкага РЭС Хадыку аб'яўлена заўвага і зніжаны памер прэміі за студзень 2010 года на 25 працэнтаў».

Далей у афіцыйным лісце «Мінскэнерга» просіць у Галіны Браніславаўны прабачэння за ўпушчэнні ў працы падпрадкаванага персаналу і прынесеныя пры гэтым нязручнасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЛІПАВАЯ» БУХГАЛТЭРЫЯ

Бухгалтар Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа чыгуначнага транспарту ў кастрычніку мінулага года ўнесла ў даведку аб даходах заведама несапраўдныя звесткі аб сваёй зарплаце. На падставе «ліпавага» дакумента бухгалтар змагла ўзяць у банку 98 мільёнаў беларускіх рублёў у крэдыт.

Ігар ГРЫШЫН.

КВОТА НА ВЫТВОРЧАСЦЬ У 2010 ГОДЗЕ ГАРЭЛКІ І ЛІКЁРА-ГАРЭЛАЧНЫХ ВЫРАБАЎ ПАВЯЛІЧАНА НА 3,1 ПРАЦЭНТА — ДА 16,475 МЛН ДАЛ

Гэта прадугледжана пастановай урада, паведамілі **БЕЛТА** ў Апараце Саўміна. Квота на выпуск він пладовых мацаваных ардынарных складзе 11,552 млн дал, што на 1 працэнт перасягае раней зацверджаны ўзровень. Акрамя таго, павялічана на 12 працэнтаў да 9,287 млн дал квота на вытворчасць він пладовых мацаваных марачных палепшанай якасці, на савецкае шампанскае і іншыя пеністыя віны — на 6,6 працэнта да 1,6 млн дал, на вінаградныя віны — на 28,8 працэнта да 3,35 млн дал. На 3,2 працэнта павялічыцца квота на выпуск каньяку — да 315 тыс. дал. Віскі дазволена вырабіць у 2 разы больш — 50 тыс. дал.

ГУБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ НЕ ПІВА...

Нічога не знайшлося іншага пад рукой, як нажніцы, а выпіць яшчэ вельмі хацелася. Менавіта таму 25-гадовы гамяльчанін на добрым падпітку скарыстаўся гэтым няхітрым прыборам для таго, каб адкрыць бутэльку з півам. Пра гэта ён расказаў дактарам, калі яго даставілі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі з колата-рэзаным раненнем жывата.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

АВІЯБІЛЕТЫ ЦЯПЕР ON-LINE!

Унікальную магчымасць набыцця авіябілетаў праз інтэрнэт прэзентавала днямі нацыянальная авіякампанія «БЕЛАВІЯ». Праект, сумесны з БПС-Банкам і ААТ «Скарбнік», дзейнічае з пачатку лютага і даступны на сайце www.belavia.by.

— Пяць гадоў таму мы адчулі вострую неабходнасць змянення працэсу набыцця білетаў на рэйсы нашай авіякампаніі, — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці авіякампаніі «БЕЛАВІЯ» Ігар ЧАРГІНЕЦ**. — Міжнародная асацыяцыя паветранага транспарту (IATA) паставіла перад авіякампаніямі, яе ўдзельнікамі, задачу перайсці на стандарты электронных білетаў. Гады два таму мы гэту сістэму асвоілі. Доля такіх білетаў сёння складае ўжо 85 працэнтаў (амаль усе рэгулярныя лініі і большасць чартарных рэйсаў). Надышла чарга і непасрэднай аплаты такіх білетаў праз банкаўскую картку.

Набыць білет праз інтэрнэт можна з дапамогай банкаўскіх картак Visa і MasterCard. Дзейнічае і сістэма «Разлік» Нацбанка Беларусі, калі забраніраваны білет можна аплаціць праз інфакіёскі і банкаматы.

— Сэрвіс аплаты для сайта belavia.by адпавядае сусветным стандартам бяспекі, — дадае **дырэктар ААТ «Скарбнік» Сяргей КАЗЛОЎСКІ**. — Інфармацыя падчас здзяснення on-line плацяжу перадаецца ў зашыфраваным выглядзе з выкарыстаннем SSL-пратакола, які забяспечвае надзейную абарону ад перахопу звестак. Кругласутачная служба маніторынгу ўключае больш за два дзясяткі розных аўтаматычных фільтраў. Бяспека — 99,9 працэнта.

У лютым з дапамогай новай сістэмы плацяжоў прададзена ўжо больш за 400 білетаў. Цікава тое, што сярод пакупнікоў беларусы склалі толькі 10 працэнтаў, астатнія 90 працэнтаў — замежнікі. Сайт авіякампаніі даступны на беларускай, рускай і англійскай мовах. Як зазначыў Ігар Чаргінец, у хуткім часе колькасць моў плануецца пашырыць да 20. Для пасажыраў працуе таксама call-цэнтр, здольны абслугоўваць кліентаў на васьмі мовах (+375 17 216-21-01). Купіць альбо забраніраваць білет на сайце авіякампаніі можна кругласутачна.

Ілья ЛАПАТО.

ОАО «МИНСКЛИФТ»,

находящееся по адресу: Республика Беларусь, 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, д. 5,

ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится **25 марта 2010 года** по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 5, 4 этаж, актовый зал. Регистрация участников собрания с 12.30 до 13.45. Начало работы собрания в 14.00.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Минсклифт» за 2009 год и утверждении основных направлений деятельности Общества на 2010 год.
2. Утверждение годового отчета и баланса Общества, счетов прибыли и убытков Общества.
3. Отчет Наблюдательного совета Общества за период работы с 9 июля 2009 года по 31 декабря 2009 года.
4. Отчет Ревизионной комиссии Общества за период работы с 9 июля 2009 года по 31 декабря 2009 года.
5. О выплате дивидендов акционерам ОАО «Минсклифт» за 2009 год. О направлениях использования чистой прибыли в 2010 году.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Утверждение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Об утверждении Регламента работы ОАО «Минсклифт» с реестром владельцев ценных бумаг (акций).
9. О предоставлении безвозмездной спонсорской помощи.
10. Об ассоциации лифторемонтных организаций.

Акционер ОАО «Минсклифт» принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь **паспорт и доверенность.** Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании — **10 марта 2010 года.**

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться:

- в течение 7 дней до проведения собрания — по месту нахождения Общества (каб. 407);
- в день проведения — по месту проведения собрания.

УНП 190292990 **Наблюдательный совет Общества.**

Уважаемые акционеры ОАО «МИНСККОНТРАКТ»

26 марта 2010 года СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ПОВЕСТКА ДНЯ общего собрания акционеров

26 марта 2010 г. *г. Минск*

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности на 2010 год.
2. О работе Наблюдательного совета Общества в 2009 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2009 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2009 год и плана распределения нераспределенной прибыли на 2010 год и I квартал 2011 года.
6. Утверждение регламента работы ОАО «Минскконтракт» с реестром владельцев ценных бумаг.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Определение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О наделении Наблюдательного совета полномочиями принимать решения, отнесенные в соответствии с Уставом к компетенции собрания акционеров.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в общем собрании акционеров ОАО «Минскконтракт» — 19 февраля 2010 года.

Место проведения собрания: г. Минск, ул. Смоленская, 27 (3 этаж, каб. № 308).

С материалами можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 19 марта 2010 года по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Смоленская, 27, отдел экономики и планирования) с 9.00 до 17.00, либо 26 марта 2010 года по месту проведения собрания: г. Минск, ул. Смоленская, 27 (3 этаж, каб. № 308).

Регистрация участников собрания 26 марта 2010 года с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 26 марта 2010 г. в 15.00.

Для регистрации акционеры представляют паспорт, представители акционеров — паспорт и доверенность! УНН 100251588

ОАО «МИНСК-ЛАДА»

(220024, г. Минск, ул. Серова, д. 1)

22 МАРТА 2010 ГОДА В 12.00 ПРОВОДИТ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

Повестка дня:

1. Утверждение годового отчета СОАО «Минск-Лада».
2. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности СОАО «Минск-Лада».
3. Утверждение отчета о прибылях и убытках (счетов прибылей и убытков) СОАО «Минск-Лада», а также распределение прибыли, в том числе выплата (объявление) дивидендов и убытков СОАО «Минск-Лада» по результатам финансового года.
4. Избрание членов совета директоров СОАО «Минск-Лада».
5. Избрание членов Ревизионной комиссии СОАО «Минск-Лада».
6. Утверждение Устава СОАО «Минск-Лада» в новой редакции.
7. Утверждение внутренних документов СОАО «Минск-Лада».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 19.02.2010 г.

Собрание состоится в СОАО «Минск-Лада» по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 1. Регистрация акционеров 22.03.2010 г. с 11.00 до 12.00. При себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность). С информацией, необходимой для проведения собрания, можно ознакомиться: понедельник — пятница с 9.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 1, ком. 301. УНП 100003417.

Уважаемые акционеры ОАО «СЛУЦКИЙ САХАРОРАФИНАДНЫЙ КОМБИНАТ»!

24 марта 2010 года во Дворце культуры сахарорафинадного комбината по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко, 6 в 14.00 состоится очередное общее собрание акционеров и представителей акционеров открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

Повестка дня:

1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2009 год и направлениях развития на 2010 год.
- Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе.
- Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверок финансово-хозяйственной деятельности в 2009 году и заключение по бухгалтерскому балансу и годовому отчету Общества.
- Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2009 году и основных направлениях развития Общества на 2010 год.
- Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2009 г.
- Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2009 год.
- Утверждение исполнения смет использования чистой прибыли, внереализационных и операционных доходов и расходов за 2009 год.
2. Утверждение направлений и нормативов распределения чистой прибыли, смет использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2010 год и I квартал 2011 года.
3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2009 год, порядка и сроков выплаты дивидендов по 2010 году.
4. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. Утверждение «Положения о Наблюдательном совете ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».
8. О даче согласия на участие ОАО в создании предприятия по производству дрожжей.
9. О даче согласия на увеличение уставного фонда СУП «Агросервис-ССК» путем передачи на его баланс свеклоуборочного комбайна «HOLMER» и двух культиваторов RTЦ «Exakta».
10. Об утверждении «Регламента работы ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» с реестром владельцев ценных бумаг».

Список акционеров для регистрации участников собрания составляется **на 01.03.2010 года.**

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания **с 13.00 до 14.00** по месту его проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам — паспорт.

Информацию (материалы) по вопросам повестки дня можно получить:

- в рабочие дни — с 8.00 до 17.00 по месту нахождения Общества, начиная с 17 по 24 марта 2010 года (тел. 4 53 28, 4 50 91);
- в день проведения собрания — по месту его проведения

Наблюдательный совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

УНП 600075003

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ 23 марта 2010 г.

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	1. **Здание магазина** общей площадью 367,4 м² 2. Асфальтобетонное покрытие, площадью 449,9 м², сплошное железобетонное ограждение площадью 162,73 м², ворота металлические площадью 8,4 м²	Год постройки – 1988, материал стен – кирпич, перекрытия – ж/б плиты, общая площадь здания – 367,4 м²	1 000 000 000	50 000 000
Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве ООО «Белагропрод». Адрес объектов продажи: **г. Гомель, ул. Кирова, 141 «А»**				
Срок подачи заявления		**До 17.00 22 марта 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а		
Дата, время, место проведения аукциона		**23 марта 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»		
Номер р/с для перечисления залога		Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509		
Условие продажи		Без условий. Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 10 %, вознаграждение – 2 %		
Условие пользования		Объекты продаются в собственность		

Дополнительная информация по тел. (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

«МЫ БІЛІ ВОРАГА «ЗА ЧАРНЯХОЎСКАГА!»

Навучэнцы гімназіі імя Героя Савецкага Саюза І.Д. Чарняхоўскага сустрэліся ў музеі Вялікай Айчыннай вайны з ветэранамі, якія калісьці ваявалі якраз пад камандаваннем Івана Данілавіча Чарняхоўскага. Сустрэча адбылася, 18 лютага — у гэты дзень, але 65 гадоў таму, самы малады з камандуючых франтамі генерал арміі Іван Чарняхоўскі быў смяротна паранены і памёр.

— Я тады быў старшы лейтэнант, камандзір мінамётнай батарэі, — узгадвае тыя часы **ветэран Барыс Філіпавіч БОКАЎ**. — Мы ўсе любілі Чарняхоўскага. Любілі не як вялікага начальніка, а як чалавека, як мудрага камандуючага, які вядзе нас да Перамогі. Калі мы згубілі нашага Чарняхоўскага, была жалоба. Некалькі дзён усе артылерыя вяла агонь і мы білі ворага «за Чарняхоўскага!»... Тры дні мы не ведалі, хто камандуе фронтам. Ідуць цяжкія баі — а камандуючага няма. І толькі калі мы даведаліся, што наш фронт прыняў Васілеўскі — а яго мы ўжо ведалі, усе супакоіліся і пайшлі ваяваць наперад.

А вось **Валерый Мікалаевіч БЯРДЗЯЕЎ** ваяваў пад камандаваннем Чарняхоўскага яшчэ тады, калі Іван Данілавіч быў камандуючым 60-й арміяй. Праўда, асабіста Валерыю Бярдзяеву з Чарняхоўскім сустрэцца не ўдалося, але затое ён памятае той дзень, калі пачуў навіну пра яго смерць:

— 18 лютага 1945 года я быў у Маскве на вучобе ў Ваенным інстытуце замежных моў. І вось у сярэдзіне дня гучаць па радыё пазыўныя Масквы «Широка страна моя родная». Звычайна яны былі ўвечары, калі абвяшчаліся загады Вярхоўнага галоўнакамандуючага аб правядзенні салюта за вызваленне таго ці іншага горада. А тут раптам пазыўныя ў сярэдзіне дня. Мы насцярожыліся — відаць, нешта надзвычайнае. І сапраўды, прагучала жалобнае паведамленне пра тое, што загінуў камандуючы 3-м Беларускім фронтам генерал арміі Іван Чарняхоўскі...

На сустрэчы са школьнікамі прысутнічалі і госці з Расіі — **Аляксандр ФЁДАРАЎ, дарадца Пасольства Расійскай Федэрацыі**, і **Іван КОРДА, старшыня каардынацыйнага савета кіраўнікоў грамадскіх арганізацый расійскіх суайчыннікаў**. Яны падарылі музею ВАВ тры кнігі архіўных дакументаў, выдадзеныя ў Маскве летась: «Венгерскія падзеі 1956 года вачыма КДБ і МУС СССР», «Прыбалтыка — пад знакам свастыкі (1941—1945)» і «НКУС-МУС СССР у барацьбе з бандытызмам і ўзброеным нацыяналістычным падполлем у Заходняй Украіне, Заходняй Беларусі і Прыбалтыцы (1939—1956)». Такім чынам, як кажуць супрацоўнікі музея ВАВ, сустрэчу можна лічыць пачаткам акцыі **«Праўда вайны ў дакументах»**, прысвечанай 65-годдзю Вялікай Перамогі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

На што скардзіцеся?

НЕ СПІЦЦА...

Недастатковая колькасць і нездавальняючая якасць сну могуць выклікаць вельмі сур'ёзныя праблемы. Варта недаспаць усяго толькі паўтары гадзіны, як узровень вашай уважлівасці на наступны дзень знізіцца прыкладна на трэць. Моцная санлівасць пагаршае памяць і здольнасць думаць і перапрацоўваць інфармацыю, а ў дадатак у значнай ступені павышае рызыку атрымання вытворчай траўмы... Якія ж захады неабходна зрабіць, каб заснуць і спаць, не прачынаючыся, а раніцай устаць свежым і бадзёрым?

● Звядзіце да мінімуму начныя шумы, асвятленне і некамфортную для сну тэмпературу. Вашымі памагатымі могуць стаць берушы, шчыльныя шторы на вокнах, кандыцыянер або вентылятар. Нават нязначны шум або лішняе святло ноччу могуць сапсаваць якасць вашага сну. Падтрымлівайце тэмпературу ў спальні на ўзроўні не вышэй чым 24°С і не ніжэй чым 13°С.

● Прыём ежы, прагляд тэлевізара, эмацыйнае высвятленне адносінаў няхай застануцца за межамі спальні. Выкарыстоўвайце ложак толькі ў якасці месца для сну і адпачынку, інакш ён можа пачаць асацыявацца з іншымі відамі дзейнасці, што стане прычынай праблем з засыпаннем.

● Пазбягайце сну ў дзённы час. Калі ж усё-такі даводзіцца спаць удзень, аддавайце сну не больш як 25 хвілін і не пазней, чым праз восем гадзін пасля абуджэння.

● Калі вам трэба ўстаць ноччу, не асляпляйце сябе яркім святлом. Выкарыстайце невялікі начнік.

● Нікацін з'яўляецца ўзбуджальным рэчывам, і яго варта пазбягаць як непасрэдна перад сном, так і падчас начнога абуджэння. Пакурыўшы перад сном, вы можаце адчуць расслабленасць, але гэта не адмяняе таго факту, што ў кроў трапляе стымулятар, які можа пачаць дзейнічаць, разбудзіўшы вас сярод ночы.

● Кафеін таксама стымулюе работу сэрца, ён прысутнічае ў каве, гарбаце, газаваных напоях, некаторых лекавых сродках, многія з якіх свабода прадаюцца ў аптэках. Варта спыніць ужыванне кафеіну як мінімум за чатыры—шэсць гадзін да сну, інакш вы рызыкуеце атрымаць галаўны боль, які перашкодзіць вам заснуць.

● Хоць алкаголь з'яўляецца сродкам, які тармозіць нервовую дзейнасць і можа дапамагчы вам заснуць, працэсы абмену рэчываў, якія працякаюць у арганізме для вывядзення з яго спірту, здольныя справакаваць пахмелле падчас сну. Менавіта начное пахмелле выклікае дадатковыя абуджэнні і непасрэдна звязанае з павышаным потаадаслаленнем і начнымі кашмарамі.

● Старайцеся выключыць увогуле або хоць бы скараціць ужыванне любых напояў пасля васьмі вечара, каб не ўскокваць ноччу па «патрабаванні» мачавога пузыра.

● Лёгкі перакус перад сном можа дапамагчы вам заснуць, у той час як сытная вячэра позна ўвечары, наадварот, «адтэрмінуе» засыпанне. Пазбягайце бялковых прадуктаў, а для суцішэння голаду выкарыстайце вугляводныя і малочныя прадукты. У малацэ ўтрымліваецца амінакіслата L-трыптафан, якая, як сведчаць звесткі даследаванняў, дапамагае арганізму заснуць. Таму лепшым выбарам для таго, каб не легчы спаць на галодны страўнік, стане шклянка малака з нятлустымі крэкерамі.

● Калі вы адносіцеся да людзей, якія адчуваюць прыліў сілаў пасля фізічнай актыўнасці, не варта ўзмоцнена выконваць практыкаванні перад сном. У гэтым выпадку вам лепш практыкавацца раніцай або ў пасляабедзенны час.

● Ці спіць ваш улюбёнец (котка, сабака) разам з вамі? Знаходжанне жывёлін у ложку можа быць прычынай вашага частага абуджэння (напрыклад, таму, што ваш сон становіцца больш адчувальным з-за прысутнасці пад бокам маленькай істоты, якую можна расціснуць; альбо ваш гадаванец ёрзае і прыладжваецца, каб яму было зручней, пры гэтым трасучы ложак і закранаючы вас). Магчыма, вашаму зверу лепш «пераехаць» на падлогу або ва ўтульны ўласны дамок?

● Добры спосаб падрыхтавацца да засынання — слухаць музыку. Не маршавую, без слоў — ціхую інструментальную. Звычайна ў доме такіх запісаў няма, бо, складаючы фанатэку, чалавек падбірае мелодыі з эмацыйнымі ўсплёскамі. А музыка калыханкі душу закранаць не павінна. Цяпер распрацаваныя спецыяльныя запісы для добрага сну. Сярод іх ёсць «фізіялагічныя» — з шумам набягаючых хваляў ці рытмічным гукам, які нагадвае ўдары сэрца. Натуральна, калі ў канцы праслухоўвання вам давядзецца ўстаць з ложка, каб выключыць магнітафон, увесь эфект закалыхвання прападзе. Таму спатрэбяцца сістэмы з самаадключэннем, у крайнім выпадку — з дыстанцыйным кіраваннем.

● Дапамагае заснуць масаж жывата — гэта супакойвае страваваль ную сістэму і выклікае больш глыбокае расслабленне. Ляжце на спіну, пакладзіце руку на пупок. Лёгенька рабіце рукой маленькія кругі па гадзіннікавай стрэлцы, паступова іх павялічваючы. Як толькі кругі пачнуць выходзіць за межы цела, паступова змяншайце іх памер, пакуль не вернецеся зноў да пупка. Затым змяніце напрамак, вадзіце далонню супраць гадзіннікавай стрэлкі да межаў цела і назад. Паўтарыце тое ж самае другой рукой. Зрабіце такі масаж некалькі разоў.

● Стварыце для сябе нейкі рытуал адыходу да сну, каб пабудаваць своеасаблівы «мост» паміж напружаннем дня і магчымасцю паўнавартаснага адпачынку ночу. Працягласць рытуалу можа вар'іравацца ад дзесяці хвілін да гадзіны. Некаторым, каб выславіцца ад думак, назапашаных за дзень, дапамагае складанне спісу стрэсаў і спосабаў барацьбы з імі. Калі да такога сродку самазаспакаення дадаць перыяд расслаблення (напрыклад, цёплую ванну), вам будзе значна лягчэй заснуць. І не ўздумайце глядзець на гадзіннік! Стрэлка, якая няўмольна рухаецца наперад, будзе толькі раздражняць і дадаваць узбуджэння замест таго, каб яго змяншаць.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Тэлесеткі

Расіяне адзначаць 23 лютага з беларускім «Снайперам»

23 лютага на расійскім Першым канале адбудзецца прэм'ера серыяла «Снайпер. Зброя адплаты». Паводле слоў старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага, зацікавіліся 4-серыйнай стужкай і іншыя тэлеканалы, прычым не толькі расійскія, але і з Украіны, Германіі. «Гэта наша маленькая чалавечая і прафесійная радасць — такі медыягігант, як Першы, напэўна мог шмат з чаго выбіраць для паказу ў гэты сімвалічны дзень, але выбар спыніў менавіта на «Снайперы». Цяпер серыял набыў, я так мяркую, міжнароднае прызнанне», — заўважыў кіраўнік БТРК.

Уласна, чыста беларускім гэты кінапрадукт 2009 года назваць няправільна — беларускі рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў здымаў у галоўных ролях расійскіх зорак Дзмітрыя Пяўцова і Марыю Міронаву, акцёрскі ансамбль падабраўся ўвогуле інтэрнацыянальны — расіяне, беларусы, паляк, літовец, немец, ізраільцянін. А за вытворчасць адказвалі сумесна Белтэлерадыёкампанія, нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і расійская кампанія «Арт Сінема Груп». І ўсё ж больш чым напалову серыял «тутэйшы» — толькі БТРК уклала ў яго 47 % сродкаў ад агульнага бюджэту.

Карыстаюцца поспехам, запэўніваюць беларускія тэлевізійнікі, і іншыя серыялы сумеснай вытворчасці — напрыклад, укладзеныя БТРК у «Маёра Ветрава» (2007 г.) 250 тысяч доларaў ужо вярнуліся нават з прыбыткам, а фільм убачылі тэлегледачы ў Расіі, ва Украіне, Казахстане і нават Японі. Вядуцца перамовы наконт продажу зноў жа Першаму каналу ваеннага дэтэктыва «Замах» (2010 г.)

— Можа, і да сёлетняга вашага праекта «Нацыянальны здабытак» ужо праяўляюць цікавасць расійскія каналы? — цікавімся ў Аляксандра Зімоўскага.

— Не, мы не прадаём катоў у меху і не гандлюем паветрам — спачатку робім прадукт, і толькі потым прапаноўваем яго на тэлерынак. А там прапанова вельмі вялікая, так што пакупнікоў трэба яшчэ зацікавіць.

— Заўжды здзіўляла, што ў беларускіх выццам бы праектах у галоўных ролях здымаюцца расійскія акцёры — гэта толькі дзеля таго, каб потым паспяхова прадаць карціну? А як жа натуральнае жаданне «прасоўваць сваіх»?

— Калі мы робім серыял для ўнутранага спажывання — такія выпадкі таксама былі, — то цалкам дастаткова заняць у серыяле толькі беларускіх акцёраў, каб захапіць і забаўляць такую адносна невялікую аўдыторыю, як наша. Але гэта не дасць ніякіх камерцыйных выгод, серыял у лепшым выпадку выйдзе «ў нуль». Таму трэба адразу думаць аб тым, хто зможа набыць серыял за межамі краіны, гэта сусветны кінавопыт.

Камедыі будуць. Калі будуць свае Гайдаі

Калі пакінуць убаку сітуацыю з акцёрамі, пачынае мучыць іншае пытанне — чаму беларускія серыялы замкнёныя спрэс на дэтэктыўнай і ваеннай тэматыцы? Што, не можам здымаць уласную фантастыку, гумарыстычныя серыялы, моладзевыя і г.д.? На думку Аляксандра Зімоўскага, тут... проста няма з чаго выбіраць. «Давайце паглядзім у мінулае: у Гайдая былі вельмі добрыя камедыёграфы, таленавітыя аўтары таго, што мы цяпер назвалі б камедыйнымі сцэнарыямі. Іхні гумар быў усім савецкім людзям зразумелы і блізкі, заснаваны на рэальных падзеях... Цяпер на кніжным рынку я не бачыў смешных беларускіх кніг, а ў наш крэатыўны аддзел ніхто не прысылаў і не прыносіў камедыйных, дый ніякіх іншых, сцэнарыяў серыялаў. Калі з'явяцца цікавыя, рэальныя — чаму б не паспрабаваць?»

Брацца ж за экранізацыю твораў беларускіх класікаў БТРК не плануе, пакінуўшы гэта права за кінастудыяй. Затое ўжо да канца года абяцае скончыць вытворчасць пяці 2-серыйных фільмаў паводле дэтэктываў Вольгі Тарасевіч, аб'яднаных у праект «Нацыянальны здабытак» — а налета, відаць, паказаць гледачам вынік.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЗНІШЧАНЫ НЕБЯСПЕЧНЫ МУЗЕЙНЫ ЭКСПАНАТ

Ніхто дакладна не ведае, колькі гадоў у клубе-музеі баявой і працоўнай славы гарадскога пасёлка Пакалюбічы Гомельскага раёна ў якасці экспаната праляжала 50-міліметровая мінамётная міна з запальнікам.

Выбухованебяспечны экспанат быў знойдзены супрацоўнікамі ўпраўлення КДБ Беларусі па Гомельскай вобласці ў ходзе мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне фактаў захоўвання ў музеях баявой славы рэгіёна зброі, якая знаходзіцца ў баявым стане. Выбухованебяспечныя прадметы знішчаны сапёрна-піратэхнічнай групай спецыяльнай брыгады ўнутраных войскаў МУС Беларусі.

У прэс-групе ўпраўлення КДБ мяркуюць, што гэта можа быць не апошні небяспечны прадмет у музейных экспазіцыях.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

АБЯСШКОДЖАНАЯ... ЛІСА

Дзікі звер завалокся ў вёску Балотчыцы Слуцкага раёна і пачаў кідацца на людзей.

Здарылася гэта ў сераду: пра лісу, у якой назіраліся прыкметы шаленства, у мясцовы РАУС паведаміў старшыня Беліцкага сельскага Савета. Каб спыніць рыжую разбойніцу, участковы інспектар выкарыстаў табельную зброю.

Ігар ГРЫШЫН.

Хочаш добры ўраджай — нашай плёнцы давярай

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З жыхаркай вёскі Кузьмінішкі Вілейскага раёна Зінаідай Аляксандраўнай Каркоткай увесну мінулага года здарылася вось такая неспадзяванка. Як звычайна, рыхтуючыся да сезона, яна на рынку ў Ждановічах набыла плёнку для парніка. Ды, як неўзабаве высветлілася, хутчэй, набыла праблемы, а не плёнку.

— Брала плёнку шырынёй шэсць метраў, таўшчынёй 200 мікрон, жоўтую. Прадаўцы запэўнівалі, што яна — шматгадовая. Ды дзе там шматгадовая: ужо ў жніўні пачала ламацца, а ў верасні так «пасыпалася», што давялося нават здымаць слой глебы, бо інакш немагчыма было пазбавіцца ад вялікай колькасці дробных кавалачкаў той плёнкі. А каштавала гэта «задавальненне» для мяне 100 тысяч рублёў, — тлумачыла сутнасць звароту Зінаіда Аляксандраўна. — Але ж хутка новы сезон, хочаш не хочаш, а трэба зноў дбаць пра плёнку для парніка. А як цяпер яе выбіраць, памятаючы пра мінулае здарэнне? Можа, вы б патэлефанавалі на вытворчасць якому тэхнолагу, спыталі: што ды як лепш выбіраць?

На жаль, заяўніца не змагла прыгадаць не толькі вытворцу той плёнкі, нават краіну яе паходжання. Таму ад прапановы звязацца з тэхнолагам якога прадпрыемства мы адмовіліся, а вырашылі пагутарыць з практыкамі-прафесіяналамі, якія выкарыстоўваюць плёнку падчас сваёй працы па вырошчванні агародных культур у абароненай глебе. З гэтай мэтай патэлефанавалі ў РУП «Інстытут агародніна водства» Нацыянальнай акадэміі навук. Наш суразмоўца — **загадчык аддзела абароненай глебы і агрохіміі, кандыдат сельскагаспадарчых навук, практык з 40-гадовым стажам Мечыслаў СЦЯПУРА**.

— Мы і самі сутыкаліся з падобнай плёнкай, і нараканні ад фермераў чулі. Па неафіцыйнай інфармацыі гаворка ідзе пра плёнку — адыходы вытворчасці, якую ў Германіі выкарыстоўваюць для ўкрыцця сіласу. Іншымі словамі, яна прызначана зусім для іншых мэтаў, толькі не для вырошчвання агародных культур. Плёнка пры апошнім выкарыстанні рвецца, трэскаецца ад маразоў. Дзялкі вязуць яе з-за межаў ледзьве не са звалак, а тут выдаюць за якасны тавар, — патлумачыў Мечыслаў Францавіч.

Паводле яго далейшых слоў, лепш за ўсё набываць плёнку для парнікоў у крамах (можна быць упэўненым, што тавар прайшоў сертыфікацыю) і — айчыннай вытворчасці. Напрыклад, ад наваполацкага «Нафтана» ці барысаўскага «Палімера».

— Аптымальная таўшчыня — 120—150 мікрон. Такая плёнка пратрымаецца 3—4 сезоны. Праўда, трэба ведаць, што калі плёнка выкарыстоўваецца з ранняй вясны да позняй восені, гэта лічыцца як два сезоны. Такім чынам, 3—4 сезоны — гэта прыкладна два гады, хоць часам не зусім добрасумленныя прадаўцы могуць увесці пакупніка ў зман. Беларуская плёнка выдатна сябе зарэкамендавала, таму не трэба імкнуцца знайсці нешта замежнае, — распавёў Мечыслаў Сцяпура. — Зразумела, агучаны агульныя рэкамендацыі, бо ёсць і іншыя віды плёнак — і па таўшчыні, і па колеры і, адпаведна, па выкарыстанні, напрыклад, для каркасных і бескаркасных парнікоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сёння, паважаныя нашы чытачы, я звяртаюся да жаночай паловы нашай аўдыторыі. Як несправядліва, што мужчынскае свята ў нас не з'яўляецца выхадным днём. І каб неяк згладзіць гэтае прыкрае непаразуменне, прапаноўваю папесціць нашых каханых незабыўнай вячэрай. Згодна з маімі назіраннямі, амаль усе мужчыны — жудасныя ласуны і вельмі любяць усё печанае. Таму сёння мы будзем гатаваць стравы са слоенага цеста. З яго атрымліваюцца вельмі далікатныя выпечаныя вырабы. Гатаванне сапраўднага слоенага цеста адбірае шмат часу, аднак уражвае разнастайнасць магчымасцяў яго прымянення. Прывабнасць заключаецца ў тым, што само цеста прадаецца цяпер ва ўсіх крамах, таму самую складаную працу за нас ужо зрабілі. Усе стравы, што прапаноўваюцца, гатуюцца не складана, а выглядаюць святочна і, што самае галоўнае, — вельмі смачныя. Мне ж засталося павіншаваць усіх нашых цудоўных мужчын з надыходным святам, якое ў кожнай сям'і павінна прайсці па дэвізам «Беражыце мужчын!», ім жа так цяжка заставацца ў наш шалёны час моцным полам!!!

ЯЙКІ Ў СЛОЕНЫМ ЦЕСЦЕ

Вазьміце: 0,5 кг слоенага цеста, 100 г сметанковага масла, 10 яек, 2 бялыя булкі, шклянку малака, соль, перац, гарчыцу і пятрушку.

Варым яйкі ўкрутую, апускаем у халодную ваду, чысцім ад шкарлупінаў і разразаем упоперак на дзве часткі. Дастаём жаўткі і праціраем іх праз сіта разам з булачкамі, якія перад гэтым замачылі ў малацэ. Атрыманую масу змешваем з маслам, соллю, перцам, пятрушкай і невялікай колькасцю гарчыцы. Напаўняем ёю палавінкі яек, складваем іх разам, каб надаць ім від цэлага яйка. Слоенае цеста раскатваем на 10 аднолькавых квадратаў і намазваем яечным жаўтком. У кожны квадрат кладзём яйка. Вуглы квадрата зашчыпваем так, каб яйка было цалкам пакрытае цестам. Абмазваем зверху жаўтком і пячом у гарачай духоўцы. Падаваць яйкі ахаладжанымі з маянэзам.

СВІНІНА Ў СЛОЕНЫМ ЦЕСЦЕ

Нам спатрэбіцца: 300 г мякаці свініны (бярыце карэйку або кумпяк), 300 г слоенага цеста, 1 ст. лыжка гарчыцы, 1 яйка, чорны молаты перац, соль на смак.

Цеста раскатаць у прамавугольны пласт таўшчынёй 3 мм. Мяса нарэзаць тонкімі скрылькамі, змазаць гарчыцай, пасаліць, паперчыць і выкласці на цеста. Звярнуць цеста рулетам, змазаць паверхню яйкам. Рулет нарэзаць парцыйнымі кавалкамі, пакласці зрэзам на змазаную маслам бляху і выпякаць 20—25 хвілін пры 220 °С.

СЛОЕНЫЯ ПІРАЖКІ З КУРЫЦАЙ І БУЛЬБАЙ

Вазьміце: 500 г слоенага цеста, 200 г курынага філе, 300 г бульбы, 150 г цыбулі, перац.

Цыбулю дробна пакрышыць. Філе нарэзаць невялікімі кавалачкамі, сырую бульбу абабраць і дробна нарэзаць. Змяшаць бульбу, цыбулю, філе, пасаліць, паперчыць і добра перамяшаць. Цеста раскатаць і нарэзаць з яго прамавугольнічкі. Выкласці на іх начынку і зляпіць піражкі.

Бляху крыху змазаць маслам або засласць паперай для выпечкі, пакласці піражкі (можна змазаць піражкі жаўтком), паставіць у разагрэтую да 180 °С духоўку. Выпякаць на працягу 20—30 хвілін.

ПІРОЖНАЕ «ЛАСУНАК»

Нам спатрэбіцца: 300 г слоенага бездражджавога цеста, любая садавіна (і любыя ягады), 6 чайных лыжак цукру, марозіва.

Слоенае цеста раскатваем у прамавугольнік памерам каля 30х40 см і дзелім яго на 12 квадратаў.

Выкладваем цеста ў формачкі дыяметрам 7—8 см (формы я не змазвала, толькі крыху змачыла вадой), запаўняем ягадамі-садавіной (у мяне былі яблыкі, замарожаная вішня, мандарынавыя долькі і ананас), зверху ў кожную формачку насыпаем 1/2 чайнай лыжкі цукру. Духоўку разаграваем да 190 °С і выпякаем пірожныя 20—25 хвілін. Пасля адразу дастаём з формачак, у яшчэ гарачыя тарталеткі кладзём шарык ванільнага марозіва. Зверху можна ўпрыгожыць натарканым шакаладам. Адразу падаём на стол. У гарачых тарталетках марозіва падтае, прамочвае і ахаладжвае садавіну... Паверце, паважаныя гаспадынькі, — гэта проста асалода!..

ТВАРОЖНЫ РУЛЕТ

Вазьміце: слоенае цеста, 200 г цукровай пудры, 500 г працёртага тварагу, 100 г разынак, 3 яйкі, 50 г цёртых сухароў, 50 г цукру (для ўзбівання бялковай пены).

Працёрты тварог размешваем з цукрам, разынкамі і яечнымі жаўткамі. З яечных бялкоў узбіваем густую бялковую пену, дадаём 50 г цукру і зноў узбіваем да загусцення. Масу, дадаўшы ў яе сухары, прымешваем да тварагу. Слоенае цеста раскатваем у тонкі пласт, які намазваем тварожнай начынкай, зварочваем пласт з начынкай у рулет і перакладаем яго на бляху, зверху змазваем яечным жаўтком і выпякаем у гарачай духоўцы.

СЫРНЫЯ СПІРАЛЬКІ

Вазьміце: каля 400 г слоенага цеста, 150—200 г цвёрдага сыру, 1 яйка для змазкі, кмен або мак.

Цеста раскатаць у пласт памерам 50х50 см, змазаць жаўтком. Палову цеста пакрыць слоем натаркаванага сыру, пасля накрыць другой паловай цеста. Раскатаць скалкай. Духоўку разагрэць да 220 °С. Цеста нарэзаць на палоскі шырынёй каля 2 см, скруціць з палосак спіралькі, выкласці іх на бляху і змазаць жаўтком. Выпякаць каля 10 хвілін да залацістага колеру.

Спіралькі пасыпаць макам або кменам.

ЯБЛЫКІ Ў СЛОЕНЫМ ЦЕСЦЕ

Вазьміце: 5 салодкіх яблыкаў, 1 пачак слоенага цеста, 100 г цукру, 1 чайную лыжку молатай карыцы.

Гатовае слоенае цеста размарозіць і крыху раскачаць. Цеста нарэзаць палоскамі шырынёй прыкладна 2 см. Цалкам абгарнуць яблыкі гэтымі палоскамі. Цукар змяшаць з карыцай і пасыпаць гэтай сумессю яблыкі. На бляху паслаць ліст пергаменту для выпякання і паставіць на яго яблыкі. Выпякаць у разагрэтай духоўцы 25—35 хвілін.

АНЕКДОТ ДА СВЯТА

— Ну, з Днём абаронцы Айчыны, сынок!

— Мам, тат, ну што вы, магчыма, я яшчэ паступлю!

* * *

Толькі напярэдадні 23 лютага можна ўбачыць у аўтобусе дзяўчыну, якая ўсміхаецца, з толькі што набытым дрылем.

* * *

Я дакладна ведаю, што такое адзінота: гэта калі 24 лютага бачыць мужчыну, які купляе сабе пенку для галення!

НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ ОАО «БЭМЗ»

извещает своих акционеров о проведении 23 марта 2010 года в 14 часов в клубе завода по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202 очередного общего собрания акционеров.

Повестка дня:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2009 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2010 год.
7. Об утверждении изменений и дополнений в Устав Общества.
8. Об отчуждении имущества.
9. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
10. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 13 часов. Акционерам иметь при себе удостоверение личности, представителям – доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию реестра акционеров на 01 марта 2010 года.

Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница) начиная с 10 марта 2010 года в отделе кадров ОАО «БЭМЗ», 23 марта – по месту проведения собрания.

Справки по телефону: 42 16 83.

УНП 200032892. **Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ».**

КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»

09.03.2010 ГОДА ПРОВОДИТ АУКЦИОН

по продаже строений вещевого рынка «Варшавский» на земельном участке пл. 2,882 га, с начальной ценой 1 861 000 000 руб.

Объекты расположены в быстроразвивающемся жилом микрорайоне. Имеются все необходимые инженерные сети и транспортная инфраструктура.

Земельный участок идеален для строительства торгово-административно-развлекательного комплекса с перспективой расширения территории застройки более 6,0 га.

Контактные тел.:(0162) 23 81 92; (0162) 23 43 48.
Сайт: bgcn.by. city.brest.by

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛСОЛОД»

26 марта 2010 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32 состоится очередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания в 14.00. Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 13.00 до 13.50.

Повестка дня:

1. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 г.
2. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 г.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса Общества за 2009 г.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2009 г.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2010 год и I квартал 2011 г.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размеров вознаграждений членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Об утверждении показателя по экономии ресурсов на 2010 год.

УНН 200075434

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЗНАМЯ ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ»

В повестку дня очередного общего собрания акционеров ОАО «Знамя индустриализации», объявленного в газете «Звязда» № 31 от 19.02.2010 г., **вносится изменение:**

«Очередное общее собрание акционеров ОАО «Знамя индустриализации» состоится 29 марта 2010 года.
Начало работы собрания 29 марта 2010 г. в 14 часов».

УНП 300200360 Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации»

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

СООБЩАЕТ, что 26 марта 2010 года в 11.00 В АКТОВОМ ЗАЛЕ АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА по адресу: 220123 г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проделанной работы за 2009 год и ознакомление Общества с заключением аудиторской проверки за 2009 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
4. О выплате дивидендов за 2009 год и утверждение использования чистой прибыли в 2010 году.
5. Об утверждении отдельных решений, принятых Советом директоров.
6. Избрание членов выборных органов Общества.
7. О вознаграждении членов Совета директоров и Ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 (отдел ценных бумаг) с **17 марта 2010 г.**

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт; представителю акционера — паспорт и доверенность.

Сведения по телефонам: 334 30 31, 334 33 83.

УНП 100364117 **Дирекция ОАО «Белтрубопроводстрой»**

К сведению акционеров ОАО «ВИТЕБСКИЕ КОВРЫ»

Очередное общее собрание акционеров состоится 26 марта 2010 г. в 14.00 по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 75.

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 12.30 до 13.50 (иметь документ, удостоверяющий личность). Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 5 марта 2010 года.

Повестка дня:

1. Отчет об итогах работы Общества за 2009 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о работе в 2009 году.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2009 год.
5. О распределении чистой прибыли, полученной в 2009 году, и направлениях ее использования в 2010 году.
6. О выплате дивидендов за 2009 год.
7. Выборы членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Утверждение условий вознаграждения для членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 19 по 26 марта 2010 г. (с 10.00 до 16.00) в кабинете специалиста по ценным бумагам.

Наблюдательный совет ОАО «Витебские ковры».
Тел. 0212 340947 УНП 300082076

Уважаемые акционеры ОАО «МИНСКСОРТСЕМОВОЩ»!

30 марта 2010 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «МинскСортСемОвощ»

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основных направлениях его развития в 2010 году.
2. Отчет Наблюдательного совета о работе в 2009 году.
3. О заключении Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса Общества, распределения чистой прибыли за 2009 год и направлений использования чистой прибыли в 2010 году. Выплата дивидендов за 2009 год.
5. Избрание членов Наблюдательного совета Общества.
6. Избрание членов Ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Утверждение регламента работы акционерного общества с реестром акционеров ОАО «МинскСортСемОвощ».
9. Об оказании спонсорской помощи семенами и др. ресурсами общественным организациям инвалидов, детским приютам в 2009 году и утверждение ее суммы на 2010 год.

Место проведения собрания: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 (актовый зал).

Начало собрания: 8 часов 30 минут.

Время регистрации участников — в день проведения собрания с 8 часов до 8 часов 25 минут по месту проведения собрания.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности.

Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ».

УНП 600052864

Очередное общее собрание акционеров ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»

состоится 22 марта 2010 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).

Повестка дня:

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основных направлениях деятельности в 2010 году.
2. Отчет Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2009 год.
3. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской отчетности за 2009 год.
5. Об утверждении порядка расп

І ТРАДЫЦЫІ, І НАВАТАРСТВА. І РАЗНАСТАЙНАСЦЬ

Найперш гэтымі аспектамі можна ахарактарызаваць работу працаўнікоў прадпрыемства «Мінскхлебпрам»

У гэтыя дні, напярэдадні «мужчынскага» і «жаночага» святаў, у працаўнікоў Мінскага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскхлебпрам», у склад якога ўваходзяць сем сталічных хлебазаводаў, — найбольш гарачы час. Яны сталі, па сутнасці, на бесперапынную вахту, перайшоўшы на яе са звычайнага, больш паслабленага рэжыму. Зразумела, гэта звязана не з тым, што мінчане раптам стануць спажываць у гэтыя дні значна больш хлеба.

Зусім не, а вось што датычыцца кандытарскіх вырабаў — іх, у прыватнасці ў святочныя і перадсвяточныя дні, разыходзіцца ў некалькі разоў болей, чым звычайна. Словам, імкнуцца нашы суайчыннікі папоўніць свой унутраны запас гармонаў радасці, звязаны з тымі ж святамі, яшчэ і знешнім запасам (як запэўнівалі на адным з хлебазаводаў, у іх кандытарскіх вырабаў гэтых гармонаў — цэлы стос).

Начальнік лабараторыі хлебазавода № 5 Галіна ТАРАХОВІЧ.

Прадпрыемства «Мінскхлебпрам» віншуе ўсіх мінчан з надыходнымі святамі — мужчын з Днём абаронцаў Айчыны і жанчын са святам 8 Сакавіка. Спадзяёмся, што наша прадукцыя ўпрыгожыць вашы святочныя сталы і стане добрым стымулам для стварэння ва ўсіх вас выдатнага святочнага настрою.

Няспынна працуе ў гэтыя дні на хлебазаводзе № 5, на кандытарскіх вытворчасцях іншых хлебазаводаў «Мінскхлебпрама» «салодкі» канвеер.

Кандытар хлебазавода № 5 Ірына ШМУЛЯЎЦОВА аздабляе заказны торт.

ШТОДНЯ з канвеераў хлебазаводаў «Мінскхлебпрама» сыходзіць каля 400 тон хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў, каля 65 працэнтаў гэтых вырабаў (дакладней — хлебабулачных) рэалізуецца непасрэдна ў Мінску. У адпаведным спісе — сотні найменняў разнастайнай прадукцыі, каля тысячы рэцэптур. У Мінску выпускаецца каля 24 працэнтаў хлебабулачнай прадукцыі ад рэспубліканскага аб'ёму (усіх хлебазаводаў у краіне — 53, у Мінску, нагадаем, 7). Пастаянна працуючы над асартыментам, над пашырэннем выпуску прадукцыі з пэўнымі, строга скіраванымі спажывецкімі якасцямі, працаўнікі «Мінскхлебпрама» разам з тым свята захоўваюць традыцыі айчыннага хлебапячэння. «Хлеб — гэта не проста пэўны прадукт спажывання, — казаў дырэктар хлебазавода № 2 Святаслаў Адзіняеў, — у традыцыях яго прыгатавання (а мы іх захоўваем няўхільна) закладзены культура, душа народа».

Менавіта з гэтага хлебазавода, якому, дарэчы, сёлета спаўняецца 100 гадоў, мы і пачнём наш больш канкрэтны расказ пра справы працаўнікоў «Мінскхлебпрама». І адразу ж папярэдзім калегаў (на выпадак наведвання імі завода), як нас сарамаціла начальнік заводскай лабараторыі Святлана Загнетава: «Дык вы не ведаеце, што такое заварны хлеб? Пра што ж тады з вамі можна размаўляць», — здзіўлена казала яна.

Агульную мову са Святланай Іванаўнай мы ўсё ж знайшлі, праўда, пры гэтым вельмі ўважліва паслухалі яе лекцыю пра асаблівасці прыгатавання заварнога хлеба і, увогуле, пра заварку для хлеба, хоць, можа, і не ўсё з гэтай лекцыі зразумелі. Хіба вось што зразумелі больш-менш дакладна: прыгатаванне заварнога хлеба — гэта вельмі складаны і працаёмкі працэс, не паўсюль ім валодаюць і цяпер. Не валодалі раней і ў Мінску. І першымі навучыліся рабіць такі хлеб менавіта на хлебазаводзе № 2. І, па сутнасці, прымусіў працаўнікоў завода асвоіць гэты працэс сам лёс. Хлебазавод № 2 знаходзіцца ў цэнтры Мінска, на вуліцы Крапоткіна, і ў свой час паўстала пытанне пра яго знос — завод выпускаў такую ж прадукцыю, як і іншыя заводы, і асабліваў зацікаўленасці ў яго існаванні не было. «Трэба тэрмінова знайсці сваю нішу, зрабіць так, каб мы сталі добра заўважнымі», — вырашылі на заводзе. І адкамандзіравалі на гэту справу сваіх спецыялістаў. Адкамандзіравалі ў прамым сэнсе гэтага слова — па вопыт у Рыгу, Вільнюс (дарэчы, сталася гэта ў 1986 годзе), дзе тая ж прагрэсіўная «заварная тэхналогія» ўпершыню на былой савецкай прасторы і знайшла сваё прымяненне. А ў выніку ўжо ў хуткім часе з'явіўся і ў Мінску першы гатунак хлеба менавіта на заварной аснове — гэта быў такі знакаміты цяпер хлеб «Нарачанскі». Паступова на гэту аснову былі пераведзены і іншыя гатункі хлеба, заварны хлеб сталі выпускаць і на іншых хлебазаводах.

— Хлеб «Нарачанскі», па сутнасці, стаў візітоўкай нашай краіны; яго выпуск мы захавалі нават тады, калі яго зусім нявыгадна было выпускаць — цэны на хлебабулачную прадукцыю жорстка рэгуляваліся, а ў выніку мы мелі на «Нарачанскім» рэнтабельнасць мінус 20 працэнтаў, — заўважаюць тут.

Свой хлеб завод нават экспартуе — у Маскву, Санкт-Пецярбург, рыхтуецца экспартаваць у далёкае замежжа. Як з асаблівым гонарам падкрэсліваюць тут, менавіта на базе іх хлебазавода захоўваюцца традыцыі айчыннага хлебапячэння, прычым гэтыя традыцыі ўзяла пад сваю ахову дзяржава.

Начальнік лабараторыі хлебазавода № 2 Святлана ЗАГНЕТАВА паказвае «салодкую» кампазіцыю, выкананую заводскімі майстрыхамі-кандытарамі з карамелі.

Аднак нягледзячы на намаганні хлебапёкаў, у тым ліку працаўнікоў хлебазавода № 2, і іх самыя найцудоўнейшыя рэцэптуры, спажыванне хлеба апошнім часам няўхільна зніжаецца, а прагнозныя планы выконваць трэба... Як выходзяць на хлебазаводзе № 2 з такога становішча? Тут актыўна асвойваюць іншыя віды прадукцыі. Напрыклад, пачалі выпускаць замарожаную піцу, рыхтуюць да выпуску замарожаныя блінчыкі, больш пашырана развіваюць кандытарскую вытворчасць. Чым збіраюцца парадаваць на хлебазаводзе № 2 у перадсвяточныя і святочныя дні са сваёй больш салодкай прадукцыі?

На завод мы патрапілі якраз падчас дэгустацыі тут новага торта «Начное рандэву». «Выдатны торт, — кажу дырэктар, пасмакаваўшы невялікі кавалачак, — малайцы дзяўчаты — пастараліся». На хлебазаводзе апошнім часам асвоілі пясочны торт «Забытае задавальненне» з тэрмінам захоўвання да месяца, цікавыя наборы пірожных; добра разыходзяцца сярод пакупнікоў тарты «старажытныя» «Беларуская модніца», «Аксамітны», якія замацаваліся на спажывецкім рынку яшчэ каля 5 гадоў таму. Як адзначаюць на хлебазаводзе № 2, асартымент іх зусім вузкі — 25—30 найменняў. «Усяго». Кандытарскія далікатэсы хлебазавода ідуць пад таварнай маркай «Старажоўскі ласунак».

Хоць, можа, і не зусім па тэме будзе ніжэйсказанае, тым не меней таксама яўна заслугоўвае ўвагі. Паводле слоў дырэктара хлебазавода № 2, працуюць на ім людзі — пакуль могуць працаваць, нягледзячы на ўзрост. Вядома, калі яны самі таго хочуць. «Такое стаўленне да гэтага пытання вельмі добра ўплывае на агульную маральную атмасферу ў калектыве. Такія адносіны да ветэранаў вытворчасці — гэта «жывы прыклад» для іншых», — падкрэслівае кіраўнік.

* * *

Калі на хлебазаводзе № 2 выпускаюць «усяго» 25—30 найменняў тартоў, прычым зусім не разавым «тыражом», то на хлебазаводзе № 5, які размешчаны па вуліцы Каліноўскага, тарты і іншыя віды кандытарскай прадукцыі складаюць ці не аснову ўсёй яго вытворчасці — тут выпускаюць яе да 50 відаў штодзённа, а за месяц — 120—130 відаў. У гандаль гэтай прадукцыі кожныя суткі паступае па 3,5—4 тоны, а на святы і ў перадсвяточныя дні — да 10 тон. Як адзначала начальнік вытворча-тэхнічнай лабараторыі хлебазавода № 5 Галіна Тараховіч, пры фарміраванні начыння для гэтай прадукцыі, у прыватнасці для тартоў, укіл робіцца на натуральную мясцовую сыравіну: гэтае начынне з вішні, чорнай парэчкі, чарніцы і г.д.; паўфабрыкаты — на мядовай, сметанковай асновах, аснове з раслінных вяршкоў. Няйначай, асабліва дагаджаюць на хлебазаводзе № 5 аматарам пірожных — іх тут, так бы мовіць, сапраўды на розны густ і колер. Спецыяльныя наборы пірожных распрацавалі на хлебазаводзе да 23 лютага, для мужчын. Праўда, вось закавыка: мужчыны неяк ухіляюцца ад прадукцыі падобнага кшталту... «Ну і дарэмна, — перакананая Галіна Ігнатаўна. — Практычна ўсе нашы кандытарскія вырабы ўтрымліваюць у сабе шакалад, а значыць і гармоны радасці. І ці не варта папоўніць гэтымі гармонамі свой арганізм якраз на святы?..» Што ж, відаць, можна ўзяць гэта на заўвагу, хоць, увогуле, і вельмі цяжка ўявіць нашага сучаснага мужчыну з гэтым самым гармонам радасці ў руках. Праўда, статыстыка спажывання кандытарскіх вырабаў на святы (яшчэ раз звернем увагу на вышэйпрыведзеную статыстыку) сведчыць якраз на іх карысць.

«Вытворчасць кандытарскіх вырабаў, — падкрэслівалі на хлебазаводзе № 5, — гэта асабліва чыстая вытворчасць. Кандытарскія вырабы — асабліва далікатныя, а мы ж кормім людзей...». Адпаведна, найвышэйшая ўвага — культуры вытворчасці, правілам і патрабаванням санітарыі. Усе працаўніцы, занятыя тут, штогод праходзяць абавязковы так званы санмінімум, штодня — беглы санагляд. Кандытарская вытворчасць, а таксама вытворчасць па вырабе сушак, якая таксама існуе тут, як найбольш адказныя вытворчасці, — атэставаныя на іх адпаведнасць патрабаванням ІСО 9001 і ХАСП (сістэма ХАСП адказвае за бяспеку харчовых прадуктаў для чалавека).

— У нас праводзяцца майстар-класы, школы перадавога вопыту, — адзначала начальнік заводскай лабараторыі Галіна Тараховіч. — Усё, што ёсць лепшага ў свеце ў вытворчасці кандытарскіх вырабаў, — ёсць і ў нас... На заводзе хутка пачнуць выпускацца замарожаныя тарты, якія можна будзе захоўваць да трох месяцаў, а з цягам часу выйдзем і на больш працяглыя тэрміны захоўвання. Гэта дапаможа здымаць пэўнае напружанне ў вытворчасці

«Хлеб — гэта не проста пэўны прадукт спажывання. У традыцыях яго прыгатавання (а мы іх захоўваем няўхільна) закладзены культура, душа народа».

кандытарскіх вырабаў і ў гандлі імі, якое часам назіраецца цяпер. Вядома, пераважна на святы.

Варта дадаць: выпускаюць на заводзе і спецыяльныя тарты на заказ — на карпаратыўныя вечарыны і г.д. Дарэчы, спецыяльны заказ могуць выканаць і на іншых хлебазаводах.

* * *

У цэлым найгалоўнейшая задача прадпрыемства «Мінскхлебпрам» з падпарадкаванымі яму хлебазаводамі застаецца нязменнай: надзейна забяспечваць вялікі горад хлебабулачнымі і кандытарскімі вырабамі, ды яшчэ жыхарам іншых рэгіёнаў з вотруб'ем, 15 відаў — зерневага (безумоўным лідарам у гэтым кірунку з'яўляецца хлеб «Старажытны», які хоць і не такі смачны, як іншыя віды, затое вельмі карысны). Ужо ў хуткім часе на заводах «Мінскхлебпрама» павінны прыступіць да выпуску хлеба з дабаўленнем розных зборак зерневых злакаў, якія пачаў рыхтаваць Мінскі камбінат хлебапрадуктаў (у гэтыя зборкі будзе ўваходзіць да 5—6 і болей злакавых). Адпаведную серыю такога хлеба павінен распачаць хлеб «Жытнёвая ніва».

Паводле цвёрдага перакананя галоўнага тэхнолага, асаблівую павагу павінен выказваць айчыны спажывец жытнёвым гатункам хлеба. На сёння жытнёвая мука пераважае ва ўсіх мінскіх гатунках, а выключна з яе пякуць «Траецкі», «Вязынскі бездражджавы» і «Жытнёвы дыябетычны». Цікавыя, прычым цалкам навукова абгрунтаваныя высновы зрабілі ў дачыненні да жытняга хлеба ў Фінляндыі. Тут даказалі, што ўсе неабходныя для здароўя чалавека вітаміны і мікраэлементы знаходзяцца менавіта ў жыце. Адпаведна, тут разгарнулі прапаганду на карысць жытнёвага хлеба. І калі некалі сярэднедушавое спажыванне такога хлеба, у пераводзе на збожжа, складала 22 кілаграмы за год, то цяпер павялічылася ў 2 разы (для параўнання: у іншых краінах Еўропы гэты паказчык складае крыху больш за 6 кілаграмаў). Аднак што гэта дало фінам? У краіне істотна знізіліся захворванні на рак і іншыя сур'ёзныя хваробы. Варта дадаць, што некалі і ў нашай краіне менавіта жытнёвы хлеб складаў аснову харчавання ў зерневай групе. А цяпер, як зазначала з непакоем галоўны тэхнолаг, многія «топчуць» далёка не ідэальныя для таго ж здароўя тоставы хлеб ды гамбургеры.

Якія яшчэ найбольш адметныя кірункі з'явіліся ў дзейнасці «Мінскхлебпрама» апошнім часам? Галоўны тэхнолаг Ніна Лушчык назвала так званы еўрапейскі кірунак, або наладжванне выпуску серыі хлебнай прадукцыі, якая менавіта і носіць назву «еўрапейскі хлеб». Гэта хлеб «Варшаўскі», «Польскі», «Раманаўскі», «Раманаўскі з вотруб'ем», у планах — «Ранак», «Тракайскі». Робіцца гэта дзеля яшчэ большай разнастайнасці таго ж асартыменту і задавальнення густаў самага вытанчанага спажыўца.

Не так даўно ў «Мінскхлебпраме» асвоілі і так званую лукумную серыю, або разнастайныя віды ўсходніх ласункаў. Добра пайшла ў вытворчасці і вафельная «тэма». Шматлікія вырабы па гэтай тэме аб'яднаныя пад агульнай гандлёвай маркай «Гармонія смаку». Прычым тарты вафельныя забралі летась найвышэйшую ўзнагароду (гран-пры) рэспубліканскага конкурсу «Ласунак», адзначаны яны і на міжнароднай выставе ў Маскве.

У планах «Мінскхлебпрама» выпуск замарожанага хлеба, які будзе экспартавацца ў Ізраіль (там адсутнічае, не асвоена тая ж заварная тэхналогія, а адпаведны хлеб таксама даспадобы). Дарэчы, хлебазаводы экспартуюць сваю прадукцыю як у Расію, так і ў Канаду, ЗША, Германію і ў іншыя краіны. Гэта пераважна сухары, сушкі, пранікі, аўсяное пячэнне, вафлі і г.д...

Як зазначалася ўжо, цяпер кандытарскія вытворчасці хлебазаводаў «Мінскхлебпрама» ўзмоцнена працуюць на святочную тэматыку «мужчынскага» і «жаночага» дзён. Разам з тым, на прадпрыемстве прайшла ўжо, з удзелам прадстаўнікоў хлебазаводаў, Міністэрства аховы здароўя, Упраўлення спажывецкага рынку і іншых арганізацый, першая дэгустацыя велікодных кулічоў. Адным словам, хочаш сустрэць свята як належыць — рыхтуйся да яго загадзя.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

УНП 100056428.

Торт хлебазавода № 2 «Забытае задавальненне»

У фірменнай краме хлебазавода № 2. На здымку Святлана КАЗАКОВА, Валянціна ШТАНЮК і Людміла ШЭЛЬВАХ.

Фота «на памяць». Рукамі гэтых майстрых на хлебазаводзе № 2 ствараюцца цікавыя і смачныя рэчы.

Хочаце — верце...

СКАРПІЁНУ — НАБОР ДЛЯ АЛЬПІНІЗМУ, СТРАЛЬЦУ — ШЧАНЯ

На носе зноў святы — «мужчынскае» 23 лютага і «жаночае» 8 Сакавіка. Зноў напружваем звіліны, што б такое падарыць нашым дарагім-адзіным-каханым, каб і банальным не выглядаць, і блізкага чалавека парадаваць. Свае парады на гэты конт даюць астролагі.

Па вялікім рахунку, **Вадалею** не вельмі патрэбны падарункі, калі побач сябры, якія яго разумеюць. Вадалею будзе прыемна атрымаць які-небудзь экзатычны сувенір ці экстравагантны прадмет побыту. Напрыклад, камп'ютар ці нешта для яго ўдасканалення. Увогуле, прадстаўнікам гэтага знака падабаецца ўсё сучаснае (бія-тэлевізар, сотавы тэлефон з доступам у інтэрнэт). Кнігі для Вадалеяў — гэта кнігі пра невядомае, нязведанае, а таксама ўся фантастыка. І дарослыя Вадалеі, і тым больш дзеці будуць у захапленні ад жывога — пажадана нетрадыцыйнага — падарунка, напрыклад, харка.

Рыбы — дзіўныя рамантыкі і летуценнікі. Адпаведна падарункі ім патрэбны такія, якія хоць на імгненне здолелі б перанесці іх у мару ці казку. Бяспройгрышны варыянт — музыка, якую Рыбы вельмі тонка разумеюць. Прычым аддаюць перавагу не песням, а інструментальным кампазіцыям. Акрамя таго, Рыбы вельмі тонка адчуваюць пахі, і вытанчаныя духі стануць для іх сапраўдным святам. Дзеці-Рыбы любяць казкі і прыгоды, чым больш чароўнасці і магіі — тым лепш. Наборы для творчасці, якія абуджаюць фантазію, таксама іх парадуюць. Толькі не расказвайце пра падарункі загадзя. Рыбы так любяць сюрпрызы!

Падарунак для **Авена** павінен падкрэсліваць значнасць і саліднасць асобы, якой яго дораць. І дзецям, і дарослым падабаюцца яскравыя, бліскучыя рэчы — ад іх становіцца весялей. Гэта варта ўлічваць і пры выбары парфумы, і пры падборы аксесуараў. Многія Авены вядуць актыўны лад жыцця, таму ім будзе даспадобы што-небудзь для фітнэсу ці заняткаў спортам. Хлопчыкі застануцца ў захапленні ад цацачнага аўтамата з супермігалкай ці камп'ютарнай гульні-стралялкі, а дзяўчаткам спадабаецца пагуляць з плюшавым тыграм.

Для маленькага **Цяльца** ў якасці падарунка лепш выбраць нешта вялікае і пушыстае. Прадстаўнікі гэтага знака ўвогуле неабыякавыя да ўсяго буйнога і значнага, дробязі іх не ўражваюць. Калі вы вырашылі падарыць вазу, то яна павінна быць падлогавай, калі кнігу — хай гэта будзе энцыклапедыя ці альбом па архітэктуры. З вялікай радасцю будуць успрыняты любыя музычныя запісы, асабліва, у стылі рэтра. Не забывайцеся, што Цяльцы — аматары салодкага, таму вялікая шакаладка «зверху» ніколі не пашкодзіць.

Блізнятам падабаюцца падарункі, якія даюць «работу для розуму», пашыраюць кругагляд і дапамагаюць усё рабіць хутчэй. Таму і кніга, і ўдасканаленні для камп'ютара будуць успрыняты «на ўра». Знаходзячыся пад апекай Гермеса, Блізняты парадуюцца і сотаваму тэлефону. Дзецям спадабаюцца лагічныя гульні, кніжкі і галаваломкі ўсіх відаў. Жанчыны-Блізняты любяць, каб у гаспадарцы ўсё круцілася і вярцелася як мага хутчэй, таму ніколі не будуць супраць кухоннага камбайна ў якасці падарунка.

Як натуры эканомныя і прадбачлівыя, **Ракі** любяць акружаць сябе якаснымі, хоць і нятаннымі рэчамі. Пры выбары падарунка Раку-мужчыне рабіце акцэнт на класіцы: падыдзе дарагі партманет, стыльны гальштук стрыманых тонаў. Жанчыны гэтага знака цэняць падарункі, якія падкрэсліваюць іх пяшчоту, жаноцкасць і не любяць рэзкіх фарбаў і «крыклівых» спалучэнняў. Для дзіцяці-Рака падыдзе вялікая кніга казак ці фэнтэзі. Завітаўшы ў госці да Рака, абавязкова прынясіце букецік для яго маці (Рак — незалежна ад пола — гэта ацэніць).

Леў свята верыць, што ён — лепшы, таму ўсё, што яго акружае, павінна быць шыкоўным, раскошным і модным. Калі духі — то толькі самыя дарагія, а яшчэ лепш — золата, брыльянты. Львам падабаецца яркая выглядаць і знаходзіцца сярод яркіх рэчаў. Для жанчыны добрым падарункам стане набор касметыкі. Хлопчыку-Льву спадабаецца прыгодніцкая кніжка ці фільм, а дзяўчынка будзе рада любой яркай абноўцы.

«Падарункі — падарункамі, але павінна быць ад іх і карысць!» — так разважаюць тыповыя **Дзевы**. Многія з іх загадзя дамаўляюцца з сябрамі і роднымі аб тым, хто які падарунак прынясе. Інакш у доме назапасіцца процьма непатрэбных рэчаў! Падарунак для Дзевы павінен быць практычным і надзейным. Розныя прыгожыя драбязінкі іх не вабяць. У адрозненне ад Цяльцоў, Дзевы аддаюць перавагу мініяцюрным формам і прадметам з тонкай прарысоўкай дэталяў. Дзяўчынка-Дзева парадуецца маленькім лялькам з наборам для ўмывання, а хлопчыкі ацэняць канструктар з дробных дэталяў.

Падарунак для **Шаляў** у першую чаргу павінен быць прыгожым. Нічога кідкага, празмернага — інакш Шалі расхварэюцца. Вытанчаны альбом па архітэктуры, скульптуры ці жывапісе будзе ім па душы. Як і карціна ці элегантная статуэтка, якая ўпрыгожыць кватэру. Шалі ўмеюць тактоўна падкрэсліць свой выдатны густ, таму любая класіка — у музыцы ці літаратуры — будзе да месца. Дзяўчынцы можна падарыць ляльку ў прыгожай карункавай сукенцы, а хлопчыку — камп'ютарную гульню.

Падарунак для **Скарпіёнаў** павінен быць асаблівым. Сярод кніг — аддайце перавагу трылерам, дэтэктывам і псіхалагічнай літаратуры. Скарпіёнаў вабіць усё невядомае, тое, што хвалюе, палохае. Маскі-страшылкі ці поўны збор фільмаў Хічкока — якраз для іх. Многія Скарпіёны захапляюцца экстрэмальнымі відамі спорту, таму рэчы для альпінізму, віндсёрфінгу таксама будуць у тэму. Жанчына гэтага знака абавязкова ацэніць дарагія духі з сэксуальным, крыху мужчынскім пахам.

Самы лепшы падарунак для **Стральца** — захапляльная вандроўка. А калі самога падарожжа пакуль не намячаецца — падыдзе ўсё, што з ім звязана: кнігі па культурах іншых краін і замежных моў, набор для дайвінга ці сёрфінга, любыя сувеніры з далёкіх мясцін. Дзецям спадабаецца ўсё, што звязана з актыўнымі рухомымі гульнямі. Калі ў доме яшчэ няма сабакі, Стралец абрадуецца вясёламу шчаняці.

Казярогу вельмі імпануе класіка, надзейнасць, добры стыль, таму ідэальны падарунак для яго варта шукаць у антыкварнай краме. Калі вы дорыце кнігу, хай гэта будзе класіка (лепш у рэдкім выданні) ці практычная энцыклапедыя. Казярогі цэняць рэчы, якія падкрэсліваюць іх статус, таму ім будзе па душы гальштук ад Армані, ручка Паркер, туалетная вада ад Дзіора. Упрыгажэнні павінны быць выраблены з каштоўных металаў, а залішнюю вытанчанасць і ўльтрамодны дызайн прыберажыце для некага іншага. Многія жанчыны-Казярогі захапляюцца развядзеннем кветак, ім падыдуць кнігі аб раслінах і мастацтве ікебаны.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

АДВАКАТ СХІЛІЎ ДА ХАБАРУ

Суд Савецкага раёна г. Мінска прызнаў былога адваката Мінскай абласной калегіі адвакатаў, 1972 года нараджэння, вінаватым у схіленні да дачы хабару ў буйным памеры, завалоданні маёмасцю шляхам падману, злоўжыванні даверам і прызначыў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3,5 года з адбываннем у папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Следства ўстанавіла, што будучы адвакатам грамадзяніна Літоўскай Рэспублікі, падазроная асоба неаднаразова падбухторвала сваякоў апошняга да дачы хабару як быццам для службовых асобаў суда і органаў пракуратуры. Як паведамілі ў прэс-службе ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па г. Мінску і Мінскай вобласці, у жніўні 2008 года адвакат атрымаў 15 тысяч еўра для садзейнічання ў прыняцці Мінскім гарадскім судом рашэння аб прызначэнні літоўскаму грамадзяніну больш мяккага пакарання. Зразумела, падазроная асоба мела намер проста завалодаць валютнымі сродкамі і не мела ні намеру, ні магчымасці вырашаць згаданае пытанне.

У сакавіку 2009 года Мінскі гарадскі суд пакінуў без змяненняў прыгавор у дачыненні да літоўца. Адвакат паведаміў сваякам асуджанага, што названыя сродкі нібыта перадаў у якасці хабару службовым асобам органаў пракуратуры. Пры гэтым 4 тысячы еўра з раней атрымманай сумы было вырашана прысвоіць сабе. Сваякі западозрылі падман і звярнуліся ў праваахоўныя органы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ГАТАВАЎ СПІРТАВЫ «САМАПАЛ»

Супрацоўнікі АБЭЗ Баранавіцкага ГАУС затрымалі беспрацоўнага, які на аўтамашыне перавозіў 160 літраў спірту. А калі зазірнулі ў яго гараж, то знайшлі там яшчэ 220 літраў спірту, гарэлку, віно, больш за 5 тысяч гарэлачных этыкетак, металічныя накрыўкі...

Справа перададзена ў суд.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Наш культурны асяродак
Жыроандоля
Выпуск № 4 (90)

НАШ ЧАЛАВЕК ПРЫ ЗБОРЫ САПЕГАЎ

Расійскі бібліятэкар дапаможа Беларусі вярнуць каштоўныя кнігі

Ларыса ЦІМОШЫК

МОЖНА лічыць, што кнігі з легендарнага збору пад наглядам ці своеасаблівай апекай — з беларускага боку. Хоць частка калекцыі Сапегаў знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу, у былой Імператарскай бібліятэцы. Вядома, належыць не нашай краіне. Нічога не зробіш, не вернеш... Але ёсць там наш чалавек, які воляй лёсу прыстаўлены да скарбу — загадчык Аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі Мікалай Нікалаеў. Такое здараецца не проста так, а калі здараецца, то азначае: даецца шанц вярнуць на радзіму тое, што некалі ёй належала. Беларус Нікалаеў пакрысе вяртае — абсалютна легальным спосабам. Ён — аўтар вялікай працы па гісторыі беларускай кніжнай культуры: першы том выдання быў прадэманстраваны на Мінскім Міжнародным кніжным кірмашы. Акрамя гэтага, па прыедзе ў Мінск Мікалай Нікалаеў дамаўляўся з кіраўніцтвам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі наконт сумеснай працы па рэканструкцыі кнігазбору Сапегаў.

— Сапегі пасля Радзівілаў — другі па багацці старажытны род, — распавядае **доктар філалагічных навук Мікалай НІКАЛАЕЎ**. — Маёнткі Сапегаў былі па ўсёй краіне, але большасць — на Брэстчыне. Мы ведаем, што Леў Сапега арганізаваў працу па друкаванні Статута Вялікага Княства Літоўскага, ён і іншыя друкарскія «праекты» развіваў. А якія ў сям'і былі кніжныя зборы! Яны збіралі багатыя бібліятэкі і некалькі разоў дарылі дзяржаве. Сын Льва Сапегі — Казімір Леў — падарыў больш за 1000 кніг Віленскаму ўніверсітэту — дасюль там ёсць частка яго бібліятэкі. Потым сабралі другую велізарную бібліятэку — у Дзярэчыне і ў Кодыні, і Аляксандр Сапега падарыў яе Варшаўскаму таварыству аматараў навук у 1810 годзе. Гэты збор знаходзіўся нейкі час у Варшаве, потым яго вывезлі ў Пецярбург і падзялілі паміж Імператарскай публічнай бібліятэкай і бібліятэкай універсітэта. Што засталося ад тых кнігазбораў, дзе яны, дзе кавалкі архіваў Сапегаў? Мы пастараемся зрабіць кампакт-дыск з рэканструкцыяй гэтага кнігазбору. Брэсцкая абласная бібліятэка і Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў Мінску выступілі ініцыятарамі, а падтрымала праект Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА. Будуць зроблены апісанні тых кніг, якія сёння вядомыя, некаторыя з найбольш цікавых — сканаваныя. На жаль, пакуль мы ведаем некалькі соцень кніг з таго збору, а былі тысячы...

— Вы маеце доступ да кніг, якія належалі беларускім магнатам, а цяпер знаходзяцца за межамі нашай краіны. Якім чынам вы апынуліся ля іх?

— Вучыўся я як археолаг. «Капаў» старажытны Навагрудак. Я сам з Навагрудка. Школьнікам быў — капаў, потым ужо студэнтам універсітэта ў Мінску таксама ўдзельнічаў у раскопках, летам працаваў і пасля пераезду ў Ленінград, калі стаў супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі Расіі. А потым была перабудова, археалогія практычна страціла фінансы, перспектывы. Аднак для мяне наступіла новае адкрыццё.

Калі я быў археолагам, то на раскопах мы часам знаходзілі спаленыя зашпількі ад кніг. Гэта было цікава, арыгінальна. А калі я прыйшоў у бібліятэку працаваць, то ўбачыў жывыя кнігі з такімі самымі зашпількамі — XII, XIII, XIV стагоддзяў. Я зразумеў, што гісторыю культуры можна даследаваць з розных бакоў. Можна ў чорнай зямлі капаць, а можна каля кніжных паліц.

Так атрымалася, што ў мяне быў перапынак — на службу ў войску — адкуль я вярнуўся ў бібліятэку, паступіў у аспірантуру ў Ленінградзе. Напісаў дысертацыю па рукапіснай кнізе на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага. Потым напісаў другую дысертацыю — па кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага.

Мая кар'ера ў бібліятэцы прайшла праз аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Расіі. Цікава было — уявіце, што там побач з Полацкім евангеллем XII стагоддзя захоўваюцца арыгіналы рукапісаў Лермантава ці Ахматавай! Цяпер я ўзначальваю Аддзел рэдкіх кніг. А гэта яшчэ цікавей — у нас лепшая ў свеце калекцыя выданняў Францыска Скарыны. Я маю доступ да кніг з бібліятэк Сапегаў і іншых старасвецкіх кнігазбораў. Безумоўна, гэта накладае пэўныя абавязкі. І калі я пісаў тоўстую «Гісторыю кніжнай культуры ВКЛ», то рабіў гэта з разуменнем, што наўрад ці хто з Беларусі мае магчымасць гэта зрабіць. Хоць не магу сказаць, што я геніяльны даследчык, ёсць шмат таленавітых людзей, толькі без доступу да такіх рарытэтаў. А пасля размоваў з беларускімі, расійскімі, польскімі і літоўскімі гісторыкамі, напрыклад Георгіем Галенчанкам, Зояй Ярашэвіч-Пераслаўцаў, Міхасём Ткачовым, Арвідасам Пацявічусам, архівістам Віталем Скалабанам, я лепш разумеў, куды і як рухацца ў даследаваннях.

— Колькі адкрыццяў утрымліваюць гэтыя кніжкі для нас?

— Нават калі вы аматар старадрукаў, вы ведаеце на парадак менш, чым супрацоўнік Аддзела рэдкіх кніг нашай бібліятэкі. А я, як адзін з супрацоўнікаў са стажам, ведаю на парадак менш за тое, што можна яшчэ адкрыць. Некалі мой сын Андрэй збіраўся паступаць ва ўніверсітэт, хацеў стаць егіптолагам, але асцярожна запытаўся ў мяне: «У прынцыпе, усе гісторыі ўжо напісаныя. Навошта ўніверсітэты штогод прымаюць і рыхтуюць гісторыкаў?» Я адказаў: «Глыбока пераканаюць, і бачу з жыцця, што кожнае пакаленне людзей павінна пераасэнсаваць усю гісторыю — і сваю нацыянальную, і ўсю сусветную. Кожнае пакаленне людзей павінна мець новыя гістарычныя тэксты. Таму калі ты захочаш быць гісторыкам, твая праца будзе запатрабаваная».

У нас старую кнігу часцей вывучаюць з боку гісторыі літаратуры. А я падыходзіў як археолаг — даследаваў матэрыяльную форму, ілюстрацыі. Мяне за гэта ўпякалі некаторыя літаратуразнаўцы. У кніжцы, што выйшла, — нейкая палеміка з імі, паважанымі знаўцамі летапісаў. Бо я з іншага пункту гледжання на ўсё гляджу. І лічу, што чым больш розных людзей будзе глядзець на старажытную кніжнасць, тым лепш. А хто выбера правільную пазіцыю для назірання, той больш паглыбіцца ў культуру. Напрыклад, у гады маёй маладосці слова «першадрукар» ужывалася ў дачыненні да Івана Фёдарава. Мелася на ўвазе тое, што ён выдаў у Маскве, хоць у Беларусі Фёдараў працаваў больш. Але людзям адкрылася новая праўда, калі кнігазнаўцы зрабілі даступнай інфармацыю пра Францыска Скарыну і Пятра Мсціслаўца. Цяпер усе ведаюць, што першадрукар — Скарына. А я цяпер працую над тым, каб асобы, якія ў гісторыі засталіся на другім плане, выходзілі з ценю. Яны вартыя гэтага. Напрыклад, Мацей Дзясяты-кнігапісец. Ён раней, чым Скарына, стварыў агульны звод біблейскіх кніг! Але яны рукапіснымі, толькі ў адным экзэмпляры. Больш за тое, ён быў выдатны каліграф — пісаў надзіва прыгожым почыркам. Ужываў шматколернае чарніла, пісаў асэнсавана: напрыклад, тэкст ад аўтара сінім чарнілам, словы апосталаў — чырвоным. А слова «Божае» — золатам. Мацей Дзясяты пачаў складаць і сваімі рукамі спісваць Біблію ў 1502 годзе, а скончыў у 1507-м. А Скарына толькі ў 1517-м пачаў друкаванне. Таму Скарына — першы як наш друкар. Але як бібліеіст — ён другі...

— Ці даюць кнігі, сярод якіх вы існуеце, разуменне, як развівалася беларуская мова?

— Я больш сачыў за матэрыяльным абліччам кнігі, а не за мовай. Але чым далей, тым больш узіраюся ў тэксты, прыглядаюся да іх моўных асаблівасцяў. Мова адлюстроўвае мысленне. Францыск Скарына гаварыў на той мове, на якой цяпер не гавораць, пісаў на ёй. Але то была наша старажытная мова. Даўно ідуць спрэчкі з летувісамі: як называць тую мову, на якой напісаны Статут Вялікага Княства Літоўскага? У Літве часта кажуць, гэта канцылярская мова, ніхто на ёй не гаварыў, толькі пісары пісалі. Вядома, што летувіскі народ не гаварыў. Але беларускі народ так гаварыў, іначай для чаго было выдумляць трэцюю мову — няўжо спецыяльна для Статуту? Тым больш што мова не існуе без яе носьбітаў.

Мова патрабуе ўвагі. Калі прыслухоўваешся, то яна дае шмат асацыяцый, шмат дадатковай інфармацыі. Я стараюся ўнікаць у гісторыю слоў. Напрыклад, ці ведаеце паходжанне слова «шлюб»? Нядаўна, чытаючы старажытныя дакументы, даведаўся, што «слюбы» — гэта былі вяроўкі, якімі вязалі палонных. Узялі «слюб» — значыць, узялі вяроўкі і павязалі палонных. Адсюль выраз «трапіць у палон». І такіх цікавостак я знайшоў шмат. Збіраю, запісваю, можа калі-небудзь папулярную кніжку зраблю пра моўныя асаблівасці старасвецкіх кніг.

Праз гісторыю мовы я ў аднаго піцерскага беларуса выклікаў прыхільнасць да сябе, растлумачыўшы паходжанне ягонага прозвішча. Віктар Мікалаевіч Лабко быў віцэ-губернатарам Пецярбурга. Прычым быў «віцэ-» і пры Сабчаку, і пры Якаўлеве, і з Мацвіенкай папрацаваў. Нядаўна на пенсію па гадах пайшоў. Калі я працаваў над кнігай «Беларускі Пецярбург», прыйшоў да яго ў Смольны, дамогся сустрэчы. Ён у Баранавічах вучыўся ў школе, а сам са Снова. Я спытаў, ці ведае ён, што азначае яго прозвішча? І патлумачыў па аналогіі: на Лідчыне ёсць вёска Ёдкі, «ёдас» азначае па-літоўску чорны, а да балтыйскай асновы дадаецца, славянскі суфікс. А «лабас» — значыць добры. Калі перакласці балтыйскую аснову і дадаць славянскі суфікс, то атрымліваецца Дабрэнка. У інтэрв'ю ён потым казаў, што ён «добры чалавек».

Гісторыю кніжнай культуры можна спасцігаць бясконца. Таму скончыўшы праект «Гісторыя кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага», я думаю над працягам: ёсць задума зрабіць другі том, прысвечаны кніжнай культуры на Беларусі ў XIX стагоддзі, кніжнай культуры ў БССР, і да сённяшняга дня. Як навуковы рэдактар задуманага тома я меў перамовы ў Беларусі з патэнцыйнымі аўтарамі — выкладчыкамі Універсітэта культуры і Акадэміі мастацтваў, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі пагадзіўся напісаць для гэтага выдання гісторыю бібліятэк у Беларусі.

— Вы пішаце кнігі па-беларуску, узначальваеце Таварыства беларусістаў Пецярбурга. А хто дапамагае падтрымліваць беларускі асяродак?

— Пецярбургскія беларусы, з якімі я ў кантакце, большай часткай людзі з вышэйшай адукацыяй, якія карыстаюцца беларускай мовай свабодна, нязмушана. Больш за тое, яны настальгуюць. Паміж намі модна гаварыць па-беларуску і не прынята іначай. У беларускае грамадска-культурнае таварыства прыходзяць людзі, якія любяць гэтую мову. У нашым статуце запісана: «падтрымліваць культуру Беларусі і знаёміць жыхароў Пецярбурга з беларускай культурай». Піцерскае таварыства беларусістаў зладзіла 17 навуковых канферэнцый на тэму «Санкт-Пецярбург і беларуская культура» — яны адбываюцца кожны год. А тым, хто прадстаўляе беларускую культуру, непрыстойна не ведаць беларускую мову. Для мяне асабіста гэта так...

Некалі я маладым прыехаў у Піцер і сустрэўся з Галінай Максімаўнай Гарэцкай, дачкой пісьменніка, яна практычна ўсё жыццё жыла ў Ленінградзе, але, што мяне ўразіла, карыстаннем роднай мовай дэкларавала сваю прыналежнасць да Беларусі. Уражвае мяне і іншы наш сябра — Леанід Ігнатавіч Сланеўскі. Яго маці скончыла Віленскі ўніверсітэт, а бацька скончыў Пражскі ўніверсітэт, абодва былі настаўнікі. Іх сын стаў генералам авіяцыі. І ён цяпер з землякамі гаворыць толькі па-беларуску. Увесь час у іх у сям'і гучала свая мова, яны за яе трымаліся. Калі была прэзентацыя маёй кнігі «Беларускі Пецярбург», як выразна ён прачытаў на памяць Багдановіча «Пагоню»! Такіх людзей шмат, яны прыходзяць на супольныя сустрэчы менавіта дзеля зносінаў, дзеля адчування сваіх. Заўважаецца, што калі муж і жонка з Беларусі, то, як правіла, яны паміж сабой, куды б іх ні закінула жыццё, працягваюць гаварыць па-свойму.

А ў Мінску гляджу — чамусьці саромеюцца. Людзі часам пазбягаюць беларускай мовы, бо так гавораць іх бацькі і дзяды ў вёсцы, а гэта «адсталае». А потым тыя людзі са сваімі комплексамі выракаюцца ад сваёй нацыянальнай культуры. Аднак іншых крытыкаваць — нядзячная справа. Асабіста ў мяне з беларускай мовай не было комплексаў: гэта была штодзённая і менавіта «матчына» мова. Бацька мой рускі, але навучыўся па-беларуску і мяне ў гэтым падтрымліваў. А тое, што бацька быў ваенны лётчык, пазбаўляла ад прыніжанасці, гэта было прэстыжна. І я мог пастаяць за свае інтарэсы.

Я малым гадаваўся на Навагрудчыне, дзе я чуў беларускую мову, а мае два сыны-ленінградцы ўжо не мелі такога асяродку. Таму я ім чытаў казкі. Я іх прымушаў дома пісаць дыктоўкі па-беларуску, пакуль яны былі хлопчыкамі. Бо над культурай трэба пастаянна працаваць! Тады гэта будзе твая культура. Калі яны былі дзецьмі, то, зразумела, паміж сабой часцей па-руску гаварылі. Але часам, калі я прыходзіў з працы, яны пачыналі звяртацца чысценька па-беларуску: звычайна гэта азначала, што альбо двойкі атрымалі, ці вазу пабілі. Нешта здарылася — і дзеці павінны былі прылашчыцца. Яны ведалі як гэта зрабіць. Бацька адразу «расплываўся».

— І які плён выхавання?

— Мой старэйшы сын — кандыдат медыцынскіх навук, жыве ў Маскве. Ён нядаўна прыязджаў, дзеля абароны дысертацыі, сустракаўся са сваім навуковым кіраўніком, выдатным хірургам, прафесарам Міхасём Ханевічам з Беларусі. Я сказаў: «Косця, не ганьбі свайго бацьку — гавары па-беларуску». Ён настроіўся і гаварыў толькі па-беларуску! Хоць, вядома ж, у яго ўжо няма навыку штодзённай размовы. Малодшы сын стаў егіптолагам і ведае больш за 13 моў, у тым ліку беларускую.

Але наша сітуацыя ўсё-такі выключная, бо жылі за межамі краіны. Нельга сказаць, што само сабой усё даецца. Сваю культуру найперш трэба паважаць. Клапаціцца пра яе. Бо мы ж клапоцімся нават пра побытавыя рэчы. Каб даўжэй служылі чаравікі, купляем ваксу, чысцім іх, каб лепш захаваць. Пра матэрыяльныя рэчы клапоцімся, а пра духоўныя — чаму не? Гэта ж твая мова, папрацуй над ёй. Я для сябе такую выснову зрабіў, што павінен мець свежыя беларускія кніжкі і чытаць, частку свайго бюджэту трачу на беларускую літаратуру. Таму што трэба рабіць намаганні, каб падтрымліваць культуру ў самім сабе.

Бенефіс

ЛАДДЗЯ МУЗЫКІ

Сяргей Картэс задумаў оперу паводле Караткевіча

КАМПАЗІТАР Картэс сам стварыў сабе найлепшы падарунак да юбілею: напісаў оперу, якую паставілі ў Маскве. Праўда, беларускага кампазітара там добра ведаюць яшчэ з савецкіх часоў: яго операй «Джардана Бруна» ў 1977 годзе адкрываліся гастролі Вялікага тэатра Беларусі ў Маскве.

Картэс — з тых сучасных беларускіх кампазітараў, творы якіх знаходзілі шлях да слухача. Музыка гучала ў канцэртах, оперы ставіліся на сцэне тэатра. Оперы Сяргея Картэса заўсёды вылучаліся нейкім агульначалавечым гучаннем, што рабіла іх зразумелымі не толькі ў сваёй краіне. Не проста так: Сяргей Альбертавіч нарадзіўся ў далёкай Лацінскай Амерыцы, а калі сям'я вырашыла вярнуцца на радзіму маці, то месцам жыцця вызначылі Мінск. Аднак Беларусь стала яго краінай, а ён — беларускі кампазітар па выхаванні і па служэнні.

— Так, я сучасны кампазітар, — адзначае Сяргей Картэс. — Я жыву сённяшнім днём. І самае галоўнае для мяне — музычнай мовай, якою я карыстаюся, перадаваць эмоцыі, каб яны дайшлі да гледача.

Глядач, які ўжо знаёмы з музыкай гэтага кампазітара, напэўна, зверне ўвагу на абвестку аб яго вечарыне ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Але нехта можа адкрыць яго музыку для сябе. Таму што бенефіс пазнаёміць з Сяргеем Картэсам як з кампазітарам, які стварыў шмат музыкі ў розны час, у розных жанрах: інструментальную, камерна-вакальныя творы, арыі з опер ці нават асобныя фрагменты. Але гэта толькі палова справы. І палова бенефіснай вечарыны. Бо галоўнае будзе далей. І гэтае галоўнае: беларуская прэм'ера новага твора — оперы «Мядзведзь», якую Сяргей Картэс напісаў паводле Чэхава.

— У снежні ў Маскоўскім камерным тэатры імя Пакроўскага ажыццявілі гэтую пастаноўку, — кажа аўтар. — Тое, што яны абралі гэтае сачыненне, само па сабе значыць шмат. Мне асабіста было радасна, бо Пакроўскі ведаў, што гэты твор будзе ставіцца ў тэатры, а калі яго не стала, мне было горка. Але трэба прызнаць, што ў Беларусі гэтую оперу ўсё-такі пачулі раней — у філармоніі быў вельмі добры канцэрт. Але опера напісаная менавіта для тэатра.

У Сяргея Картэса дзве оперы паводле Чэхава. Ёсць яшчэ аднаактовая опера «Юбілей», якая ішла ў нашым тэатры, але мала. У Маскве, дарэчы, яны былі пастаўленыя адным рэжысёрам і ўспрымаліся як дзве часткі аднаго спектакля. У нас таксама маюць намер паставіць дзве оперы і аб'яднаць іх у вечары опер Чэхава. Ці можа ўсё-такі Картэса, які ўпадабаў Чэхава? Бо для яго важна, каб на сцэне было дзеянне, падчас якога мяняюцца жыцці людзей. Але каб напісаць оперу, на яго думку, вельмі важны яшчэ адзін момант.

— Галоўнае — адчуваць характар таго героя, пра якога пішаш. Па тэмпераменце адчуць, як ён можа спяваць. Я павінен уявіць іх жывымі, рэальнымі, каб пісаць музыку,— тлумачыць Сяргей Альбертавіч. — Цяпер я пачаў пісаць новую оперу. Калі перачытаў Караткевіча «Ладдзя роспачы», то зразумеў, што яго можна перавесці на мову музыкі. Лібрэта ўжо ёсць. Перачытаў яшчэ раз — геніяльны твор гэтага пісьменніка! Адразу пачалі ажываць яго героі, я ўбачыў іх твары і адчуў, як яны рухаюцца, як жывуць на сцэне. А калі героі ажываюць, то зразумела, як яны спяваюць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СЕМЕЖАЎСКІЯ ТКАЛЛІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Народны майстар Беларусі па ткацтве жыхарка вёскі Семежава Валянціна Кіеня перадае свой багаты вопыт традыцыйнага мастацтва вясковым школьніцам, наведвальніцам Дома рамёстваў.

УРОКІ БЕЛАРУСКАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЮНЕСКА менавіта і прыслухалася... Да краін, якія непакоіліся захаваннем сваіх моў. У прыватнасці — Бангладэш прапанавала ўсталяваць такое свята. Імкненне Бангладэш стаць незалежнай ад Пакістана было абумоўлена ў тым ліку змаганнем за сваю мову бангла. Бо мова — гэта сімвал краіны.

Ці «прыстанак быцця», як азначыў філосаф Хайдэгер. А быццё ў розных краін бывае зусім рознае. Як рознае ўспрыманне нейкіх рэчаў, з'яў у розных народаў. Мяняецца наша мова — значыць мяняецца і мысленне, нейкая спрадвечная сутнасць. Мяняецца народ. А мы ўпэўненыя ў тым, што хочам мяняцца? Хочам ламаць свой менталітэт, каштоўнасці, традыцыі? Кожны адказвае на гэтыя пытанні для сябе і за сябе. Кожны выбірае.

А выбар народа складаецца з безлічы выбараў асобных. Таму і кожная ініцыятыва падтрымкі нашай беларускай адметнасці, адметнасці краіны становіцца справай асобаў, якія выбралі. Хтосьці вырашыў, што ў беларускім метро пісаць рэкламу трэба па-беларуску. Хтосьці выбраў трапнае наша слоўца для назвы крамы. Ці вырашыў папярэджваць пра шкоду цыгарэт — можа толькі так і звернеш увагу на гэтыя папярэджанні! Хтосьці жывіць беларускую мову тым, што стварае на ёй вершы.

А свет сапраўды мяняецца. У ім каля 6000 моў, якія пакуль жывуць. Хоць ёсць папярэджанні аб небяспецы для паловы з іх. У тым ліку для беларускай. У гэтыя папярэджанні лёгка паверыць, калі знаходзішся на вуліцы. Але чамусьці я пра іх зусім не думаю на працы і дома — там, дзе ўсё залежыць толькі ад мяне самой.

Дык якая ж мая сапраўдная моўная сітуацыя?

Ірына КУЛЬБІЦКАЯ: «МЫ ПАВІННЫ НАВУЧЫЦЬ ДЗЯЦЕЙ БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМІ!»

Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з унікальнай настаўніцай, прафесійная дынастыя якой налічвае амаль 300 гадоў

ІРЫНА Мікалаеўна КУЛЬБІЦКАЯ — педагог ад Бога, настаўніца, якая ў 2006 годзе стала лепшым настаўнікам першых класаў у Мінску, а некалькі тыдняў таму прадэманстравала, бадай, найлепшую прэзентацыю сваёй уласнай прафесійнай дынастыі на Фестывалі настаўніцкіх дынастый у сталіцы. І не выпадкова, бо пераемнасць пакаленняў у гэтай таленавітай настаўніцы складае ажно 298 (!) гадоў...

Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.

— Ірына Мікалаеўна, распавядзіце, калі ласка, пра сам конкурс настаўніцкіх дынастый. Што гэта за навіна такая, у чым яе сэнс і задача?

— Гэта нават не конкурс, а злёт настаўніцкіх дынастый. Ён праводзіўся ў Мінску і цяпер працягваецца ў іншых гарадах, а ў сакавіку будзе рэспубліканскі фінал, дзе збяруцца найперш тыя дынастыі, якія прайшлі далей са сваіх раённых злётаў у гэтым годзе. І, наколькі я разумею, будзе створаны педагагічны музей. Бо, сапраўды, ёсць жа шмат педагогаў, якія пакінулі след у жыцці многіх людзей, але пра іх ніхто не ведае. Сутнасць жа не ў тым, хто якіх вялікіх людзей выхаваў, вывучыў, а ў тым, што кожны з іх быў асобай і нешта пакінуў у душах сваіх выхаванцаў — і гэты след ідзе праз усю гісторыю... А таму гэты злёт вельмі важны, каб адчуць подых часу, адчуць тых людзей, іх ідэі, тое, чым яны натхняліся, на чым трымаліся і чым жылі.

— А як вы самі падышлі да гэтага расповеду пра сваіх родзічаў, як выключных асобаў?

— Калі праходзіў сам злёт, мне хацелася распавесці пра кожнага чалавека не з пазіцыі сухой біяграфіі, бо гэта, падаецца, было б не вельмі цікава, а з таго пункту гледжання, што яны неслі. А таму пра кожнага прадстаўніка нашай дынастыі я расказвала, як пра чалавека-сімвала: кім ён з'яўляецца асабіста ў маім уяўленні. Напрыклад, мой дзядуля Мікалай быў сімвалам веры, таму што ён быў дырэктарам школы ў вёсцы Зарэчча Мінскага раёна (там, дзе цяпер Мінскае мора) і вось за тое, што ён ахрысціў сваіх дзяцей у царкве, яго знялі з пасады дырэктара школы, адкамандзіравалі на афіцэрскія курсы, і ў траўні 1941 года ён прыбыў у Беласток, дзе, калі пачалася вайна, знік без весткі. І вось бабулі маёй ён прыслаў ліст, дзе былі такія радкі: «Запомні, мы павінны навучыць дзяцей быць шчаслівымі!» — менавіта не зрабіць шчаслівымі, а навучыць, бо зрабіць шчаслівым чалавека ніхто не можа. Дакладна гэты радок і стаў дэвізам, можна сказаць, асноўнай рысай усёй нашай настаўніцкай дынастыі. Вось што ў жыцці важна?.. Выбраць прафесію і выбраць спадарожніка жыцця — два моманты, якія ў жыцці кожнага чалавека найбольш значныя, бо, калі ты ўгадаў з прафесіяй і са спадарожнікам жыцця, ты будзеш шчаслівы. А таму навучыць быць шчаслівымі: даць зразумець, якія ў цябе схільнасці, да чаго ты цягнешся — гэта вельмі важна!..

— Менавіта гэты дэвіз і ёсць тым асноўным, на чым вы будуеце сваю вучобу?

— Можна і так сказаць. Таму што нават цяпер, калі навучаю зусім маленькіх дзяцей, я на кожным занятку кажу: «Нарадзіўся чалавек для таго, каб памнажаць дабро, каб перадаваць любоў». Таму трэба гэтых дзетак навучыць любіць, навучыць дабраце, бо яны яшчэ гэтых рэчаў не ведаюць, хоць нам і здаецца, што яны ўсе добрыя. І зразумець, што кожны момант жыцця — унікальны, радавацца таму, што ёсць: «Вось, паглядзіце, дзеці, снег за акном — якая радасць»... І каб яны маглі цаніць тых, хто побач, любіць іх, паважаць...

— Але ці магчыма кожны ўрок зрабіць цікавым для вучняў?

— Ведаеце, мая мама, заслужаны настаўнік БССР, мяне навучыла самаму галоўнаму — некалі яна мне казала: «Ты павінна кожны занятак рыхтаваць як адкрыты! Не проста накідаць нейкі план і па канспекце чытаць — а ўяві, што ў цябе сядзіць шмат народу ў класе, і калі ты навучышся так рыхтавацца, то толькі тады ты станеш сапраўдным настаўнікам!» І вось, у яе самой на кожны занятак былі падрыхтаваныя і розныя карткі, і малюнкі для нагляднасці. Раней нават не сшыткі часта бралі ў Інстытут удасканалення настаўнікаў, як узор планаканспекта, якія яны павінны былі быць у настаўнікаў...

— Спадарыня Ірына, ад вашых выпускнікоў я чуў, што вы нават пасля 15 гадоў па заканчэнні пачатковай школы захоўвалі іх творчыя работы...

— Дык яны ў мяне і цяпер ёсць!.. Звычайна 1 верасня я даю дзецям творчае заданне: «Малюйце, што хочаце: можа быць, кім вы хочаце ў будучыні стаць, можа, яшчэ што-небудзь» — і вось, гэтыя малюнкі я захоўваю. А калі вучні заканчваюць школу, звычайна на апошнім званку, я ім уручаю ўсе іхнія творчыя работы за час навучання ў пачатковай школе. Зразумела, для іх гэта, проста дзіўна... А самыя найлепшыя, самыя цікавыя дзіцячыя сачыненні, малюнкі ідуць у адпаведную скарбонку дзіцячых твораў. Паколькі з многімі выпускнікамі мы падтрымліваем сувязь, вельмі цікава і ім вярнуцца ў сваё дзяцінства, і мне пабачыць, якімі яны былі тады, аб чым марылі і кім нарэшце сталі. Кожны малюнак насамрэч змяшчае псіхалагічны партрэт свайго аўтара, і па любому малюнку можна зразумець, што хвалявала, да чаго імкнулася тады дзіця... А яшчэ мы выдаём часопіс «Пчолка», дзе змяшчаюцца самыя цікавыя творчыя работы дзяцей. Напрыклад, неяк адзін хлопчык напісаў сачыненне ў адзін сказ: «Яблык упаў з дрэва — першая кропля дажджу», — і я яму паставіла, вядома, 10 балаў за такі сапраўдны «хокаўскі» (японскі верш. — **Аўт.**) шэдэўр. І такіх прыкладаў процьма, бо сапраўды дзіцячае светаўспрыманне проста фантастычнае...

— А як так атрымалася, што ўсе вашы дзеці як сапраўдныя, гэтак і школьныя, выраслі, у поўным сэнсе, патрыётамі, якія шануюць не толькі сваю сённяшнюю краіну, але, найперш, яе гісторыю, мову? Ці ёсць тут нейкі асаблівы сакрэт? Якая ваша формула беларушчыны?

— Насамрэч мы знаходзімся ў асяроддзі рускамоўных людзей, а таму для таго, каб беларускасць дзеці хоць бы крыху адчулі і палюбілі, заўжды павінны быць заняткі нейкімі асаблівымі. Бо беларуская ж мова вучыцца дзецьмі, як замежная. А таму трэба, каб дзецям было вельмі цікава асабліва на гэтым патрыятычным прадмеце... Вось, напрыклад, у нас ёсць такая Каркуша, чорны крумкач даволі пацешлівы знешне: яна прылятае да іх з лясной школы, вітаецца, распавядае пра сябе і паціху вучыць новым словам. І калі дзеці правільна адказваюць на пытанні, ён падлятае да іх і гладзіць сваім крылом, альбо цалуе дзюбай — і вучні адразу робяцца шчаслівымі-шчаслівымі!.. А вось нядаўна мы былі на канцэрце Зміцера Вайцюшкевіча «Мой сябра анёлак» — цяпер вучым некаторыя песні: дзецям так гэта падабаецца... Ну і яшчэ, безумоўна, розныя інсцэніроўкі, экскурсіі па роднай краіне: напрыклад, пачынаем з «Менкі» (Музей драўлянай архітэктуры і побыту. — **Аўт.**), дзе дзеці могуць усё памацаць рукамі, потым, скажам, едзем у той жа Мірскі замак — магчымасць дакрануцца да гісторыі заўжды выхоўвае патрыятызм!...

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА вучыўся ў пачатковай школе № 126 у класе Ірыны Мікалаеўны Кульбіцкай. Вось якія ўспаміны засталіся ў яго аб сваёй першай настаўніцы:

— Гэта была вялікая радасць і ўдача для мяне патрапіць у першым класе менавіта да Ірыны Мікалаеўны. Я думаю, што яе найвялікшая мудрасць была ў тым, што яна вучыла нас не толькі так, як прапісвала праграма, як было напісана ў планах, схемах, а так, як яна гэта ўяўляла, таму што яна цудоўны педагог, цудоўная мама. Да нас яна ставілася менавіта як мама. Мне запомнілася, напрыклад, як я каліцьці захварэў і маці пазваніла ёй, каб паведаміць, што я не пайду ў школу. А Ірына Мікалаеўна пачала распытваць, што са мной здарылася, і прапанавала нейкую мазь палекаваць — і вось бацька хадзіў ўвечары да яе дамоў, каб узяць гэтую мазь. Мне падаецца, гэта шмат аб чым сведчыць, бо часта настаўнікі пачатковай школы абыякавыя да сваіх маленькіх выхаванцаў... Усё ж галоўная задача настаўніка — не проста даваць нейкія канкрэтныя веды, а навучыць дзіця мысліць: думаць, разважаць, спасцігаць нешта самому — гэта ўсё ў нас было з першага класа. Прычым Ірына Мікалаеўна вельмі тонка разумее дзіцячую псіхалогію: як даць нейкую інфармацыю дзіцяці, каб гэта было цікава і зразумела. Вось, напрыклад, як дзіцяці растлумачыць знакі «больш» і «менш» у матэматыцы? Яна нам патлумачыла так: «Вось вы ўявіце пеўніка: калі ў пеўніка дзюба адкрытая, гэта значыць, што гэта «менш» (<), што ён просіць, каб яму далі чагосьці яшчэ; а калі дзюба закрытая, то гэта значыць, што ўсё — «больш» (>) не трэба!».. Ірына Мікалаеўна — геніяльны настаўнік, і такіх настаўнікаў я ніколі больш не сустракаў нідзе: ні ў школе, ні ў ліцэі, ні ва ўніверсітэце. Так, было шмат цудоўных настаўнікаў, але вось у ёй дакладна ёсць іскра Божая менавіта вучыць дзяцей.

Прадзед Лук'ян — выкладчык матэматыкі ў рэальнай вучэльні г. Мінска.

Дзед Мікалай — дырэктар школы ў вёсцы Зарэчча Мінскага раёна Мінскай вобласці ў 1939—1941 гг.

Бабуля Фаіна — настаўнік нямецкай і англійскай мовы, інспектар АблАНА па замежных мовах.

Маці Галіна — настаўнік пачатковых класаў у в/г Масюкоўшчына, СШ №126.

Цётка Святлана — настаўнік-дэфектолаг у дашкольным дзіцячым доме ў м. Ждановічы.

Дзядзька Барыс — дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту Педуніверсітэта імя М. Танка.

Цётка Наталля — выкладчык англійскай мовы ў фінансава-эканамічным каледжы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.19	17.28	10.09
Віцебск —	7.11	17.15	10.04
Магілёў —	7.09	17.18	10.09
Гомель —	7.02	17.18	10.16
Гродна —	7.33	17.44	10.11
Брэст —	7.31	17.48	10.17

Месяц

Першая квадра 22 лютага. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Лукі, Парфена.*

К. *Анеты, Людмілы, Леха, Лявона, Юльяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

20 лютага

1903 год — нарадзіўся (сяло Хоціна Віцебскай губерні) Леў Міхайлавіч Даватар, савецкі генерал, Герой Савецкага Саюза. У першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны, падчас бітвы пад Масквой, камандаваў кавалерыйскай групай, гвардзейскім кавалерыйскім корпусам. Загінуў у снежні 1941 года ў раёне вёскі Папашкіна Рузскага раёна Маскоўскай вобласці. Імя Льва Даватара прысвоена вуліцам у многіх гарадах, у тым ліку ў Маскве, Мінску, Кіеве, Віцебску, Новасібірску і іншых.

1978 год — Леаніду Ілычу Брэжневу, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Маршалу Савецкага Саюза, уручаны ордэн «Перамога» (у 1989 годзе пасмяротна Брэжневу быў пазбаўлены гэтай узнагароды як «не адпавядаючай статуту ордэна»).

Цытата дня:

«Калі вам далі добрую адукацыю, гэта не значыць, што вы яе атрымалі».

Анатоль Рас.

СІМВОЛІКА СЯМЁРКІ

Адным з найбольш пераканаўчых фактараў існавання таго ці іншага ліку ў статусе сакральнага ў духоўнай спадчыне этнасу з'яўляецца актыўная прысутнасць яго ў міфалогіі, казачным эпасе, абрадавых песнях, замовах і, безумоўна, у абрадах каляндарнай і сямейна-родавай накіраванасці.

● Старажытны летапіс «Аповесць мінулых часоў» сведчыць, што на Падоле, побач з харомамі князя Уладзіміра, стаялі драўляныя выявы сямі багоў: Перуна, Вялеса, Хорса, Дажджбога, Стрыбога, Сімаргла і Мокашы. Славянскі бог маладога Сонца Ярыла заўсёды маляваўся з сямю тварамі.

● У чарадзейных казках даволі часта гучыць тэма «праклёну маці». Каб яго зняць, дачка або падчарка павінна маўчаць сем гадоў.

● Значна больш шырока сімволіка ліку сем выкарыстоўваецца ў магічнай практыцы нашых продкаў: «Калі сабраць сем кропель свайго поту і цішком даць іх выпіць каму-небудзь, то ён будзе моцна вас кахаць...». Калі хочуць, каб пайшоў дождж, то «нясуць на поле ваду з сямі калодзісяў і разліваюць яе на раллі».

● Каб злодзей не змог выйсці з хаты, рабілі наступнае магічнае дзеянне-абярэг: у пятніцу перад любым вялікім святам сем разоў чыталі ахоўную замову, ходзячы па хаце крыжам. У суботу на наступны дзень трымаліся посту, акрамя вады, нічога не бралі ў рот да першага промня сонца ў нядзелю.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Не нарадзіся прыгожай, а май жахлівенькую сяброўку.

☺

Міхаіл Задорнаў.

Канцэрт для тых, у каго няма інтэрнэту.

☺

Цешча і зяць:

— Дарагі зяцёк, у мяне для цябе ёсць дзве навіны: адна дрэнная, другая добрая.

— Мама, тое, што вы дагэтуль жывыя і здаровыя, я і так бачу — кажыце ўжо добрую навіну.

☺

У транспарце.

— Спадар, мне здаецца, у гэтым выпадку вы крыху перавысілі лімітавыя межы майго пераварвання кантынууму.

— Чаго?!

— Рукі прыбраў, казёл, хутка!

☺

Два студэнты:

— Праз некалькі гадоў людзі будуць казаць, паглядзеўшы на інстытут: «Тут вучыўся студэнт Іваноў!»

Голас з вучэбнай часткі:

— Калі не здасі залік, людзі будуць так казаць ужо на наступным тыдні!

POST factum

СКАЖЫ СВОЙ ПАРОЛЬ, І Я СКАЖУ, ХТО ТЫ

Словы, якія выкарыстоўваюцца ў якасці камп'ютарных пароляў, з'яўляюцца своеасаблівым псіхалагічным тэстам і дазваляюць многае даведацца пра рысы характару чалавека.

Амерыканская кампанія CentraNic, якая займаецца рэгістрацыяй даменных імёнаў у інтэрнэце, даследавала звычкі 1200 карыстальнікаў і выявіла 4 асноўныя групы людзей на аснове тэматыкі выкарыстаных імі пароляў.

Большасць карыстальнікаў (47 працэнтаў) трапілі ў катэгорыю «сям'я». У якасці пароляў яны выкарыстоўваюць уласныя імёны і нікі, а таксама імёны сваіх бацькоў, дзяцей і хатніх жывёл. Паводле высноў псіхолагаў, гэтыя людзі маюць трывалую сямейную сувязь, і ў якасці пароляў выбіраюць эмацыйна значныя для іх імёны.

Да другой па сваіх маштабах катэгорыі — «фанаты» — (32 працэнты апытаных) былі аднесены людзі, якія выбралі ў якасці пароляў імёны поп- і рок-зорак, спартсменаў, акцёраў, мультыплікацыйных герояў. Паролі гэтай групы, якія найбольш часта сустракаюцца, — Мадонна, Сімпсан, Кіяну Рыўз, Шумахер. Паводле меркавання псіхолагаў, фанаты звычайна выбіраюць куміраў на падставе ўласных амбіцый, так што і тут па паролі можна шмат чаго даведацца пра чалавека. У катэгорыю «фантазёраў» (11 працэнтаў апытаных) трапілі самаўлюбёныя людзі. Сярод пароляў гэтай групы сустракаюцца такія словы, як Сэксуальны, Багіня ці Майстар.

Гэта катэгорыя людзей, так ці інакш зацыкленых на пытаннях сэксу. Галоўным чынам гэта мужчыны, аднак прысутнічае і невялікі працэнт жанчын.

Самая маленькая катэгорыя — «шыфравальшчыкі» — 9 працэнтаў апытаных. Гэта група людзей, засяроджаных у першую чаргу на бяспецы. Яны прыдумваюць паролі, якія разгадаць немагчыма. Часта літары ў іх паролях чаргуюцца з лічбамі. Найбольш яскравай характарыстыкай для гэтай групы з'яўляецца «параноідальнасць». Аднак, як паведамляе New Scientist, гэтая група лічыцца сапраўды найбольш абароненай.

Мяркуючы па назіраннях псіхолагаў, шматлікія карыстальнікі мяркуюць, што пароль павінен выяўляць усю сутнасць чалавека ў адным слове, і таму яны не могуць дазволіць сабе які-небудзь бессэнсоўны, «пусты», пароль. Менавіта таму яны і выбіраюць такі пароль, які выдае іх «з галавой».

КАМАРЫ НАНЕСЛІ ТУРЫСТЫЦЫ ЎРОНУ... НА 1,3 МЛН ДОЛАРАЎ

У Саудаўскай Аравіі пастаялка пяцізоркавага гатэля звярнулася ў суд з патрабаваннем, каб ёй выплацілі $1,3 млн у якасці кампенсацыі за камарыныя ўкусы.

Як паведамляе выданне Al Hayat, суд горада Джыда прыступіў да разгляду іску ад жанчыны, якая заяўляе, што сур'ёзна захварэла з-за ўкусаў камароў. Пачырваненне скуры, моцны сверб і болі прымусілі яе звярнуцца ў бальніцу, дзе ёй прапісалі абследаванне і шпіталізацыю. Усе спробы персаналу гатэля мірна ўладзіць канфлікт праваліліся — турыстка адмовілася ад прапанаваных падарункаў і падала заяву ў суд.

ВУЧОНЫЯ ПАДЛІЧЫЛІ, ШТО ЧАЛАВЕЦТВА НІКОЛІ НЕ ПАКІНЕ МЕЖЫ СВАЁЙ ГАЛАКТЫКІ

Амерыканскія вучоныя лічаць, што нават калі чалавецтва навучыцца будаваць зоркалёты, здольныя лятаць з хуткасцю святла, яно ўсё адно не зможа пакінуць межы сваёй галактыкі.

Толькі каб дабрацца з аднаго канца Млечнага шляху ў другі, трэба каля 1000 гадоў, што, улічваючы працягласць жыцця чалавека, робіць вандраванні ў іншыя галактыкі даволі эфемернымі. Калі дапусціць, што зоркалёт рухаецца з хуткасцю святла, то, каб дабрацца да краю Сонечнай сістэмы, спатрэбіцца каля 5 гадзін, а каб дасягнуць найбліжэйшай да Зямлі зоркі, такому касмічнаму караблю трэба будзе ляцець 5 гадоў — гэта 25 трыльёнаў міляў.

НЕЎЛАДКАВАНАЕ АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ ПЕРАДАЕЦЦА ПА СПАДЧЫНЕ

Аўстралійскія вучоныя сцвярджаюць, што знайшлі тлумачэнне таму, чаму некаторыя жанчыны не ў стане завесці сур'ёзныя адносіны з супрацьлеглым полам. Як паказала даследаванне, поспех на любоўным фронце жанчыны залежыць ад яе імуннай сістэмы, пішуць брытанскія СМІ.

Як заяўляюць вучоныя з Універсітэта Заходняй Аўстраліі, некаторыя сакрэты прывабнасці хаваюцца ў пэўных генах імуннай сістэмы, наследаванай ад бацькоў. Генетычны складнік імуннай сістэмы мужчыны вызначаюць па знешнасці і поту жанчыны — з іх дапамогай яны падсвядома адчуваюць, якая з іх здольная даць лепшых нашчадкаў.

Аўтары даследавання вывучылі ДНК 150 студэнтак і выявілі, што чым больш разнастайныя гены, тым больш маладых людзей ёсць у жанчыны. Праўда, вучоныя не змаглі назваць прычыну гэтага. Незразумелым засталося і тое, каго менавіта гены робяць больш прывабным — іх уладальніцу для мужчын або мужчын для самой жанчыны.

СОНЦА АДНАВІЛА СВАЮ АКТЫЎНАСЦЬ — ЗЯМЛЯНАМ ВАРТА РЫХТАВАЦЦА!

Беспрэцэдэнтны перыяд незвычайна нізкай актыўнасці Сонца, які доўжыўся каля трох гадоў, скончыўся.

Як паведаміў вядучы брытанскі навуковы астрафізічны цэнтр — Лабараторыя Рутэрфорд Эплтан, на гэтым тыдні атрыманы звесткі пра з'яўленне на Сонцы плямаў. «Сусветная навука з палягчэннем уздыхнула: Сонца выйшла з загадкавага для навукоўцаў перыяду зацяжной «спячкі», — заявіў супрацоўнік Лабараторыі прафесар Рычард Харысан.

Шэраг навукоўцаў выказалі гіпотэзу наконт таго, што Сонца хутка астывае, і жыхарам Зямлі варта рыхтавацца да новых і небывалых прыродных катастроф. Аднак днямі са спадарожнікаў былі атрыманы звесткі пра аднаўленне актыўнасці Сонца. Усё сведчыць пра тое, што пачаўся новы цыкл сонечнай актыўнасці, пік якой прыйдзецца на 2012 год, паведаміў прафесар Харысан.

РАСКРЫТА ТАЯМНІЦА ЎСІХ МІЛЬЯРДЭРАЎ

Амерыканскія эксперты ўзялі інтэрв'ю ў некаторых самых багатых людзей планеты і высветлілі асноўныя фактары, якія ўплываюць на «прасоўванне» ўверх у справах бізнэсу. Сваімі меркаваннямі па гэтай нагодзе падзяліліся больш за дзясятак мільярдэраў.

Усе паспяховыя людзі хоць бы адзін раз памыляліся і рабілі памылковыя крокі ў бізнэсе, але вера ў сябе дапамагла ім ісці далей. «Першы сакрэт па-сапраўднаму багатых людзей заключаецца ў тым, што яны не баяцца пацярпець няўдачу», — піша часопіс Forbes. «Другі іх сакрэт у тым, што яны крэатыўна глядзяць на праблемы, звязаныя з крыніцамі новых даходаў», — лічаць эксперты аўтарытэтнага выдання. Сусветным магнатам заўсёды мала таго, што яны маюць, і таму ім заўсёды хочацца дабіцца большага.

Далёка не апошнюю ролю ў дасягненні поспеху адыгрывае ўдалая жаніцьба. Многія бізнэсмены лічаць гэты фактар найбольш значным з усіх. «Абсалютна важна мець жонку, якая падтрымлівае цябе, і, што яшчэ важней, верыць у тваё прасоўванне ўверх», — паведамляе часопіс.

Нагадаем, летась самым багатым чалавекам Зямлі пасля невялікай паўзы зноў стаў Біл Гейтс з 40 мільярдамі долараў. Легендарны інвестар Уорэн Бафет заняў другі радок (37 мільярдаў).

АДЗЕННЕ ЖАНЧЫН ЗАБІВАЕ МУЖЧЫН

Фізіёлагі сцвярджаюць: легкадумны стыль у адзенні і паводзінах прыгожай паловы чалавецтва зусім не бяскрыўдны. Гэта — адна з асноўных крыніц мужчынскіх хваробаў.

Амерыканскія навукоўцы праводзілі даследаванні на працягу трыццаці гадоў. Па выніках назіранняў, кожны трэці амерыканец і еўрапеец пасля 30 гадоў мае праблемы з патэнцыяй ці прастатай. Для параўнання прыводзяцца звесткі, атрыманыя ў краінах мусульманскага Усходу. У жыхароў арабскіх краін самыя нізкія паказчыкі захворвання на рак прастаты. Паводле першапачатковай версіі вучоных, гэта было звязана з кліматам ці з асаблівасцямі харчавання мясцовага насельніцтва. Але старанная вывучэнне ўмоў жыцця і рацыёну жыхароў Усходу здагадку не пацвердзіла.

Сапраўдная ж прычына, як пазней высветлілася, заключалася не ў культуры харчавання, а... у культуры адзення. Усходнія жанчыны хаваюць практычна ўсё цела пад паранджой — у адрозненне ад еўрапейскіх дам, у якіх папулярныя міні-спаднічкі і напаўпразрыстыя блузкі, глыбокія выразы топаў. Падобнае «разняволенне» ў адзенні прыгожай палавіны выклікае ў мужчын адпаведную рэакцыю.

Старшы навуковы супрацоўнік Расійскага інстытута культуралогіі РАН акадэмік Леанід Кітаеў-Смык пацвярджае меркаванне амерыканскіх даследчыкаў. Паводле яго меркавання, сёння ў свеце каля 70 працэнтаў выпадкаў імпатэнцыі з'яўляюцца натуральнай ахоўнай рэакцыяй арганізма на стрэс ад пастаяннага нерэалізаванага ўзбуджэння.

Тым часам, амерыканскія сэксолагі склалі «чорны спіс» заняткаў, якія выклікаюць праблемы са здароўем у мужчын. Акрамя разглядвання фрывольна апранутых дзяўчат на вуліцы, у яго ўвайшлі: прагляд інтэрнэт-парнаграфіі, відэаэротыкі і парнаграфіі, чытанне эратычных часопісаў, наведванні стрыптыз-бараў.

Віншуем любую матулю **Раісу Іванаўну ШАЛУПЕНКУ** з 50-гадовым юбілеем. Жадаем моцнага здароўя на доўгія гады, шчасця і дабрабыту, яшчэ вялікага аптымізму і здзяйснення ўсіх мараў.

Дачка Ірына, муж,
в. Мікулічы.

НАЧАЛЬНІКА ЧЫЛІЙСКАГА МАНЕТНАГА ДВАРА ЗВОЛЬНІЛІ ЗА КРАІНУ «ЧЫІ»

Кіраўнік чылійскага манетнага двара Грэгорыа Іньігес пазбавіўся пасады з-за партыі манет, на якіх была дапушчана памылка ў назве краіны. Акрамя Іньігеса былі звольненыя яшчэ некалькі чыноўнікаў.

На манетах вартасцю 50 песа, пушчаных у абарачэнне ў 2006 годзе, замест «Chile» было адчаканена «Chiie». На памылку ніхто не звяртаў увагі да канца 2009 года.

Пасля таго, як стала вядома аб няправільным напісанні назвы краіны на манетах, яны зрабіліся прадметам попыту. Чылійцы збіраюць манеты ў 50 песа ў надзеі на тое, што пасля яны будуць каштоўнасцю для калекцыянераў. Улады краіны ўжо абвясцілі, што не збіраюцца знімаць з абарачэння такія манеты.

Гэта не першая памылка, дапушчаная манетным дваром Чылі за апошнія гады. Так, некалькі разоў па недаглядзе чыноўнікаў у прыватныя калекцыі траплялі рэдкія каштоўныя манеты і медалі, якія павінны былі знаходзіцца ва ўрадавым сховішчы.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Сакрэты мужчынскага даўгалецця

Мужчыны сумна жартуюць: «Пройдзе яшчэ гадоў сто, і нас можна будзе заносіць у Чырвоную кнігу як рэдкі від, які знікае». І сапраўды, на жаль, працягласць мужчынскага жыцця зніжаецца. Сёння сяроднестатыстычны прадстаўнік моцнага полу жыве 64 гады. А хто ў гэтым вінаваты? Ды самі мужчыны і вінаватыя.

Не трэба вінаваціць у сваім дрэнным здароўі надвор'е, агідную экалогію, злых начальнікаў і сварлівых цешчаў. Не, гэта, вядома, таксама прычыны, вартыя згадвання. Аднак далёка не галоўныя. Проста мужчыны, у адрозненне ад жанчын, традыцыйна менш часу ўдзяляюць свайму здароўю. Чамусьці лічыцца, што клапаціцца пра сябе, любімага, нявартае ўвагі прадстаўнікоў моцнага полу.

Медыкі вызначылі асноўныя фактары рызыкі і прапануюць мужчынам некалькі простых, але вельмі дзейсных парад па падаўжэнні жыцця.

Фактар рызыкі: хранічнае запаленне. Мужчыны ў большасці выпадкаў запускаюць запаленчыя захворванні. У выніку — раннія артрыты, інфаркты, інсульты, хвароба Альцгеймера.

Тут усё проста: не пускайце на самацёк нават такія лёгкія немачы, як ВРВІ і насмарк, лячыцеся своечасова. А калі вы схільныя да прастудных захворванняў, замяніце ў сваім рацыёне мяса на тлустую рыбу ці адмоўцеся хоць бы ад чырвонага мяса. Замест сланечнікавага алею ўжывайце аліўкавы. Раз на год (вясной) месячнымі курсамі прымайце вітамінна-мінеральныя дабаўкі, якія змяшчаюць медзь і цынк.

Фактар рызыкі: дысбаланс тлушчавых кіслот. Гэта правакуецца сядзячым ладам жыцця і злоўжываннем гатовымі прадуктамі і кансервамі. Каварны дысбаланс выклікае арытмію, павышаную стомленасць, завяданне, сухасць скуры, захворванне суставаў.

Аднавіць баланс тлушчавых кіслот дапамогуць фізічныя нагрузкі (хоць бы рэгулярныя пешыя прагулкі — у дзень трэба прайсці не менш чым 5—7 км. Гэта прыкладна тры разы па паўгадзіны сярэднім крокам). Ну і, вядома, скарэктуйце меню: кансерваў меней, свежанькага — паболей.

Фактар рызыкі: лішак цукру ў крыві. Лічыцца, што мужчыны не любяць салодкае, таму менш, чым жанчыны, пакутуюць ад лішку цукру. Ласункаў яны сапраўды ядуць менш, а вось спіртнога п'юць больш, і нашмат! Ад гэтага церпіць падстраўнікавая залоза, якая адказвае за ўзровень цукру ў крыві. А калі мужчына аддае перавагу салодкім слабаалкагольным кактэйлям, якіх сёння на любы густ хапае, ды яшчэ якому-небудзь партвейну...

Дыябету гэта, магчыма, і не выкліча, аднак у любым узросце лішак цукру правакуе агульную дэградацыю тканак, зацвярдзенне сценак сасудаў, пагаршэнне зроку, старэнне скуры, мікра- і макраінсульты.

Тут ужо што-небудзь адно: або прытрымлівайцеся «меры піцця», або адмаўляйцеся ад цукру і белага хлеба (замяніце яго хлебам з вотруб'ем). Акрамя гэтага, раз на год (восенню) месячнымі курсамі прымайце вітамінна-мінеральны комплекс, які змяшчае хром, цынк і ліпоевую кіслату.

Фактар рызыкі: парушэнне акісляльных працэсаў. У прынцыпе гэта натуральная справа — акісляльныя працэсы працякаюць у арганізме пастаянна. Аднак апошнім часам з-за дрэннай экалогіі (нарэшце і на яе можна панаракаць!) яны шматразова паскорыліся. Гэта прыводзіць да парушэння кровазвароту, пашкоджання сасудаў і нават анказахворванняў.

Абараніцца ад «акісляльнага стрэсу» дапамогуць наступныя прадукты (іх называюць антыаксідантамі): таматы, чырвоныя яблыкі, чырвонае сухое віно, а таксама любая марская рыба і морапрадукты. Дарэчы, медыкі лічаць, што менавіта таму ў Японіі, дзе меню традыцыйна складаецца з дароў мора, мужчыны жывуць даўжэй за ўсіх на свеце. І гэта пры тым, што ў Краіне ўзыходнага сонца вельмі дрэнная экалогія.

-2636-

МУЖЧЫНА Ў ЛЮСТЭРКУ

Сяброўскае акружэнне

Медыкі і стылісты папярэджваюць: няправільнае абыходжанне з шалікам можа прывесці да сумных наступстваў. Як мінімум вас чакаюць пераахаладжэнне арганізма і небяспека праславіцца нямодным чалавекам. Прапануем некалькі спосабаў нашэння шаліка, якія дапамогуць пазбегнуць гэтага.

Зашмарга. Сведчыць аб тым, што стыльны знешні выгляд вельмі важны для вас. Шалік ператвараецца ў зашмаргу лёгка: складзіце яго напалам і прасуньце абодва свабодныя канцы ў пятлю, якая атрымалася. Аднак не перастарайцеся — своечасова аслабце пятлю.

Дыяпазон тэмператур: ад +10 да -5 °C.

Паэтычны. Абкруціце канец шаліка вакол шыі і зняважлівым рухам закіньце яго за спіну. Хутчэй за ўсё, на працягу дня гэты рух давядзецца паўтараць шмат разоў, таму лепш патрэніравацца загадзя.

Дыяпазон тэмператур: ад +15 да -5 °C.

Баксёрскі. У такім варыянце шалік перастае выконваць сваю прамую функцыю і ператвараецца ў ручнік, які свабодна вісіць. Варыянт прыдатны толькі ў час поўнага штылю. У адваротным выпадку вецер можа сарваць ваш модны аксесуар і панесці яго куды падалей.

Дыяпазон тэмператур: ад +15 да 0 °C.

Свабодная пятля. Павесьце шалік на шыю так, каб адзін канец, які звісае, быў даўжэйшы за другі. Цяпер абкруціце яго вакол шыі. Калі шалік вельмі доўгі, можна абкруціцца ім двойчы.

Дыяпазон тэмператур: ад +15 да -5 °C.

Гальштук. Найбольш прыдатны варыянт для кароткага шаліка. Завяжыце яго вузлом і размясціце канцы адзін пад адным. Будзе вельмі цёпла, калі схаваць іх пад паліто ці куртку.

Дыяпазон тэмператур: ад +10 да -15 °C.

МКАД. Гэта асаблівы цеплазберагальны варыянт. Вазьміце шалік і абкруціце яго вакол шыі максімальную колькасць разоў. Канцы схавайце за каўнер. Выглядае не надта стыльна, затое нідзе не прадзімае.

Дыяпазон тэмператур: ад 0 да -20 °C.

КАРЫСНЫЯ ДРОБЯЗІ

Пра мужчыну раскажуць... шкарпэткі

Звычайна шкарпэткі займаюць у гардэробе не самае ганаровае месца. Між тым мадэльеры сцвярджаюць, што шкарпэткі нароўні з гальштукам могуць расказаць пра свайго ўладальніка больш, чым пашпарт.

Памятайце, што шкарпэткі павінны адпавядаць агульнаму тону штаноў і колеру абутку. Так, напрыклад, для дзелавога касцюма рэкамендуюцца спакойныя, нейтральныя колеры, да спартыўнага адзення і для адпачынку прыдатныя шкарпэткі больш вясёлай расфарбоўкі. Белыя шкарпэткі (і пальчаткі) носяць афіцыянты, каб падкрэсліць акуратнасць і ахайнасць.

Набываючы шкарпэткі, звярніце ўвагу не толькі на эстэтычныя каноны, але і на іх зручнасць і трываласць. Асноўным арыенцірам пры выбары шкарпэтак з'яўляецца склад пражы, якая выкарыстоўваецца для іх вырабу. Яна можа быць паўшарсцяной, бавоўнянай і сінтэтычнай. Лепш, калі шкарпэткі будуць з натуральных матэрыялаў.

«Безразмерныя» мужчынскія шкарпэткі з вялікай колькасцю сінтэтыкі рэч, вядома, зручная, аднак для здароўя не вельмі карысная: ногі пацеюць. Лепш пазбягаць сінтэтычных прымесяў у адзенні для дзяцей, алергікам і тым, хто клапоціцца пра сваё здароўе і самаадчуванне.

Пры набыцці шкарпэтак трымайцеся наступных рэкамендацый:

- уважліва агледзьце мыскі, пяткі і месцы злучэння дэталяў — ці няма на іх прыспушчаных вочкаў;
- аддайце перавагу шкарпэткам, у якіх больш шчыльныя мысок і пятка, а рызінка двайная, шырынёй не менш чым 4 см;
- упэўніцеся, што на вырабе няма дзірак і зацяжак, швы мяккія, з правільнай, роўнай строчкай.

-2637-

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Цяльцам лепш прыкусіць свой востры язычок, а Львам не варта баяцца зменаў

ВАЕН. Тыдзень будзе досыць напружаны, таму ўзбройцеся цярпеннем і сабранасцю. У аўторак не правакуйце канфліктных сітуацый. У чацвер непажадана ўцягвацца ў авантуры, бо яны могуць прынесці непапраўныя страты. У суботу ганіце прэч ўсе страхі і сумневы, бо насамрэч няма ніякіх перашкод для дасягнення мэты. У гэты дзень праявіце больш самастойнасці і зацікаўленасці ў справах. Нядзелю прысвяціце адпачынку.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень няпросты. Дзелавая нагрузка можа стварыць некаторую напружанасць ў другой палове тыдня. Яна не будзе пазбаўлена прыемнасці, аднак не трэба лічыць, што вы больш разумныя, прадбачлівыя і акуратныя, чым навакольныя. Прыкусіце свой востры язычок, бо цяпер ён можа стаць вашым ворагам. Не даводзьце сітуацыю да пункту кіпення. У сераду да новай інфармацыі варта прыслухацца, але спачатку прааналізуйце яе і аддзяліце праўду ад магчымых скажэнняў.

БЛІЗНЯТЫ. Ваша энергія і напор акажуць вялікі ўплыў на ўсіх, з кім давядзецца мець зносіны. Жаданне вылучыцца з агульнага натоўпу можа прывесці да даўняй мэты. Калі вы толькі што выйшлі з адпачынку, падбайце пра тое, каб прапановы аб працы пасыпаліся як з рога багацця. Пакідаць старое, звыклае месца пры гэтым не варта, але вось данесці да начальніка думку аб тым, які вы неацэнны і таленавіты супрацоўнік, вельмі своечасова. Дзякуючы невялікім, але добра прадуманым набыткам ваша жыллё стане больш утульным і камфортным.

РАК. Пачатак тыдня будзе ўдалы практычна ва ўсім. Пажадана аб'ектыўна ацаніць свае магчымасці і размеркаваць час і сілы, бо праца можа заняць амаль увесь час. Асцярожней, бліжэй да выхадных вас могуць падпільноўваць ілюзіі і спакушэнні. У другой палове тыдня лепш стрымліваць эмоцыі, каб пазбегнуць непатрэбных праблем. У суботу запрасіце сяброў у госці — і вечар пройдзе цудоўна.

ЛЕЎ. Лёс можа выпрабоўваць на трываласць, аднак вы лёгка пераадолееце перашкоды, калі не будзеце звяртаць увагі на плёткі і слых. Не варта баяцца зменаў. У сераду, апынуўшыся перад адказным выбарам, праявіце стрыманасць і карэктнасць у выразах. У суботу пазбягайце няёмкіх сітуацый і праявіце вытрымку.

ДЗЕВА. Можа з'явіцца падстава задумацца аб сэнсе жыцця. У панядзелак праявіце сілу волі — і пазбегнеце сур'ёзных выдаткаў, якія могуць зрабіць рызыкоўным ваша фінансавае становішча. Аўторак удалы для рамантычных сустрэч. У канцы тыдня з'явіцца шмат добрых магчымасцяў для рэалізацыі новых задум.

ШАЛІ. Пажадана праяўляць больш фантазіі, пачуцця гумару і аптымізму. Імкніцеся ўсюды знаходзіць нестандартныя рашэнні — гэта істотна дапаможа і дома, і на працы. Па меры сілаў пастаўцеся спакойна да крытыкі, накіраванай у ваш адрас. Галоўнае, не пасварыцеся з начальствам — і тады сітуацыя зменіцца ў лепшы бок. Так, цяжка кантраляваць свае эмоцыі, але калі вам гэта ўдасца, то зможаце дабіцца чаго заўгодна. Зносіны з сябрамі прынясуць нямала прыемных хвілін і ўзнімуць настрой.

СКАРПІЁН. Уважліва аналізуйце падзеі, якія адбываюцца, абапіраючыся на жыццёвую практыку і логіку. Не ідзіце на павадзе чужога меркавання. Паспрабуйце на гэтым тыдні ўстрымацца ад адкрытай крытыкі калегаў. Магчымы кар'ерны рост і пераход на новую пасаду. Паспрабуйце пазбегнуць зорнай хваробы. Напярэдзе вось-вось замаячыць нешта новенькае, і яно абяцае сапраўдны поспех і паляпшэнне фінансавага становішча. Вашы планы могуць адрознівацца ад планаў навакольных — верагодныя пэўныя разыходжанні, якія могуць нават пераўтварыцца ў канфлікт.

СТРАЛЕЦ. Панядзелак можа пацешыць добрымі падзеямі. У аўторак і чацвер на працы лепш не прыцягваць да сабе ўвагі. Паспрабуйце ўвесь тыдзень лішні раз не трапляцца на вочы начальству. Сачыце за тым, каму і што гаворыце, інакш ёсць верагоднасць сутыкнуцца з праблемай скажэння інфармацыі — пераходзячы з вуснаў у вусны, яна можа змяніцца практычна да непазнавальнасці. Займаючыся праблемамі на працы, не забывайце пра дом. У выхадныя дні паспрабуйце надаць больш часу і ўвагі блізкім людзям.

КАЗЯРОГ. Поспех будзе залежаць ад ступені прыкладзеных намаганняў. У панядзелак магчымая сустрэча, якая зменіць планы на найбліжэйшую будучыню. Серада можа паднесці неспадзеўку — апыняцеся ў цэнтры падзей. Вы заўсёды не любілі распаўсюджвацца аб сваіх справах, але цяпер, хутчэй за ўсё, не ўдасца захаваць іх у сакрэце. У другой палове тыдня верагодная крытыка з боку начальства і калегаў. Паспрабуйце не рыхтаваць сабе глебу для будучых расчараванняў — не ідэалізуйце навакольных і вашы з імі адносіны. У выхадныя не прапусціце вечарынку ў сяброў, там акуняцеся ў сапраўдную весялосць.

ВАДАЛЕЙ. На гэтым тыдні ва ўсё, што будзеце рабіць, укладзіце максімум сілаў і энергіі. Аднак не варта чакаць таго ж ад навакольных. Паспрабуйце не ўмешвацца ў ход падзей: цяпер разуменне і цярпенне — гэта рэальны ключ да поспеху. У панядзелак зможаце ажыццявіць некаторыя ідэі, якія выношвалі ўжо даўно. У сераду паспрабуйце перайсці ад задум да справы — гэта адразу зменіць сітуацыю на вашу карысць. У выхадныя падыхайце свежым паветрам і паспрабуйце адысці ад праблем.

РЫБЫ. Пачатак тыдня спрыяльны для кар'еры і рашэння важных спраў. Могуць паўстаць складанасці ў дзелавой сферы, але адыходзіць нельга: цяпер у вас хопіць сілаў дабрацца да вяршыні поспеху. У панядзелак пажадана не ўпарціцца, адстойваючы свой аўтарытэт і кампетэнтнасць. Лепш прыслухацца да мудрых і своечасовых парадаў, бо вы ад гэтага толькі выйграеце. У чацвер можа з'явіцца магчымасць бліснуць у гасцях сваёй эрудыцыяй. Другую палову тыдня пажадана прысвяціць адпачынку і паездкам за горад. У суботу магчымая сур'ёзная гутарка са сваякамі: праявіце тактоўнасць і не апярэджвайце падзеі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, ад